WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 ЛІСТАПАДА 2010 г.
СЕРАДА
№ 220
(26828)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ТРЭБА ТОЛЬКІ АДНО — УВАГА ДА ЧАЛАВЕКА І ЖАДАННЕ ЯМУ ДАПАМАГЧЫ»

Максімальна аблегчыць вырашэнне пытанняў, з якімі людзі сутыкаюцца штодня, — адна з найбольш прыярытэтных задач у нашай краіне. І зроблена ў гэтым напрамку шмат, прыняты шэраг захадаў, якія закліканыя забяспечыць даступнасць, прастату і аператыўнасць вырашэння надзённых праблем кожнага беларуса. Згадаем, у прыватнасці, дырэктыву Прэзідэнта № 2 «Аб захадах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату», якая дазволіла ўстанавіць жорсткае патрабаванне з чыноўнікаў за фармалізм, непавагу да грамадзян і абыякавасць да іх патрэб. Для многіх кіраўнікоў менавіта гэта стала падставай для таго, каб пачуць голас простага чалавека. Разам з тым, станоўчыя зрухі ў гэтым напрамку часам перакрэсліваюцца масай недахопаў у працы чыноўнікаў са зваротамі грамадзян. Гэта паказаў і маніторынг стану работы дзяржаўных органаў па вырашэнні сацыяльна значных пытанняў насельніцтва, які праводзіўся па распараджэнні кіраўніка дзяржавы. Для таго каб адкрыта сказаць пра існуючыя тут праблемы, вызначыць шляхі іх вырашэння і абудзіць актыўнасць чыноўнікаў, Аляксандр Лукашэнка ўчора правёў нараду аб павышэнні эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян.

Пачалася яна нетрадыцыйна: напрамую да Прэзідэнта звярнуліся некалькі простых грамадзян са сваімі праблемамі, да якіх чыноўнікі на месцах засталіся глухімі. Напрыклад, спадарыня Сінюк з Мінска папрасіла ў Аляксандра Лукашэнкі дапамогі пасля таго, як вось ужо на працягу сямі месяцаў пасля звальнення з прыватнага прадпрыемства не можа атрымаць цалкам зарплату за адпрацаваны там час. Прэзідэнт загадаў паставіць гэтае, як і іншыя пытанні, якія былі агучаны людзьмі падчас прамога ўключэння, на кантроль і на працягу бліжэйшых дзён вырашыць...

Нарада на такім узроўні была праведзеная ўпершыню ў гісторыі нашай краіны. І абумоўлена гэта, паводле слоў Прэзідэнта, двума асноўнымі фактарамі. Па-першае, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, гэта актуальнасць тэмы для ўсяго насельніцтва краіны з пункту гледжання заяўленай палітыкі «Дзяржава для народа». «Трэба выразна разумець, што для людзей важныя не столькі паказчыкі ВУП, колькі тое, што маштабныя дзяржаўныя праграмы ўплываюць на іх жыццё, садзейнічаюць вырашэнню надзённых жыццёвых праблем, — заўважыў кіраўнік краіны. — У сваю чаргу, для ўсёй сістэмы дзяржаўнай улады жыццёва важна ўдасканальваць канал зваротнай сувязі па найбольш вострых праблемах, якія непакояць людзей». «Па-другое, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, — на сённяшні дзень мы маем пэўны і, трэба сказаць, немалы вопыт, які дае магчымасць рабіць абгрунтаваныя высновы пра эфектыўнасць нашай работы ў названым напрамку. А на падставе гэтых высноў мы можам унесці неабходныя карэктывы. Жыццё не стаіць на месцы. Тое, што было добра яшчэ ўчора, сёння ўжо мае патрэбу ва ўдасканаленні».

Звяртаючы ўвагу прысутных на бюракратызм, які часам прысутнічае ў працы чыноўнікаў, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэтая з'ява мае шмат абліччаў і яна жывучая. «Як толькі мы дзесьці выпускаем з-пад увагі гэту праблему, яна абвастраецца і псуе жыццё многім людзям, — сказаў Прэзідэнт. — Часу і сіл на ліквідацыю яго праяў спатрэбіцца шмат, але ўжо сёння відаць, што вынікі гэтай работы знаходзяць шырокі грамадскі водгук, які сведчыць пра своечасовасць прынятых намі захадаў. Сведчаннем таго з'яўляюцца звароты ў дзяржаўныя органы». Таксама, дадаў Аляксандр Лукашэнка, падчас яго рабочых паездак па рэгіёнах непасрэдныя сустрэчы з людзьмі даюць магчымасць меркаваць пра стаўленне прадстаўнікоў органаў улады да патрэб і спадзяванняў простых людзей. Гэта датычыцца ўсяго спектра пытанняў — ад сацыяльнай падтрымкі сям'і да праблем адукацыі і аховы здароўя. І часта пытанні не патрабуюць значных фінансавых расходаў. «Трэба толькі адно: увага да чалавека і жаданне дапамагчы яму, — кажа кіраўнік дзяржавы. — Аднак на практыцы менавіта гэтага і не хапае. У верхніх эшалонах улады з лёгкасцю спускаюць звароты грамадзян на месцы або, як кажуць, ганяюць чалавека па вялікім крузе інстанцый. А на месцах абыходзяцца здзеклівымі адпіскамі або, горш таго, накіроўваюць скаргу на рэагаванне таму, на каго людзі скардзяцца. Ніякай тут аб'ектыўнасці і ўвагі чакаць не даводзіцца, а людзі ж спадзяюцца на справядлівасць улады». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў і той момант, што гэтая нарада павінна стаць зыходным пунктам па далейшым павышэнні эфектыўнасці гэтай шматпланавай і маштабнай дзейнасці. Мерапрыемства, паводле яго слоў, дасць магчымасць канчаткова вызначыцца, на якім этапе шляху мы знаходзімся цяпер і куды нам рухацца далей у пытаннях работы са зваротамі грамадзян.

Звяртаючыся да прысутных, кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ад чыноўнікаў не расказваць пра разуменне імі важнасці гэтай тэмы. «Сам узровень нарады сведчыць пра тое значэнне, якое надаецца пытанням дэбюракратызацыі ў нашай дзяржаве», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што размова будзе сур'ёзная і прынцыповая. «Не выпадкова, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, — на нараду запрошаныя ўсе вышэйшыя службовыя асобы, члены ўрада, кіраўнікі сродкаў масавай інфармацыі. Словам, менавіта тыя службовыя асобы, на якіх ляжыць адказнасць за ўзровень і якасць работы з насельніцтвам».

СТАР. 2

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАПАНУЕ ЭМІРУ КУСТУРЫЦУ СУПРАЦОЎНІЦТВА З БЕЛАРУСКІМІ КІНЕМАТАГРАФІСТАМІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, сустракаючыся ўчора ў Мінску з кінарэжысёрам Эмірам Кустурыцам, прапанаваў яму супрацоўніцтва з беларускімі кінематаграфістамі, перадае БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

«Калі вы захочаце зняць што-небудзь сур'ёзнае, няхай і не звязанае з Беларуссю, то мы палічым за гонар супрацоўніцтва з такім чалавекам, таму што ён не ўмее здымаць дрэнныя фільмы», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі людзям, якія робяць высокае мастацтва, гатовы дапамагаць і падтрымліваць іх. «А калі вы яшчэ і дзясятак нашых маладых кінарэжысёраў чаму-небудзь навучыце — проста будзеце героем нашай краіны», — сказаў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, у Беларусі не хапае «моцных, мужных, мыслячых і вельмі прафесійных кінарэжысёраў». «А хацелася б, каб такія былі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што напярэдадні ўважліва азнаёміўся з біяграфіяй Эміра Кустурыцы і ведае, як у вострыя перыяды гісторыі ён пераадольваў розныя перашкоды. «Вельмі рады, што вы югаслаў і ім засталіся. Мяне называюць занадта савецкім, але я ад гэтага не адмаўляюся, — сказаў Прэзідэнт. — Рады, што сустракаюся з такім кінарэжысёрам». Ён асабліва падкрэсліў, што гэта не проста пратакольная, фармальная сустрэча: «Гэта, можна сказаць, сустрэча з маім аднадумцам. Па многіх пытаннях нашы погляды абсалютна падобныя».

У сваю чаргу Эмір Кустурыца выказаў сваё разуменне працэсаў, што адбываюцца ў свеце. На яго думку, сёння ў свеце існуе сістэма разбурэння малых дзяржаў, так званая шокавая тэрапія, гэта значыць у краіну прыходзяць буйныя карпарацыі і разбураюць яе. «Тэорыя тых, хто «акупіруе» сёння краіны, заключаецца ў тым, што ў краіну прыносяць рабочыя месцы, але тую выгаду, якую атрымліваюць, карпарацыі забіраюць сабе», — сказаў кінарэжысёр. «Я прыемна ўражаны сённяшняй сустрэчай, — сказаў Эмір Кустурыца, звяртаючыся да Аляксандра Лукашэнкі. — Вы кіруеце краінай такім чынам, каб атрыманая выгада заставалася людзям, краіне. Вы хочаце захаваць незалежнасць. Ведаю, што сёння за гэта трэба плаціць вельмі высокую цану». Ён таксама падкрэсліў сваю павагу да Беларусі як да славянскай дзяржавы, якая да гэтага часу захоўвае незалежнасць. «Бялград разбамбілі не таму, што сербскі народ учыніў злачынства, а таму што Мілошавіч не дазволіў, каб у краіну прыходзілі карпарацыі. Вы адзіная краіна, якая дасягнула поспеху, і вашы тавары знаходзяцца ў вашых руках», — сказаў Эмір Кустурыца.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў учора кінарэжысёру Эміру Кустурыцу адну з галоўных узнагарод кінафестывалю «Лістапад» — спецыяльны прыз кіраўніка дзяржавы «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўручае гэту ўзнагароду як знак прызнання заслуг рэжысёра перад мастацтвам. Кіраўнік дзяржавы выказаў таксама надзею, што Эмір Кустурыца яшчэ не раз наведае нашу краіну, будзе прысутнічаць і на «Славянскім базары ў Віцебску», і на будучым кінафестывалі «Лістапад», і іншых.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

АПОШНІЯ ДНІ АПОШНЯГА ПАРОМА

На працягу ад Віцебска да мяжы з Латвіяй па рацэ Заходняя Дзвіна курсіравала некалькі паромаў. На трох з іх мне даводзілася плыць. Амаль два гады таму быў узведзены магутны мост каля вёскі Узмёны Міёрскага раёна, і неабходнасць у пароме ў Верхнядзвінску адпала сама сабою. У Бешанковічах сталі штогод наводзіць пантонны мост, і паромная пераправа таксама перайшла ў катэгорыю ўспамінаў.

Навігацыя апошняга — дзісненскага парома — з вясны, калі вада спадае да звычайнага ўзроўню, па глыбокую восень, ледзь не да ледаставу. Зімою, каб патрапіць на супрацьлеглы бераг, давялося б зрабіць кола ў 70 з гакам кіламетраў — праз Наваполацк альбо тыя ж Узмёны. Улетку, калі ведаеш расклад руху, дастаткова і дзесяці хвілін, каб са сваім «жалезным канём» апынуцца там, дзе дарога зноў аднаўляецца.

Апошнія дзянькі адыходзячага сезона дапрацоўвае гэты нястомны і яшчэ вельмі патрэбны паром у горадзе Дзісна Мёрскага раёна.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.



ГРАМАДСКА-КАНСУЛЬТАТЫЎНЫ САВЕТ ПРЫ АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА РАСПРАЦОЎВАЕ ГРАМАДЗЯНСКІЯ ПЛАТФОРМЫ ПА АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ, СПОРТУ

Удзельнікі Грамадска-кансультатыўнага савета (ГКС) пры Адміністрацыі Прэзідэнта актыўна распрацоўваюць грамадзянскія платформы па адукацыі, культуры, медыцыне, спорту і іншыя. Аб гэтым расказаў карэспандэнту БЕЛТА намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе, намеснік старшыні РГА «Белая Русь», член Грамадска-кансультатыўнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Шацько.

«Можна з упэўненасцю сказаць, што ўсе члены савета, якія прытрымліваюцца розных палітычных поглядаў, знайшлі агульную мову, — адзначыў суразмоўца. — Сёння мы актыўна займаемся распрацоўкай платформ, цесна працуем з усімі зацікаўленымі грамадскімі аб'яднаннямі». Аляксандр Шацько расказаў, што многія з прадстаўнікоў розных грамадскіх аб'яднанняў, якія раней без энтузіязму ўспрымалі ідэю сумеснай выпрацоўкі рашэнняў па далейшым развіцці беларускага грамадства, цяпер пачынаюць прыслухоўвацца да членаў савета, удзельнічаць у дыскусіях.

Аляксандр Шацько адзначыў, што перад удзельнікамі ГКС стаіць задача выпрацоўкі платформ (зводаў дакументаў) па рэалізацыі той або іншай ініцыятывы па напрамках дзейнасці грамадзянскай супольнасці. Цяпер ідзе фарміраванне рабочых груп па адукацыі, культуры, медыцыне, спорту і іншых. Плануецца, што 14 лістапада ў Мінску адбудзецца канферэнцыя па выпрацоўцы платформ, на ёй жа будуць прадстаўлены рабочыя групы.

Як падкрэсліў суразмоўца, работа ГКС ужо атрымала шырокую вядомасць у грамадстве, некаторыя прапановы савета ўкараняюцца ў жыццё. Гэта датычыцца пытанняў развіцця эканомікі, малога бізнэсу, адукацыі. Напрыклад, ёсць прапанова прадаставіць недзяржаўным арганізацыям паўнамоцтвы па аказанні адукацыйных паслуг дарасламу насельніцтву. «Гэта зняло б з дзяржбюджэту частку нагрузкі, а нефармальныя структуры атрымалі б магчымасць, у добрым сэнсе слова, канкурыраваць за свайго слухача», — лічыць Аляксандр Шацько.

Метал закапаны ў чыстым полі

З двух каналізацыйных калодзежаў на полі каля вёскі Стралічава ў Хойніцкім раёне невядомы выцягнуў 12 чугунных засавак, якія належаць адной з будаўнічых арганізацый Мазырскага раёна. Сума выкрадзенага — больш за 3,5 млн рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У БЕЛАРУСІ ПАДРЫХТАВАНЫ ПРАЕКТ УКАЗА АБ ПАВЫШЭННІ З 1 ЛІСТАПАДА СТЫПЕНДЫЙ НАВУЧЭНСКАЙ МОЛАДЗІ Ў 1,3 РАЗА

Аб гэтым паведаміў намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур учора на пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, перадае **БЕЛТА**. Намеснік міністра нагадаў, што ў гэтым годзе стыпендыі павялічваліся двойчы. Цяпер памер стыпендыі складае ад Br113 тыс. да Br182,1 тыс.

Выгарэла месца працы ІП

Пластыкавы прадуктовы павільён раніцай загарэўся на гандлёвым рынку па вуліцы Юбілейнай у Гомелі. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, у выніку пажару пашкоджаны дзве халадзільныя вітрыны, сцены ў павільёне на плошчы 4 кв.м. Мяркуецца, што прычынай пажару стала кароткае замыканне электраправодкі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Сацапытанне

ПРАДСТАЎНІК АПАЗІЦЫІ НЕ МАЕ ШАНЦАЎ ПЕРАМАГЧЫ НА ВЫБАРАХ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ

Такой думкі прытрымліваецца 81 працэнт удзельнікаў рэспубліканскага сацыялагічнага даследавання, праведзенага ў кастрычніку 2010 года Аналітычным цэнтрам EcooM, паведамілі БЕЛТА ў цэнтры.

У тое, што пасаду Прэзідэнта можа заняць прадстаўнік апазіцыі, вераць 9,2 працэнта. Не змаглі адказаць на гэта пытанне 4,9 працэнта рэспандэнтаў, 2,9 працэнта не далі адказу. Графу «іншае» адзначылі 2 працэнты ўдзельнікаў апытання. На думку 73 працэнтаў апытаных, сярод прадстаўнікоў апазіцыі няма дастойных людзей, якія маглі б заняць пасаду Прэзідэнта. 82,6 працэнта рэспандэнтаў заявілі аб тым, што яны не давяраюць апазіцыйным партыям. Былі апытаныя 1 498 грамадзян ва ўзросце ад 18 гадоў і старэйшыя.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЖЫЦЦЁ Ў РАСІІ КАРАЦЕЙШАЕ, ЧЫМ У СЯРЭДНІМ ПА СНД

Падліковая палата правяла комплексны параўнальны аналіз дынамікі сацыяльна-эканамічнага развіцця РФ у рамках СНД і прыйшла да высновы, што Расія саступае па сярэдніх паказчыках краінам Садружнасці: па працягласці жыцця і па ўзроўні дыферэнцыяцыі прыбыткаў насельніцтва (вялікі разрыў паміж багатымі і беднымі).

УКРАІНА ЎВЯЛА КВОТЫ НА ІМПАРТ ЗАПАЛАК

Украіна 6 лістапада ўвяла квоты на імпарт запалак, якія будуць дзейнічаць на працягу двух гадоў. Пра гэта паведамляе інтэрнэт-партал «Карэспандэнт.net».

Адпаведнае рашэнне Міжведамасная камісія па міжнародным гандлі прыняла 25 кастрычніка бягучага года. Апублікавана яно было 6 лістапада ў газеце «Урадавы кур'ер».

Квота на імпарт запалак на першы год складае 10,285 тысячы тон, пры гэтым размеркаваная яна галоўным чынам паміж Расіяй (7,328 тысячы тон) і Беларуссю (2,656 тысячы тон). З іншых краін Украіна атрымае толькі 0,301 тысячы тон запалак. На другі год памер квоты павялічаны прапарцыйна на пяць адсоткаў.

КОШТ УНЦЫІ ЗОЛАТА ПЕРАВЫСІЎ 1400 ДОЛАРАЎ

Сусветны кошт на золата ўстанавіў чарговы гістарычны рэкорд, перавысіўшы адзнаку ў 1400 долараў за тройскую унцыю. Падчас гандлю на біржы NYMEX 9 лістапада снежаньскія ф'ючэрсы на золата падаражэлі на 9,5 долара да 1412,7 долара за унцыю.

Золата вырасла ў кошце пасля таго, як напярэдадні кіраўнік Сусветнага банка Роберт Зелік прапанаваў прывязаць валюты вядучых эканомік свету (долар, еўра, ену, фунт стэрлінгаў і юань) да золата. Паводле меркавання Зеліка, каштоўны метал мог бы паслужыць «апорнай кропкай» для разумення рынкавых значэнняў інфляцыі, дэфляцыі і будучага кошту валют.

NASA ЗБІРАЕЦЦА ПАБУДАВАЦЬ ГІПЕРГУКАВЫ ПАСАЖЫРСКІ САМАЛЁТ

Амерыканскае касмічнае агенцтва NASA мае намер пабудаваць гіпергукавы самалёт, які дазволіць не толькі выходзіць за межы зямной атмасферы, але і абляцець зямны шар за лічаныя гадзіны. На такім паветраным судне пералёт з Нью-Ёрка да Сіднэя зойме не 21 гадзіну, як цяпер, а ўсяго 2,5 гадзіны, паведамляе The Daily Mail.

Пры такіх задачах самалёт павінен лётаць з пяцікратнай хуткасцю гуку. На гэты праект будзе выдаткоўвацца штогод па пяць мільёнаў долараў. Фінансаванне прадугледжана на бліжэйшыя тры гады. Гіпергукавы самалёт пакуль з'яўляецца даволі новай ідэяй, якая грунтуецца на «Канкордах», што лёталі з двухразовай хуткасцю гуку.

Нагадаем, што ў маі гэтага года войска ЗША правяло выпрабаванні гіпергукавой крылатай ракеты X-51A Waverider, якая развіла хуткасць у шэсць разоў большую за хуткасць гуку (больш сямі тысяч кіламетраў у гадзіну). Прыняцце такога тыпу ракет на ўзбраенне запланавана на 2017 год.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

КОШТ БІЛЕТАЎ НА ЦЯГНІКІ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ. АКРАМЯ ПРЫГАРАДНЫХ ЗНОСІН

Згодна з пастановай Міністэрства эканомікі, у краіне ўведзены новы Прэйскурант на перавозкі пасажыраў і багажу чыгуначным транспартам ва ўнутрырэспубліканскіх зносінах. Апошні раз кошт праезду на гэтыя перавозкі павялічваліся амаль чатыры гады таму — з 25 лістапада 2006 года.

Згодна з дакументам, кошт праезду пасажыраў (акрамя прыгарадных зносін) павялічаны на 20 працэнтаў. Напрыклад, патлумачылі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, калі да 5 лістапада кошт праезду без камісійных збораў у плацкартным вагоне пасажырскага цягніка №306 Вільнюс — Магілёў па маршруце Мінск — Магілёў складаў 13 140 рублёў, цягніка №616 Гродна — Гомель па маршруце Мінск — Гомель — 16 080 рублёў, дык пасля павышэння кошту за праезд пасажыру неабходна будзе заплаціць адпаведна 15 740 і 19 270 рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

УЗЯЎ 30 ТЫСЯЧ «ЗЯЛЁНЫХ» І СЕЎ

Суд Кастрычніцкага раёна г. Мінска прызнаў спадара Г. вінаватым у замаху на махлярства ў асабліва буйным памеры і падбухторванні да дачы хабару ў буйным памеры і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 5 гадоў з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі строгага рэжыму і канфіскацыяй маёмасці.

Сёлета ўпраўленнем КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці была заведзена крымінальная справа ў дачыненні да жыхара сталіцы 1958 года нараджэння. Следства ўстанавіла, што грамадзянін падбухторваў іншага жыхара Мінска да дачы хабару праз яго пасрэдніцтва нібыта службовым асобам органаў унутраных спраў за спрыяльнае вырашэнне пытання пра непрыцягненне сужыцелькі Л. да крымінальнай адказнасці. Не маючы намеру і фактычнай магчымасці перадаваць грашовыя сродкі прадстаўнікам органаў правапарадку, спадар Г. планаваў патраціць атрыманыя 30 тысяч долараў на асабістыя патрэбы. У момант перадачы грошай зламыснік быў затрыманы аператыўнай групай УКДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці.

Святлана БАРЫСЕНКА.

КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА ЗАВЕДЗЕНА ПА ФАКЦЕ ВАНДАЛІЗМУ ВА ЎРОЧЫШЧЫ «КУРАПАТЫ»

Фота Пятра ФАМІНА.

Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама.

Ва УУС праінфармавалі, што на тэрыторыі ўрочышча «Курапаты» каля вёскі Баравая невядомы пашкодзіў 38 драўляных крыжоў. Пасля праведзенай праверкі заведзена крымінальная справа.

ДАВЯДЗЕЦЦА ВЯРНУЦЬ Br 328,5 МЛН

Супрацоўнікі Баранавіцкага міжрайаддзела камітэта дзяржкантролю выйшлі на прадпрымальніка з Баранавіч, які стаў адным з рэкардсменаў па няўплаце падаткаў. З 2007 па 2009 гг. яму ўдалося занізіць свае даходы і ў выніку дзяржаве былі нанесеныя страты ў асабліва буйным памеры. Крымінальная справа перададзена ў суд.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

БОЛЬШАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ЛІЧАЦЬ ПАЛІТЫЧНЫМ ПЫТАННЕМ ПРЫЗНАННЕ АБО НЕПРЫЗНАННЕ ЗАМЕЖНЫМІ КРАІНАМІ ВЫНІКАЎ ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ

Большасць грамадзян Беларусі лічаць палітычным пытаннем прызнанне або непрызнанне вынікаў прэзідэнцкіх выбараў замежнымі краінамі, на іх пазіцыю не ўплываюць дзеянні беларускага боку. Такой думкі прытрымліваюцца 77,7 працэнта ўдзельнікаў рэспубліканскага сацыялагічнага даследавання, праведзенага ў кастрычніку 2010 года Аналітычным цэнтрам EcooM, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў цэнтры.

У тым, што Беларусь можа ўплываць на рэакцыю замежных краін на вынікі выбараў, перакананы 16 працэнтаў апытаных. Не змаглі адказаць на пытанне сацыёлагаў 2,6 працэнта ўдзельнікаў апытання, 3,7 працэнта не далі адказу. 20,8 працэнта рэспандэнтаў спакойна ўспрымуць сітуацыю, калі міжнародныя наглядальнікі не прызнаюць выбары. Гэта рашэнне сапсуе настрой 0,1 працэнта апытаных. Адмоўна да яго паставяцца 28,6 працэнта рэспандэнтаў, станоўча — 6 працэнтаў. Не змаглі выказаць свае адносіны да гэтай сітуацыі 4,3 працэнта ўдзельнікаў апытання, 38,5 працэнта не далі адказу. Адказваючы на пытанне аб тым, ці прызнае Расія выбары ў Беларусі, 21,2 працэнта рэспандэнтаў адзначылі «так», 12,6 працэнта — «хутчэй так», 10,8 працэнта — «не», 18,4 працэнта — «хутчэй не», 29,7 працэнта — «не магу адказаць», 7,3 працэнта — «няма адказу». На думку 64,6 працэнта грамадзян, вынікі маючых адбыцца выбараў не залежаць ад пазіцыі кіраўніцтва Расіі.

33,6 працэнта апытаных лічаць, што Еўрапейскі саюз прызнае выбары, 22,4 працэнта — што хутчэй прызнае. Процілеглай думкі прытрымліваюцца 11,5 працэнта ўдзельнікаў сацапытання («хутчэй не»), 8,1 працэнта («не»). Не змаглі адказаць на пытанне 19,2 працэнта апытаных...

ЦУДЫ ЖЫЦЦЯ ФЕСТЫВАЛЮ

Яны адкрываюць магчымасці зносін з кіналегендамі

Фота БЕЛТА.

Эмір Кустурыца спазніўся, але прыехаў! Аднак сербскі рэжысёр павінен паспець усё, што запланавана праграмай. А гэта сустрэчы не толькі са студэнтамі і майстар-клас. Усё-такі было адчуванне таго, што прыезд знакавай асобы сусветнага кіно вельмі важны для нас і, магчыма, цікавы для госця. Бо падчас фестывалю традыцыйна ўручаецца спецыяльны прыз Прэзідэнта «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве». Калі не яму, то каму яго ўручаць сёлета?.. Невыпадкова пасля таго, як яго прыватны самалёт прызямліўся ў Мінску, Эмір Кустурыца амаль адразу накіраваўся на сустрэчу з кіраўніком Беларусі...

Кустурыца ў Мінску не першы раз — ужо выступаў тут з музычным праектам. Напэўна, адчуў, што яму ў Беларусі вельмі рады. І на гэты раз прыехаў з дзецьмі, ужо на пару дзён. Аднак толькі да 11 лістапада, і таму на цырымоніі закрыцця мы яго не ўбачым. А шкада...

Між іншым, не ўбачым на чырвоным дыванку ва ўсім бляску яшчэ адну сёлетнюю зорку фестывалю — народную артыстку СССР Людмілу Гурчанку. Яе візіт сёлета абумоўлены прадстаўленнем фільма «Страката змярканне», над якім Людміла Маркаўна працавала ўпершыню як рэжысёр. Безумоўна, яна ж у ім была і галоўнай зоркай, бо выконвала ролю актрысы, якая пакутуе ад самоты. Было пачуццё, што ў фільме гучаць яе ўласныя думкі...

Цікавасць да фільма з боку беларускай публікі была на ўзроўні ажыятажу — зала ў Доме кіно была запоўненая. І адчувалася, што людзі прыйшлі не толькі дзеля таго, каб паглядзець кіно. Прыцягвала і сама легенда савецкага кіно, якой 12 лістапада споўніцца 75 гадоў. Якая яна насамрэч? Як выглядае ў жыцці? Яна ж імкнулася паказаць: шыкоўна.

Расказала пра свой першы вопыт рэжысёрскай працы. Людміла Маркаўна з задавальненнем адказвала на пытанні гледачоў. Нават спявала. Нават пра вайну. Наш глядач гэта ацаніў. Як і словы пра тое, што яна любіць Мінск, які квітнее з кожным годам усё больш. Наш глядач увогуле вельмі чуллівы: некаторыя падчас фільма пусцілі слязу. Некаторыя, магчыма, проста хавалі свае эмоцыі, затое потым адлюстравалі іх у адзнаках. Пакуль што фільм «Стракатае змярканне» атрымаў ад гледачоў адзнакі, вышэйшыя за ўсе папярэднія стужкі. Вось што значыць загартоўка савецкім кіно: добры фільм — калі плакаць хочацца...

Ларыса ЦІМОШЫК.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.11.2010 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША 3 027,00	1 чэшская крона 170,50	USD 30,8612	Агенцтва Уладзіміра Грыцова
▼ 1 еўра 4 189,07	1 польскі злоты 1064,51	10 UAH 38,7704	
1 латвійскі лат 5 910,38	■ 1 расійскі рубель 98,08	1000 BYR 10,2122	
1 літоўскі літ 1 214,25	1 украінская грыўня 380,32	EUR 42,7798	

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ТРЭБА ТОЛЬКІ АДНО — УВАГА ДА ЧАЛАВЕКА І ЖАДАННЕ ЯМУ ДАПАМАГЧЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як было агучана на нарадзе, штогод у органы дзяржаўнай улады звяртаецца каля аднаго мільёна чалавек. Прычым пытанні, якія закранаюць у сваіх зваротах грамадзяне, датычыцца шырокага спектра праблем, сярод якіх пераважная большасць — сацыяльная сфера. Тэмай жа, якая тут лідзіруе, з'яўляюцца скаргі на працу арганізацый сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Перш за ўсё людзей не задавальняе якасць праведзенага бягучага і капітальнага рамонту, арганізацыя водазабеспячэння, узровень добраўпарадкавання тэрыторый. Аднак найбольшае абурэнне ў людзей выклікаюць безадказнасць і расхлябанасць работнікаў ЖКГ: больш як 80 працэнтаў скаргаў указвае на гэты фактар. На працягу шэрагу гадоў назіраецца і рост колькасці скаргаў па пытаннях будаўніцтва жылля. За 9 месяцаў гэтага года аб'ём пошты па гэтай тэматыцы перавысіў 25 тысяч зваротаў. У раёнах, дзе вядзецца інтэнсіўнае будаўніцтва, удзельная вага скаргаў дасягае 30 працэнтаў ад агульнай колькасці. У гэтай сувязі па даручэнні кіраўніка дзяржавы ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі і Мінску была арганізаваная работа «гарачых тэлефонных ліній» па пытаннях якасці будаўніцтва жылля. Найбольшая колькасць нараканняў прыходзілася на кошт жылля, якасць і тэрміны ўводу ў эксплуатацыю жылых дамоў. Асаблівую трывогу ў людзей выклікае ўвод жылых дамоў, якія не забяспечаныя газам, электраэнергіяй і іншымі рэсурсамі.

Зонай павышанай сацыяльнай напружанасці застаецца сфера аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву. Сёлета толькі ў Міністэрства і падведамасныя арганізацыі паступіла 25 тысяч зваротаў. Паводле матэрыялаў сацапытання, грамадзян перш за ўсё не задавальняе наяўнасць чэргаў у паліклініках — на гэта ўказалі 46,3 працэнта, фармальныя адносіны да пацыентаў — 37,1 працэнта, недахоп вузкіх спецыялістаў — 36,2 працэнта. У сферах адукацыі, транспарту, сувязі, гандлю і бытавога абслугоўвання сельскага насельніцтва парушэнні набылі хранічны характар. У прыватнасці, вяскоўцы з года ў год просяць адрамантаваць дарогі, па якіх не могуць праехаць ні аўталаўкі, ні машыны «хуткай дапамогі», указваюць на недахопы ў водазабеспячэнні, нізкую якасць гандлёвага і бытавога абслугоўвання. Скардзяцца на «старасць» сельскіх школ, у якіх больш за 30 гадоў не было рамонту, і складанасці падвозу дзяцей у дзіцячыя садкі і школы. Што ж датычыцца сельскіх выканкамаў, то яны абмяжоўваюцца толькі рэгістрацыяй і перасылкай скаргаў у райвыканкамы, якія, у сваю чаргу, не заўсёды рэагуюць на іх. Усё вышэйзгаданае, лічыць Прэзідэнт, кажа пра тое, што пакуль работа службовых асобаў са зваротамі грамадзян не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца.

«Улада, — падкрэсліў ён, — павінна забяспечваць штодзённы клопат аб людзях». Таму Аляксандр Лукашэнка паставіў шэраг канкрэтных задач і катэгарычна запатрабаваў іх выканання. Так, паводле яго слоў, улада павінна стаць даступнай і інфармацыйна адкрытай для грамадзян. Адсутнасць у працы чыноўнікаў апошняга патрабавання прыводзіць да таго, што людзям часам даводзіцца абапірацца на нейкія чуткі, што, зразумела, выклікае негатыўную рэакцыю ў грамадстве. Таксама кіраўнік дзяржавы мяркуе, што павінны быць рэалізаваныя сацыяльныя стандарты з магчымай карэкціроўкай, аднак не ў бок іх спрашчэння. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, адказнасць за работу са зваротамі грамадзян павінны ўзяць на сябе усе механізмы ўлады. І грамадскія аб'яднанні — прафсаюзы, арганізацыі ветэранаў, БРСМ і іншыя — не павінны заставацца ўбаку. Гэта датычыцца і дэпутатаў усіх узроўняў, работа якіх са зваротамі грамадзян з'яўляецца адной з галоўных. «У адстойванні правоў грамадзян не бачная роля Генеральнай пракуратуры», — заўважыў Прэзідэнт. Таму ён даручыў Генпракуратуры ўзмацніць нагляд за захаваннем заканадаўства аб зваротах грамадзян.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Прамая лінія

ТЭРМІН ПЛАЦІЦЬ МАЁМАСНЫЯ ПАДАТКІ

Сёлета да 15 лістапада ўключна падаткаплацельшчыкам, якія маюць нерухомую маёмасць, неабходна заплаціць зямельны падатак і падатак на нерухомасць. Днямі на рэсурсах МПЗ адбылася прамая інтэрнэт-лінія, падчас якой на пытанні нашых чытачоў і карэспандэнта «Звязды» адказваў намеснік міністра па падатках і зборах Аляксандр ДАРАШЭНКА.

@— Растлумачце мне сітуацыю па недабудаваных памяшканнях. У прыватнай уласнасці маю жылы дом і гаспадарчыя пабудовы. У сваім доме я часткова пабудаваў жылы паддашак, або так званую мансарду. БТІ аціаніла працэнт яго гатоўнасці на 27 працэнтаў і адлюстравала кошт гэтага памяшкання ў тэхнічным пашпарце на дом. Ці павінен я сплачваць плацёж падатак на нерухомасць і за гэтую частку дома? Наколькі мне вядома, падатак на нерухомасць, якая незавершаная будаўніцтвам, налічваецца, калі гатоўнасць аб'екта складае 80 і больш працэнтаў.

Іван Зімін,
Брэсцкая вобласць.

— Згодна з адпаведнымі тлумачэннямі Камітэта па зямельных рэсурсах ад 28.07.2004 г. № 39, мансардай з'яўляецца апошні паверх пад дахам жылога дома, у якім памяшканні часткова ці цалкам маюць нахіленыя столі. Мансарда з'яўляецца часткай усяго будынка. Аб'ектам падаткаабкладання з'яўляецца ўвесь дом, а не дом і асобна мансарда. У вашым выпадку падатковыя інспектары разглядалі гатоўнасць усяго дома з улікам пабудаванай мансарды.

Падлік падатку на нерухомасць ажыццяўляецца з ацэначнага кошту будынка ці пабудовы ўпаўнаважаным органам па стане на 1 студзеня 2010 года. Стаўка падатку не залежыць ад віду аб'екта нерухомасці і ўстаноўленая ў адзіным памеры — 0,1 працэнта ад ацэначнага кошту будынка ці пабудовы.

Заўважу, што мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць права павялічваць (памяншаць) стаўку падатку на нерухомасць, аднак не больш чым у два разы. У гэтым выпадку стаўка падатку можа складаць у межах ад 0,05 да 0,2 працэнта.

@— Я былая настаўніца, зараз непрацуючая пенсіянерка не па ўзросце. Жыву ў горадзе Валожын у сям'і працаздольнай дачкі. Пасля смерці маці атрымала ў спадчыну палову дома ў вёсцы. Ці маю я льготы па падатку на нерухомасць і зямлю?

Настасся Рудовіч.

— Згодна з дзейным заканадаўствам, ільготы па плаце зямельнага падатку і падатку на нерухомасць прадастаўляюцца толькі пенсіянерам па ўзросце. У вашым выпадку права на льготы па гэтых падатках вы не маеце.

@— Разам з сям'ёй жыву ў дзяржаўнай кватэры. У мяне ва ўласнасці ёсць яшчэ кватэра, якую я атрымала ў спадчыну. У той кватэры ніхто не жыве і не зарэгістраваны. Ці павінна я плаціць падатак на нерухомасць з той кватэры?

Спадарыня Кавальчук,
г. Мінск.

— На праве ўласнасці вам належыць толькі адна кватэра, у адносінах да якой вы маеце льготу па падатку на нерухомасць у выглядзе поўнага вызвалення ад платы падатку. У адносінах да дзяржаўнай кватэры вы таксама не з'яўляецеся плацельшчыкам падатку, бо гэта жыллё вам не належыць. Акрамя таго, у вашым выпадку, атрымліваючы кватэру ў спадчыну, вы атрымліваеце даход у натуральнай форме. Такі даход не падлягае падаткаабкладанню падаходным падаткам згодна з п.п. 1.17 артыкула 163 Падатковага кодэкса РБ.

@— Жыву ў Вілейцы ў сваім прыватным доме. Зараз не працую, бо з'яўляюся пенсіянерам па ўзросце. Разам са мною ў доме прапісаны паўналетні сын, які зараз служыць у войску (тэрміновая служба). Ці маю я права на льготу на нерухомасць?

Міхаіл Якаўлевіч.

— Пенсіянеры па ўзросце маюць права на льготу па падатку на нерухомасць пры ўмове, што з імі не жывуць ці не лічацца ў сумесным пражыванні згодна са звесткамі пагаспадарскага ўліку ці дамавых кніг працаздольныя асобы. Пры гэтым не ўлічваюцца ў складзе працаздольных асоб ваеннаслужачыя, якія часова не жывуць, бо праходзяць тэрміновую ваенную службу. Менавіта таму на перыяд службы вашага сына за жылы дом падатак на нерухомасць вам плаціць не трэба.

@— Я прапісана і жыву адна ва ўласнай кватэры ў абласным цэнтры. Акрамя гэтага, мне належыць зямельны ўчастак з садовым домікам у Брэсцкай вобласці. Ці трэба мне плаціць падатак на нерухомасць і зямлю? Як зменіцца сітуацыя, калі я стану пенсіянерам па ўзросце?

Спадарыня Ганна, *г. Брэст.*

— Згодна з падатковым заканадаўствам, фізічныя асобы маюць права на льготу па падатку на нерухомасць у адносінах да адной кватэры ў шматкватэрным жылым доме, калі гэта жыллё належыць грамадзяніну на праве ўласнасці. Таму ў адносінах да кватэры ў г. Брэсце вы вызваляецеся ад платы падатку на нерухомасць. А вось за зямельны ўчастак і садовы домік вам неабходна заплаціць зямельны падатак і падатак на нерухомасць. Пасля таго, як вы станеце пенсіянерам па ўзросце, тады атрымаеце права на падатковую ільготу па зямельным участку і садовым доміку.

@— Маю ва ўласнасці адну кватэру ў Заводскім раёне сталіцы. Сёлета ў маі я купіла ў Мінску другую кватэру. Ведаю, што павінна плаціць падатак, аднак пакуль ніякіх папер на гэты конт не атрымала. Ці трэба мне самастойна звяртацца ў падатковую інспекцыю?

Наста Анціпа, *г. Мінск.*

— Так, вы з'яўляецеся плацельшчыкам падатку на нерухомасць. Тут заканадаўствам вам даецца льгота ў адносінах да адной з кватэры па вашым выбары. Каб атрымаць такую льготу па падатку, вам неабходна падаць у падатковы орган заяву, дзе ўказаць усе жылыя памяшканні (кватэры, пакоі), што належаць вам на праве ўласнасці.

Вылічэнне падатку з другой кватэры ажыццяўляецца падатковай інспекцыяй, зыходзячы з ацэначнага кошту аб'екта па стане на 1 студзеня 2010 г. Улічваючы тое, што другая кватэра была набытая вамі ў маі 2010 г., тады падатак вылічваецца за перыяд з чэрвеня да снежня 2010 г. Падатак плаціцца на падставе паведамлення падатковай службы не пазней як 15 лістапада.

@— Я працую на заводзе. Жыву ў прыватнай кватэры ў Гродне і маю свой дом у Гродзенскім раёне. Трэба мне плаціць падатак за дом ці я магу разлічыцца па падатках не з дома, а з кватэры?

Пётр Кулік, *г. Гродна.*

— Калі вы на праве ўласнасці маеце толькі адну кватэру, тады прадастаўляецца права на ільготу па падатку на такую нерухомасць у выглядзе поўнага вызвалення ад платы падатку. А вось па жылым доме вам трэба плаціць падатак на нерухомасць. Заўважу, што ў гэтай сітуацыі права выбару, па якім з двух аб'ектаў — жылым доме ці кватэры — плаціць падатак вы як плацельшчык не маеце.

Кар. «Звязды»:

@— У рэдакцыю з пытаннем звярнулася Вольга Мікалаеўна з Мінска. У яе сына ў сельскай мясцовасці ёсць недабудаваны дом. Знаёмыя ёй падказалі, што за такі зямельны ўчастак сёлета плаціць не трэба. Гэта сапраўды так?

— Сапраўды, у 2010 годзе плацельшчыкі маюць права на льготу па зямельным падатку ў адносінах да зямельных участкаў, што былі прадастаўлены ім для будаўніцтва жылых дамоў, на перыяд будаўніцтва. Аднак, нагадаю, што ў 2011 годзе гэтая льгота адменена.

@— Мы жывём у Мінскім раёне, у вёсцы Малінаўка. Тут няма прыроднага газу, цэнтральнай каналізацыі і падводу вады да дамоў. Карыснасць зямельных участкаў у вёсцы практычна аднолькавая. Аднак не зразумела, чаму падатак на зямлю ў розных уладальнікаў, пры аднолькавай плошчы, істотна адрозніваецца?

Вольга Аляксандраўна.

— Вылічэнне зямельнага падатку ажыццяўляецца, зыходзячы з кадастравага кошту зямельнага ўчастка. Гэты кошт зямлі падлічваўся землеўпарадкавальнымі службамі мясцовых выканаўчых камітэтаў. Пры кадастравым кошце зямельнага ўчастка да 80 млн рублёў за гектар стаўка падатку вызначана ў памеры 80 тысяч рублёў за гектар. Калі кадастравы кошт зямельнага ўчастка больш за 80 млн рублёў за гектар, тады падатак вызначаецца па стаўцы 0,1 працэнта ад кадастравага кошту зямельнага ўчастка.

На велічыню падатку паўплываюць і рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў, якім заканадаўствам прадастаўлена права павялічваць (памяншаць) не больш чым у два разы стаўку падатку.

Адзначу, што стаўка зямельнага падатку залежыць толькі ад функцыянальнага выкарыстання зямельнага ўчастка і не залежыць ад наяўнасці падводу вады ў дамы, цэнтральнай каналізацыі ці наяўнасці іншых умоў. Каб атрымаць дакладныя тлумачэнні пра парадак вылічэння вам зямельнага падатку, неабходна звярнуцца ў падатковы орган па месцы знаходжання зямельнага ўчастка.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

ЦІ З'ЯВІЦЦА Ў НАС ТАННЫ ДЗІЦЯЧЫ АБУТАК І АЙЧЫННЫЯ СКУРАНЫЯ КУРТКІ?

Адказы на гэтае пытанне шукалі ўдзельнікі працоўнай нарады, прысвечанай праблемам гарбарнай галіны, якая адбылася ў Камітэце дзяржаўнага кантролю

Учснежні мінулага года кіраўнік дзяржавы даручыў Камітэту дзяржкантролю прасачыць за выкананнем яго даручэння па аздараўленні сітуацыі ў гарбарнай галіне. За апошні час кантрольнае ведамства правяло вялікую работу па аналізе стану спраў у гэтай вытворчасці, кіраўніцтва Камітэта асабіста наведала абутковыя, галантарэйныя і гарбарныя прадпрыемствы. На нараду былі запрошаны прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых у вырашэнні «гарбарнага» пытання міністэрстваў, арганізацый і ведамстваў, каб разам знайсці адзінае правільнае і эфектыўнае рашэнне для выпраўлення сітуацыі да лепшага.

— А сітуацыя няпростая, — канстатаваў **старшыня Камітэта Зянон ЛОМАЦЬ**. — Не забяспечаны прагнозныя паказчыкі, рэнтабельнасць застаецца адмоўнай, загрузка вытворчых магутнасцяў надзвычай нізкая — не больш за 60 працэнтаў! І ў гэтым нельга сёння абвінавачваць кіраўнікоў прадпрыемстваў. Бо тыя, хто абавязаны пастаўляць сыравіну — мясакамбінаты і спажыўкааперацыя — не забяспечваюць патрэбы нашых гарбарных заводаў. І справа не ў тым, што не хочуць гэтага рабіць, а ў тым, што ім дадзена магчымасць прадаваць скуры на экспарт і перакупшчыкам. Аднак нельга забываць, што наша сельская гаспадарка, якая атрымлівае каласальную дапамогу ад дзяржавы, павінна ў першую чаргу забяспечваць сыравінай унутраны рынак.

У нашай краіне ўсяго шэсць гарбарных прадпрыемстваў — ААТ «Мінскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне» (МВГА), РУП «Гродзенскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне», СП «Гатава-Тэнеры» ТАА, СП «Смілавіцкі гарбарны завод» ТАА, ААТ «Гарбар» (г. Магілёў). За апошні год аб'ём вытворчасці прадукцыі зменшыўся, сёлета два заводы (МВГА і «Гарбар») церпяць страты, прадпрыемствы адчуваюць недахоп зваротных сродкаў, што вымушае іх звяртацца па крэдыты і пазыкі.

Павольна адбываецца тэхнічнае пераўзбраенне гарбарных прадпрыемстваў, знос вытворчых фондаў якіх складае амаль 90 працэнтаў. Пры гэтым у поўнай меры не выкарыстоўваюцца льготныя крэдыты, якія былі выдаткаваныя на гэтыя мэты канцэрну «Беллегпрам», у падпарадкаванні якога знаходзіцца гарбарная галіна. За першыя паўгода заводамі не былі выкарыстаныя крэдыты на набыццё і мадэрнізацыю абсталявання на суму амаль у 8 млрд рублёў.

Толькі Мінскаму вытворчаму гарбарнаму аб'яднанню выдаткавана 5 млрд крэдытных сродкаў, у тым ліку 2 млрд — на набыццё і мадэрнізацыю абсталявання. Аднак і праз год пасля таго, як прадпрыемства было ўключана ў пералік арганізацый, якім даюцца крэдыты, МВГА не скарысталася дзяржаўнай падтрымкай.

Адной з самых балючых праблем, якая тэрмінова патрабуе вырашэння, на нарадзе было названа забеспячэнне поўнай загрузкі магутнасцяў гарбарных прадпрыемстваў. Для гэтага апошнім патрэбна 1058 тыс. шт. буйной гарбарнай сыравіны, 238 тыс. шт. дробнай і 802 тыс. шт. свіной.

— Сыравінай гарбарныя прадпрыемствы забяспечаныя сёння на 58 працэнтаў, — паведаміў журналістам вынікі праведзенага расследавання **намеснік старшыні Камітэта дзяржкантролю Аляксандр АГЕЕЎ**. — Ці можа наша сельская гаспадарка забяспечыць патрэбы гарбарных заводаў цалкам? У 2008 годзе перапрацоўчым заводам нашы мясакамбінаты паставілі 2 млн 280 тыс. шт. скур і тым самым амаль на 100 адсоткаў загрузілі прамысловасць. Чакаецца, што сёлета мясакамбінаты паставяць на ўнутраны рынак толькі 1 млн 200 тыс. шт. скур. Значыць, патэнцыял ёсць. Але тут узнікае пытанне — як, па якой цане пастаўляць скуры? Як прадаваць іх на экспарт? Ці варта ўводзіць нейкія абмежаванні, мытныя пошліны, на якіх настойвае канцэрн «Беллегпрам»? Мы лічым, што загрузіць прадпрыемствы трэба, і магчымасці для гэтага ёсць. Але для гэтага важна выконваць графікі і пагадненні паміж пастаўшчыкамі сыравіны і перапрацоўчымі прадпрыемствамі. Магчыма, больш строгаму выкананню першага і другога паслужыў бы дзяржзаказ, які быў бы абавязковым і для скуранай галіны, і для прадпрыемстваў Мінсельгасхарча.

Наступствам недахопу гарбарнай сыравіны на перапрацоўчых прадпрыемствах з'яўляецца павялічэнне аб'ёмаў закупак імпартнай скуры нашымі абутковымі і галантарэйнымі заводамі. Сёлета за 8 месяцаў беларускія абутнікі вымушаныя былі на закупку скураных тавараў выдаткаваць амаль 30 млн долараў ЗША.

Натуральна, што для насельніцтва гэта азначае высокую цану на скураны абутак. І калі дарослыя маюць у гэтым выпадку права выбару, то з абуткам для дзяцей сітуацыя ператвараецца ў сапраўдную праблему. Дарэчы, маніторынг Камітэта дзяржкантролю вызначыў, што цэны на дзіцячы абутак неапраўдана завышаныя.

Для таго, каб гарбарная сыравіна, якая прапануецца на экспарт, стала больш даступнай для айчынных заводаў, сёлета было прынятае рашэнне аб яе рэалізацыі на ўнутраным рынку праз біржавыя таргі, якія праводзяцца на Гандлёвай біржы. Аднак закупка гарбарнай сыравіны на біржавых таргах цягне падаражанне выраблёных скур і, на думку канцэрна «Беллегпрам», зробіць іх неканкурэнтаздольнымі на ўнутраным і знешнім рынках гатовай скуры.

— Самым разумным у гэтай сітуацыі было б пайсці па шляху, які ўжо выкарыстоўваўся раней і які сёння паспяхова працуе ў Расіі для яе гарбарнай галіны, — выказаў меркаванне ўсіх гарбароў **генеральны дырэктар ААТ «Мінскае вытворчае гарбарнае аб'яднанне» Андрыян КЛЯЎЗУНІК**. — Гэта — увядзенне экспартнай пошліны на гарбарную сыравіну ў памеры 500 еўра за тону і мытнай пошліны на паўфабрыкаты ў памеры 10 працэнтаў ад кошту вырабу. Пры гэтым мы, па меры таго як устанем на ногі, гатовыя збяспечыць рэнтабельнасць і вырабляць не менш за 825 тыс. шт. якасных скур у год.

Гарбары прызнаюць, што для вырашэння праблемы недастаткова толькі загрузіць вытворчасць сыравінай, трэба яшчэ і павысіць якасць выраблёных скур. Абутнікі і галантарэйшчыкі нагадалі, што для іх вельмі важна мець не проста добра выраблёныя скуры, але іх шырокі асартымент: па колерах, таўшчыні, фактуры.

«У сваёй краіне мы не змаглі нават знайсці матэрыял для вырабу рамянёў па замове Міністэрства абароны», — скардзіліся вытворцы скураной галантарэі.

«Усім вядома, што свіны хром — лепшы матэрыял для дзіцячага абутку, але і яго недастаткова вырабляюць нашы гарбары», — падтаквалі абутнікі.

Адным з кірункаў глыбокай перапрацоўкі гарбарнай сыравіны з'яўляецца вытворчасць мэблевых скур. Такія скуры пакуль у Беларусі не вырабляюцца, а запатрабаванасць у іх толькі сёлета складае 947 тыс. кв.м. Сёння інвестыцыйны праект па арганізацыі вытворчасці мэблевых скур рэалізуе ААТ МВГА, для чаго ўжо інвеставана 5 млрд рублёў уласных сродкаў.

Прадстаўнікі Мінсельгасхарча ў сваю чаргу не бачаць праблемы ў тым, каб загрузіць сыравінай нашы гарбарныя заводы, але сумняваюцца, што тыя своечасова разлічацца і забяруць з мясакамбінатаў прадукцыю, якая мае абмежаваныя тэрміны захоўвання.

Па выніках вывучэння сітуацыі ў гарбарнай галіне Камітэт дзяржкантролю лічыць неабходным забяспечыць максімальную загрузку вытворчых магутнасцяў арганізацый гарбарнай галіны, у першую чаргу за кошт паставак айчыннай сыравіны.

Другая неабходная мера — паскарэнне мадэрнізацыі і тэхнічнага пераабсталявання скураной галіны, забеспячэнне спярша рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па арганізацыі мэблевых скур.

З улікам дзяржаўнай падтрымкі гарбарным прадпрыемствам рэкамендавана пагасіць запазычанасць перад пастаўшчыкамі сыравіны і забяспечыць закупку сыравіны ў неабходных аб'ёмах.

У рамках праграмы па імпартазамяшчэнні «Беллегпрама» было ўказана прыняць дадатковыя меры па забеспячэнні абутковых і скургалантарэйных арганізацый неабходным асартыментам айчыннай гарбарнай сыравіны патрэбнай якасці.

Усё гэта, на думку Камітэта дзяржкантролю, павінна забяспечыць выхад усіх арганізацый скураной галіны на рэнтабельную працу.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Егер па доглядзе вальерных жывёл Белавежскай пушчы Мікалай Кірылаў сочыць за ростам зубраняці-сегалетка, якое засталося без апекі матулі-карміцелькі. Маці-зубрыху вальернага гадаванца сёлета перавезлі ў Расію.

Перад першай зімой

ГЭТА БЫЎ КАЛІСЬЦІ ДЗЕНЬ МІЛІЦЫІ

10 лістапада непарыўна звязана ў старэйшага пакалення з Днём савецкай міліцыі. Сёння гэта — Дзень ушанавання ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў МУС.

Менавіта ў гэты дзень у 1917 годзе пастановай НКУС РСФСР было зацверджана палажэнне аб працоўнай міліцыі. З 1962 года дата была афіцыйна прызнаная Мікітам Хрушчовым. Аднак з набыццём незалежнасці новым днём абаронцаў правапарадку стала ў Беларусі 4 сакавіка — дзень, калі ў тым жа 1917-м годзе загадам грамадзянскага каменданта горада Мінска Міхаіл Фрунзэ быў «прызначаны часовым начальнікам міліцыі Усерасійскага Земскага саюза па ахове парадку ў горадзе».

Сёння ў актавай зале Дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра МУС адбудуцца асноўныя ўрачыстасці. Упершыню на мерапрыемстве прагучыць марш беларускай міліцыі, музыку да якога напісаў народны артыст СССР, народны артыст Беларусі, старшыня Саюза кампазітараў Ігар Лучанок. Словы маршу належаць ветэрану органаў унутраных спраў, палкоўніку міліцыі ў адстаўцы Вячаславу Оськіну.

— 10 лістапада стала свайго роду данінай павагі ветэранам органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў, — кажа **старшыня Савета беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў Віктар ПІСКАРОЎ**. — На працягу трох дзён ва ўсіх раённых, гарадскіх аддзелах унутраных спраў, ва ўсіх УУС, службах МУС, воінскіх часцях унутраных войскаў адбываецца ўшанаванне ветэранаў. Гэта важна і для ветэранаў, і для маладых, якія могуць браць прыклад з канкрэтных людзей, якія прысвяцілі службе чвэрць і болей стагоддзя.

Савет беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў аб'ядноўвае звыш 22 тысяч ветэранаў, каля 320 пярвічных арганізацый. Гэта самая магутная ветэранская арганізацыя ў сістэме сілавых і праваахоўных органаў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

МІХАІЛ АНДРЭЕВІЧ САВІЦКІ



Фота БЕЛТА.

8 лістапада на 89-м годзе жыцця перастала біцца сэрца Героя Беларусі, народнага мастака СССР, народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і Рэспублікі Беларусь, акадэміка, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, ганаровага грамадзяніна г. Мінска, кіраўніка дзяржаўнай установы культуры «Творчыя акадэмічныя майстэрні жывапісу, графікі і скульптуры» Міхаіла Андрэевіча Савіцкага.

Міхаіл Андрэевіч Савіцкі быў адным з выдатных прадстаўнікоў нацыянальнага выяўленчага і манументальнага мастацтва, тых самабытных майстроў, якія вызначаюць дасягненні беларускага жывапісу другой паловы XX і пачатку XXI стагоддзя.

М.А. Савіцкі нарадзіўся 18 лютага 1922 года ў вёсцы Звянячы Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1940 годзе быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Дваццацігадовы юнак, салдат Чырвонай Арміі, які змагаўся ў баях за горад Севастопаль і быў паранены на Херсанесе, апынуўся ў канцлагерах Бухенвальд, Дахау, Мітэльбау-Дора, дзе падзяліў трагедыю народаў Еўропы, але цудам застаўся ў жывых, каб пасля пэндзлем адлюстраваць на палотнах страшэнную і горкую праўду аб жорсткай вайне, нязломнасці духу народа.

Пасля вайны М.А. Савіцкі скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, у 1957 годзе — Маскоўскі мастацкі інстытут імя Сурыкава з адзнакай, пасля чаго жыў і працаваў у Мінску. З 1981 года быў кіраўніком Творчых акадэмічных майстэрняў жывапісу, графікі і скульптуры.

М.А. Савіцкім створана больш за 200 тэматычных работ, у якіх ён развіваў традыцыі рэалістычнага мастацтва. Вызначальным стрыжнем творчых пошукаў М.А. Савіцкага з'яўляўся Чалавек, яго светаразуменне, маральная сутнасць, характар у складаным дыялектычным развіцці. Аптыміст і жыццялюб, М.А. Савіцкі на працягу ўсёй сваёй творчасці самааддана адстойваў сваім майстэрствам гуманістычныя ідэалы. З'яўляючыся многія гады настаўнікам таленавітай моладзі, ён набыў велізарны аўтарытэт і павагу як у Беларусі, так і далёка за яе межамі.

Творчасць М.А. Савіцкага вызначаецца глыбокім пранікненнем у сутнасць з'яў мінулага і сучаснага, філасофскім іх асэнсаваннем, сцвярджэннем вечных духоўных каштоўнасцей чалавецтва. М.А. Савіцкі — аўтар шырока вядомых жывапісных твораў, прысвечаных гераічнай партызанскай барацьбе супраць гітлераўскіх захопнікаў: «Партызаны», «Партызанская мадонна», «Віцебскія вароты», «Поле», «Плач па загінулых героях», а таксама цыкла з 16 карцін «Лічбы на сэрцы» і трыпціха «Агрэсія», прасякнутых антыфашысцкім пафасам і публіцыстычнасцю. Шмат карцін прысвечана тэме гісторыі станаўлення беларускай нацыянальнай культуры: «Сейбіты», «Віленскія сустрэчы»; цыкл палотнаў для Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы ў Мінску. Маштабнасць і сімвалічнасць мастацкай мовы характэрны для яго манументальных работ: роспісы «Вялікая Айчынная вайна.1944» у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску і «Эстафета пакаленняў» у санаторыі «Беларусь» у Місхоры, габелены для залы пасяджэнняў ЦК КПБ (цяпер рэзідэнцыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, тры апошнія — у сааўтарстве з А. Кішчанкам); серыя работ «Чорная быль», што адлюстравала трагедыю беларускага народа, які пацярпеў ад чарнобыльскай катастрофы.

Палотны М.А. Савіцкага захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Музеі гісторыі горада Мінска, Траццякоўскай галерэі (Масква), фондах Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі, Нацыянальнай галерэі г. Сафіі (Балгарыя) і інш.

М.А. Савіцкі быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1967), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972), ордэнам Леніна (1982), ордэнам Францыска Скарыны (1997).

М.А. Савіцкі быў выбраны правадзейным членам Акадэміі мастацтваў СССР (1982), Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1995), Міжнароднай Славянскай Акадэміі (1996), Міжнароднай Акадэміі навук (2002).

Светлае імя Міхаіла Андрэевіча Савіцкага назаўсёды захаваецца ў гісторыі беларускага мастацтва, сэрцах яго вучняў, калег па працы, родных і блізкіх, памяці ўсяго беларускага народа.

ЛУКАШЭНКА А.Р., СІДОРСКІ С.С., РУБІНАЎ А.М., АНДРЭЙЧАНКА У.П., МАКЕЙ У.У., ПАТУПЧЫК У.М., ЛАТУШКА П.П., ЛАДУЦЬКА М.А., МЯСНІКОВІЧ М.У., НОВІКАЎ А.М., БАРАЗНА М.Р., ВАШЧАНКА Г.Х., ГУМІЛЕЎСКІ Л.М., ПАПЛАЎСКІ Г.Г., СТАЛЬМАШОНАК У.І.,

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю народнага мастака СССР, Героя Беларусі САВІЦКАГА Міхаіла Андрэевіча і выказвае спачуванне яго родным і блізкім.

Падрабязнасці

«АДВУЧЫЎ» КРАСЦІ

Інфармацыя пра трагедыю ў в. Дамашэвічы Баранавіцкага раёна ўжо была ў нашай газеце, а цяпер ёсць магчымасць паведаміць пра яе больш падрабязна.

22-гадовы жыхар вёскі вярнуўся з камандзіроўкі і ўбачыў, што нехта яго абакраў. Хтосьці з аднавяскоўцаў сказаў яму, што прыкмеціў украдзенае ў двух братоў. Хлопец узяў стрэльбу і пайшоў разбірацца. Ён ішоў па вёсцы, але ніхто не мог падумаць, што ўсё закончыцца такой трагедыяй, хоць хлопец і казаў, што збіраецца зладзеяў адвучыць красці. Пакрыўджаны прыйшоў у хату, у якой знаходзіліся гаспадар з жонкай і два браты з маці. Падчас высвятлення адносінаў «выхавальнік» расстраляў мужчын. Выжыў адзін з іх, ён — у бальніцы. Ёсць адзін факт, які аб'ядноўвае забойцу і ахвяраў. У час разборкі ўсе яны былі п'яныя і раней ужо былі асуджаны за крадзеж.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Абзац

◢ Такое цёплае надвор'е, як у гэтым лістападзе, бывае, па сведчанні спецыялістаў, прыкладна раз на 10 гадоў. У прыватнасці, у 2000 годзе пачатак лістапада быў такім жа цёплым, як і сёлета. У канцы месяца, кажуць сіноптыкі, ёсць верагоднасць прарыву халодных паветраных мас на тэрыторыю Беларусі, і ападкі ўжо будуць у выглядзе снегу.

◢ Іпадром і забаўляльны цэнтр коштам $165-180 млн плануецца пабудаваць у Беларусі. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску генеральны дырэктар Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі Віктар Міхадзюк. Паводле яго звестак, кошт самога іпадрома складзе $30- 50 млн — у залежнасці ад тэхналогій, якія будуць выкарыстоўвацца. Праект уключае будаўніцтва гатэльнага і рэстараннага комплексаў, казіно, цэнтра адпачынку для дзяцей і спартыўнага комплексу.

◢ У панядзелак гродзенскія памежнікі на кантрольнай памежнай паласе ўбачылі дарожку слядоў чалавека, які перасоўваўся басанож з Беларусі ў Літву. Хутка ад літоўскіх калег прыйшла інфармацыя пра затрыманне грамадзяніна Беларусі без дакументаў. Як высветлілася, беларускія памежнікі добра ведалі мужчыну — яго неаднаразова затрымлівалі на мяжы, ён мае 8 судзімасцяў. Апошнюю — за крадзеж і захаванне наркотыкаў. На волю выйшаў у верасні, а ў кастрычніку парушальніка затрымалі за спробу нелегальна перайсці мяжу. Тады яго толькі папярэдзілі і абавязалі заплаціць штраф. Зараз у дачыненні да парушальніка мяжы літоўскі бок завёў крымінальную справу.

Поўны абзац

◢ З Нямецкага тэхнічнага музея ў Берліне скралі два лакаматывы і вагон. Невядомы мужчына прыйшоў да супрацоўнікаў музея і выдаў сябе за ўладальніка экспанатаў, якія былі на час перададзеныя ўстанове. Наглядальнікі аддалі яму ключы. Ён сагнаў лакаматывы і вагон па пуцях мясцовай чыгункі. Крадзеж выявілі толькі праз некалькі дзён, калі па лакаматывы з'явіўся іх сапраўдны ўладальнік. Прапажу і выкрадальніка шукаюць. Меркаванняў пра тое, хто б гэта мог быць, няма.

**

10
ЛІСТАПАДА
2010 г.
СЕРАДА
№ 42 (15645)
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ГРАФІЦІ СУПРАЦЬ ВІЧ-ІНФЕКЦЫІ

Восем графітчыкаў намалявалі сваё стаўленне да ВІЧ-інфекцыі.

Конкурс графіці на тэму прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі прайшоў на тэрыторыі Мінскага трактарнага завода. Дарожныя знакі «Стоп СНІД», вялікія каляровыя надпісы і абстрактныя малюнкі будуць стаяць цяпер на тэрыторыі МТЗ.

Па словах арганізатараў, гэта нядрэнны спосаб прыцягнуць увагу моладзі завода, а гэта 7 231 чалавек, да праблемы ВІЧ-інфекцыі.

Ідэя арганізацыі такога конкурсу з'явілася ў прадпрыемства падчас супрацоўніцтва з Глабальным фондам ААН па барацьбе са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй, а таксама Міністэрствам аховы здароўя Беларусі. Глабальны фонд выдзеліў спецыяльны гранд па прафілактыцы ВІЧ на працоўным месцы. Згодна з ім 15 прадпрыемстваў цяжкай і лёгкай прамысловасці, а таксама сферы абслугоўвання распрацоўвалі інфармацыйныя праекты па ліквідацыі перадузятага стаўлення і дыскрымінацыі людзей з ВІЧ.

— Вынікі нашай працы па прафілактыцы ВІЧ мы бачым ужо зараз, — расказвае Сяргей Сідаровіч, спецыяліст па працы сярод моладзі бюро інфармацыйнай працы МТЗ. — Пасля правядзення семінараў у форме дыскусій для начальнікаў цэхаў, сцігма (негатыўная асацыяцыя чалавека з чымсьці ганебным, непрэстыжным — **заўв. аўт.**) да людзей з ВІЧ зменшылася з 84,6 працэнта да 31,8 працэнта.

У планах МТЗ пасля конкурсу графіці ў супрацоўніцтве з асацыяцыяй людзей, што жывуць з ВІЧ, правесці дзве выставы, а таксама канцэрты ў падтрымку барацьбы са СНІДам.

Нагадаем, што па звестках медыкаў на 1 кастрычніка гэтага года ў краіне зарэгістравана 11 476 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. З іх жанчын — 38 % (4370 чал.), мужчын — 62 % (7106 чел.). Пераважная большасць інфіцыяваных — гэта людзі ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў (іх 7 453 чалавекі).

Настасся ЗАНЬКО.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Клуб юнкараў

ДЗВЕРЫ СТАЛОЎКІ САСКОКВАЮЦЬ З ЗАВЕСАЎ

Як толькі гучыць званок з урока, дзверы сталоўкі проста сасокваюць з завесаў. Гэта чарговая згаладалая паралель акіянскай хваляй уліваецца ў памяшканне і запаўняе яго да краёў. За кожным класам замацоўваюцца пэўныя сталы, паўсюды мітусяцца дзеці, спрабуючы заняць сваё законнае месца. Кухары і дзяжурныя марна спрабуюць іх супакоіць.

Многія мае аднакласнікі з задавальненнем ядуць у нашай сталоўцы, бо асартымент страў, якія нам прапануюць, вельмі вялікі. Так, сярод супоў — бульбяныя з крупамі ці бабовымі, малочныя, баршчы. На другую страву — кашы, пюрэ з падліўкай з кавалкамі свініны ці ялавічыны, сасіскі, заўсёды ёсць салаты з агародніны. А можна яшчэ ўзгадаць пра маннікі, крупеннікі, пудынгі, запяканкі. Ці гэтага мала?

На мой погляд, і асартымент разнастайны, і часу хапае на тое, каб паесці. І 22 тысячы беларускіх рублёў на тыдзень за абеды — гэта невялікія грошы ў наш час.

Дзеці насамрэч забяспечаны гарачым харчаваннем. І дарэмна школе прыпісваюць віну ў прыросце захворванняў страўніка ў дзяцей з-за няякаснага харчавання. Пры жаданні любы вучань зможа тут набыць нармальнае харчаванне. Абы хацеў. Прынамсі, з маіх аднакласнікаў 90 працэнтаў абедае менавіта ў школе.

Сустракаюцца, праўда, і такія вучні, каму цалкам ці часткова не падабаюцца школьныя абеды, але іх усё адно прымушаюць есці, такі загад зверху: «Усе без выключэння дзеці павінны харчавацца ў школьнай сталоўцы!». Кропка!

Адзіны спосаб адмовіцца — напісаць заяву. Я пацікавілася ў аднаго чалавека ў класе, які не паленаваўся так зрабіць, у чым прычына яго ўчынку. «Грошай шкада, — адказаў ён. — 22 000 на тыдзень — гэта занадта! Ды і не хачу я есці». Як бачыце, пэўных каментароў, што яму ежа не падабаецца — няма, хлопец хадзіць у сталоўку проста лянуецца.

Але для такіх у школе ёсць яшчэ адна прапанова — школьны буфет, дзе можна перахапіць чаго-небудзь смачненькага. Тут прадаюцца самыя свежыя і самыя смачныя (вось гэтага дакладна не адняць) булачкі, якія, здаецца, самі гатовыя скокнуць у рот. Салаты ўсіх відаў, сокі, вафлі і нават жэле. Так, выбар у нас шырокі. Хоць хацелася б каб, былі тут і стравы для тых дзяўчат, якія сочаць за сваёй фігурай. Больш бы садавіны, гародніны, страў, прыгатаваных на пары.

Анастасія КАПІЧЫНА.

ЛЯНОК-КУЖАЛЁК, або Паўночны шоўк яшчэ сябе пакажа

Летам мы, гурткоўцы «Школы мадэльера» рэспубліканскага Палаца дзяцей і моладзі, бралі ўдзел у міжнародным конкурсе дзіцячай і юнацкай моды, які праходзіў у Вільнюсе — вазілі на паказ новую калекцыю з ільняных тканін. Шчыра кажучы, па дарозе ў Літву яшчэ добра не ўсведамлялі, якая высакародная місія на нас ускладзена, і толькі ў час выступлення на подыуме ўбачылі, з якой непадробнай цікавасцю члены міжнароднага журы і нашы равеснікі, удзельнікі конкурсу з Прыбалтыкі, Расіі, Украіны, Румыніі, разглядалі нашы авангардныя, але з захаваннем нацыянальнай адметнасці, сукенкі і касцюмы.

Члены журы здзіўляліся — няўжо льняныя вырабы могуць выглядаць так прыгожа, сучасна і разнастайна? Мы ж імкнуліся пераканаць прысутных у тым, што з ільняных тканін выдатна выглядае не толькі адзенне для адпачынку, але і элегантная дзелавая вопратка. Як-ніяк шэраг сусветных мадэльераў даўно выкарыстоўвае лён у сваіх калекцыях!

Што да Беларусі, то нездарма яе называюць «краінай паўночнага шоўку». У легендах і паданнях лён называецца «залатым руном», але для нас гэта культура зусім не міфалагічная, а цалкам зямная, адзін з гарантаў дабрабыту, што пацвярджаецца выявай апошняй на нашым гербе. На адваротным шляху з Вільнюса мы з захапленнем абмяркоўвалі, якой будзе наступная льняная калекцыя. Шкадавалі хіба аб адным — у айчынных фірменных магазінах няма той разнастайнасці льняных тканінаў, якую хацелася б бачыць не толькі прадстаўнікам высокай моды, але і мадэльерам-пачаткоўцам.

Сёння ў свеце назіраецца сапраўдны бум на «зялёную экалогію», цяперашні час аб'яўлены векам натуральных валокнаў. У шэрагу замежных краін ужо ёсць, дарэчы, цікавыя апрацоўкі льну — з метаніццю, бліскучым пакрыццём. У такіх тканін даволі багатая каларыстыка. Можа, аналагічныя вынаходніцтвы існуюць і ў нашай прамысловасці, але ўбачыць на прылаўках лён з эластанам ці шоўкам амаль немагчыма.

Спадзяюся, нашы надзеі спраўдзяцца, бо развіццю льняной галіны сёння ўдзяляецца значна больш увагі. Калі на прадпрыемствах, якія выпускаюць льняную прадукцыю, з'явіцца новае абсталяванне, новыя тэхналогіі, а менавіта такая задача ставіцца кіраўніком дзяржавы перад льняной галіной, значыць, і ў гандлі з'явяцца льняныя тканіны новага пакалення: мяккія, якія менш камечацца, не даюць усадкі, маюць насычаныя афарбоўкі. Лічу, што мы — будучыя мадэльеры, швачкі, тэхнолагі, дызайнеры можам і павінны разважаць на гэтую тэму.

У «Школе мадэльера» я займаюся пяты год. Разам са мной — іншыя 15-17-гадовыя дзяўчаты. Захапленнем мы абавязаны Наталлі Базанавай — вопытнаму педагогу, майстру сваёй справы, якая не проста навучыла нас шыць, але і дапамагла зразумець, што пашыў і мадэляванне адзення — непаўторны творчы працэс. «Дваццаць гадоў выкладаю ў «Школе мадэльера» і не перастаю здзіўляцца, як мае выхаванкі, рыхтуючы новыя калекцыі, робяць невялічкія адкрыцці, — сказала неяк Наталля Георгіеўна. — Дзякуючы такім назіранням, і сама пачынаю лепей вызначаць новыя напрамкі і тэндэнцыі ў моладзевай модзе». Прыемна такое чуць, хоць зразумела, што гэтыя словы — адзін з педагагічных прыёмаў, спроба натхніць нас на новую справу, надаць упэўненасці ў працэсе падрыхтоўкі мадэляў.

Мы разам робім эскізы калекцый, прыдумляем іх назвы — «Соль», «Адлюстраванне душы», «Спатканне з мінулым» (апошняя, дарэчы, заняла першае месца на конкурсе «Пралеска» і другое ў конкурсе «Арганічная архітэктура»). Ільняная калекцыя «Спатканне з мінулым» паспяхова дэманстравалася на подыумах Мінска на свяце горада, дні абароны дзяцей. Мадэлі гэтай калекцыі, як мне здаецца, яскрава сведчаць, што ўмела апрацаваныя льняныя тканіны добра трымаюць форму, дазваляюць ствараць любыя аплікацыі. Словам, будучыня — за льном!

Вольга ЗАХАРАВА, навучэнка гімназіі № 30 г. Мінска.

Разбярэмся!

Ратуйцеся! РАЗВОДЫ сярод нас...

2009 год — 78800 шлюбаў, 35056 разводаў. Сем месяцаў 2010 года — 39661 шлюб, 19756 разводаў. Такія лічбы зафіксаваны па краіне Міністэрствам статыстыкі і аналізу. Дванаццаць год таму развяліся і мае бацькі. Цяпер мне дваццаць, і я хачу зразумець, што перашкаджае людзям жыць разам шчасліва. Чаму тыя, хто абяцае кахаць адзін аднаго, разводзяцца? Чаму інстытут шлюбу сёння такі слабы? Як можна зрабіць сем'і больш моцнымі?

Асабістае

Я вельмі яскрава памятаю некаторыя моманты майго дзяцінства. Лепш за ўсё запомніліся сваркі паміж бацькамі... У такія імгненні я не ведаў, куды схавацца. Хацелася знікнуць, каб не чуць іх папрокі адно аднаму. А куды можна схавацца ў кватэры?.. Таму даводзілася працягваць свае гульні з цацкамі і быццам нічога не разумець, ні на што не звяртаць увагі...

А потым бацькі развяліся. Толькі я амаль не заўважыў гэтага: як не займаўся мною бацька раней, так і не стаў займацца пасля. Здаецца, што я заўсёды жыў толькі з маці...

І ўвесь час, пакуль я сталеў, у маёй галаве гадавалася думка, нават і не думка — абяцанне самому сабе, што мая сям'я будзе моцнай, што мае дзеці вырастуць у поўнай сям'і.

Ведаеце, маё канчатковае стаўленне да шлюбу сфарміраваў адзін літаратурны твор. У беларускай пісьменніцы Элізы Ажэшка ёсць аповесць «Хам». Я прачытаў яе, калі мне было 17 гадоў. Мяне ўразілі паводзіны галоўнага героя: ён дараваў сваёй жонцы ўсё — здраду, непавагу, нават спробу атруціць. А разважэў ён вельмі проста пры гэтым: «Я абяцаў, калі мы браліся шлюбам, што буду яе заўсёды кахаць, клапаціцца пра яе ў любых абставінах». Ён і не разумеў, як гэта можна не дараваць. Праз гэты твор я вырашыў, што сваю сям'ю буду будаваць згодна з такімі вось простымі разважаннямі.

Ці вось апавяданне Міхася Зарэцкага «Бель». Галоўны герой Даніла разумее, што яму надакучыла жонка, ён яе больш не кахае, але што з гэтым рабіць, не ведае. Тут на дапамогу прыходзіць сябар, які спакойна (!) кажа, што можна ж развесціся і быць вольным. Вось адкуль праблема з'явілася — СПАКОЙ пры слове «РАЗВОД»... І «нармальнасць», «звычайнасць» скасавання шлюбу ўзрастала на працягу мінулага стагоддзя, ды працягвае ўзрастаць у нашыя часы.

Але гэта ўсё кніжныя прыклады. Давайце паглядзім на дзве сучасныя сям'і.

Гісторыя першая

Яны ўжо 53 гады разам. Галіна Карпаўна і Анатоль Максімавіч Галуза і сёння заўсёды побач. Яны пабраліся шлюбам яшчэ ў савецкі час, але ж іх шлюб быў моцны тады і зараз застаецца такім. А таму для сучаснай моладзі будзе цікава і карысна ведаць, як яны захоўваюць сям'ю ўжо столькі гадоў.

Шлюбная пара расказала мне пра тое, як пачыналася іх сумеснае жыццё. «Вядома, цяжка. Нічога ў нас не было: ні лыжкі, ні ложка. Была толькі адна маленькая валізка. Першы час нават спалі на падлозе», — успамінае Галіна Карпаўна. Жылі яны тады ў Данбасе: муж быў шахцёрам. «А часам і зарплаты не давалі. Напрыклад, абвал у шахце — вось пакуль яго не разбяруць, сядзіш амаль без працы, а значыць і грошай не атрымліваеш. Тады ўжо даводзілася думаць пра тое, каб хапіла хаця б на харчаванне — і нічога, усё роўна добра жылі», — расказвае Анатоль Максімавіч. А потым з'явіўся сын. Дык і гэта не спужала: сядзелі з ім па чарзе. Нават у кіно хадзілі разам з дзіцем.

Потым сям'я Галузаў вярнулася ў Беларусь. У 1996 годзе сужэнцы абвянчаліся ў Чырвоным касцёле. І ўвесь час разам, адзін аднаму дапамагаюць. Галіна Карпаўна расказала мне адзін выпадак, які адбыўся яшчэ на вяселлі: «За сталом я сказала мужу: «Пі колькі хочаш, толькі няшмат». Усе смяяліся. Але вось так мы і пражылі — саступаючы адзін аднаму».

Я пацікавіўся, якую параду можна даць сучаснай моладзі, каб яны стваралі такія ж моцныя сем'і. «Зараз маладыя хочуць, каб пасля вяселля ў іх ужо адразу ўсё было: і кватэра, і машына... Але гэта немагчыма. Моладзь баіцца цяжкасцяў, — тлумачаць шчаслівыя старыя. — А галоўнае — мець цярпенне і павагу адно да аднаго. Трэба ўмець саступаць. І нельга баяцца працы, побыту — калі дружна, дык можна ўсё зрабіць і з усім справіцца».

Гісторыя другая

Яны ажаніліся год таму, а думкі пра развод ужо з'явіліся ў іх галовах, хоць зусім нядаўна ў пары нарадзілася дачка. Такую сітуацыю мне акрэсліла бабуліна суседка, сын якой сабраўся ўжо разводзіцца. А прычына проста смешная: жонка ніяк не можа адвыкнуць ад жыцця разам з маці і часам уцякае ад мужа дадому. На жаль, пагутарыць ні з адным з маладых я не змог: мяне папрасілі гэтага не рабіць, бо тыя перажываюць вельмі і ўсё роўна нічога не скажуць. Але са слоў маці хлопца, жыццё іх сапраўды стала невыносным: жонка то збягае, то вяртаецца, а мужу гэта ўсё надакучыла і ён паглыбіўся ў працу ды больш ні на што не звяртае ўвагі. Трошкі лепш стала пасля нараджэння дзяўчынкі. Дзіця пачало аб'ядноўваць сям'ю, якая ледзь не развалілася.

Вось яскравы прыклад таго, што сучасныя дзяўчаты і хлопцы не ўмеюць ісці на кампраміс: замест таго, каб пагутарыць і вырашыць, што рабіць далей, яны крыўдзяцца адзін на аднаго.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

АЛЬТЭРНАТЫВА ШКОЛЕ, альбо Чаму некаторыя дзеці вучацца дома

— Ваша дзіця хворае?
— Не.
— Яно — геній?
— Не.
— Тады ж чаму вы хочаце, каб яно вучылася дома?

Звычайна такая размова адбываецца ва ўсіх тых бацькоў, якія прыходзяць у школы пісаць заяву аб навучанні іх дзяцей па індывідуальным плане (не блытаць з навучаннем дома, калі дзіця па стане здароўя не можа наведваць школу). Аргументаў, чаму вучобу дома такія сем'і лічаць лепшай за школьную, прыхільнікі хатняга навучання могуць назваць шмат.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У Марыны Вайцэховіч ужо двое дзетак на хатнім навучанні, але яна мяркуе, што і малодшых (трохгадовага Яна і дзіця, якое вось-вось павінна з'явіцца на свет), яна таксама не будзе аддаваць у школу. Чаму?

Каб больш паспяваць і больш ведаць

Летась на хатняе навучанне перайшла Марыніна дачка. Сёння Адэльцы 12 гадоў. І яна самастойна праходзіць праграму сёмага класа.

— Дачка не засвойвала па некаторых прадметах школьную праграму. Мы былі вымушаныя праходзіць усё дома. Акрамя таго, Адэля моцна стамлялася ў школе. Ужо ў пятым класе яна фактычна вучылася дома, бо часта мы сядзелі на медыцынскіх даведках. Вось і пачалі шукаць іншую форму навучання, даведаліся, што ёсць індывідуальны план, і ўжо другі год вучымся такім чынам, — распавядае Марына. — За гэтыя два гады значна палепшыліся адзнакі па ўсіх прадметах, ніжэй васьмёркі ў нас няма. У Адэлі якраз змянілася класная кіраўніца, яна нас паўгода агітавала, каб мы вярталіся ў школу, а пасля сказала: «Хай і іншыя дзеці пераходзілі б на індывідуальны план, але толькі тыя, хто так добра займаецца». І гэта яна не ведала пра тое, як дзяўчынцы было складана вучыцца, якія былі эмацыйныя праблемы. Дачка перастала да ночы сядзець над хатнімі заданнямі. Калі дзіця займаецца самастойна дома, прыблізна ў два разы менш часу патрабуецца для засваення праграмы! У дачкі вызвалілася шмат часу, у які яна можа займацца тым, што ёй цікава. Дзяўчынка... пачала чытаць кніжкі. Дзіцяці, якое ходзіць у школу, проста няма калі чытаць кнігі, і гэта ўжо пачынаючы з сярэдніх класаў. Толькі ў вучняў малодшых класаў ёсць час на нейкія дадатковыя заняткі. Тыя дзеці, якія ў пачатковай школе займаліся і музыкай, і гімнастыкай, у сярэдніх класах мусяць выбіраць, які занятак пакінуць, а ў старэйшых наогул ад усяго адмовіцца і толькі думаць, як здаць іспыты, — заўважае Марына.

І Марына мае рацыю.

Прынамсі, скаргі на тое, што ў старэйшых школьнікаў сапраўды няма часу на нейкія заняткі па інтарэсах, я даволі часта чую як ад сваіх знаёмых, у якіх ёсць дзеці, так і ад саміх школьнікаў. А некаторыя рэчы здаюцца дзіўнымі. Чаму ў нас так працвітаюць усялякія платныя курсы, дзе выпускнікоў рыхтуюць да паступлення? І чаму такая вялікая колькасць дзяцей займаецца з рэпетытарамі? А што ж яны тады вучаць у школе? Варта ўзгадаць сёлетнія цэнтралізаванае тэставанне, на якім высветлілася, што большасць дзяцей не ведае ні фізікі, ні матэматыкі. Ці дзеці ў гэтым вінаватыя? Увесь час толькі і чуеш, што дзеці перагружаныя. Але чым?

І навошта дзіцяці сядзець на занятках, напрыклад, па той жа матэматыцы, калі пасля школы ён яе вымушаны вывучаць самастойна (альбо з дапамогай рэпетытара)? Ды што там, нават малодшым школьнікам ужо цяпер бацькі вымушаны займаць рэпетытараў. Нядаўна мая знаёмая (дарэчы, сама настаўніца) скардзілася, што шукае рэпетытара па англійскай мове для сваёй дачкі, якая вучыцца (увага!)... у другім класе. І праблема тут зусім не ў дзяўчынцы, малая якраз вельмі стараецца — праблема ў школьнай праграме.

А можа, сапраўды, бацькі, якія вырашаюць, што лепш, каб іх дзіця здабывала веды па-за школай, маюць рацыю? Дзіця не будзе марнаваць час на непатрэбныя і нецікавыя яму школьныя мерапрыемствы, не будзе збіраць паперкі ля школы, не будзе лішні раз слухаць тое, што і так добра засвоіла. Зможа тыя прадметы, якія лягчэй даюцца, праходзіць хутчэй, і наадварот, больш часу аддаваць найбольш складаным урокам. Але хіба дзіця можа вучыцца без настаўнікаў?

Прыхільнікі хатняга навучання сцвярджаюць: дзеці на гэта здольныя, а яшчэ заняткі па індывідуальным плане выпрацоўваюць у дзіцяці асаблівыя якасці, яно становіцца самастойным, пачынае вучыцца з большым інтарэсам. Бо яму не трэба кожны дзень баяцца (што яго раптам вызавуць да дошкі, што яго абвінавацяць у няведанні, што ўлепяць дрэнную адзнаку, што выкажуць бацькам меркаванні пра яго здольнасці), а яшчэ дзіця атрымлівае час і магчымасці займацца і па дадатковых падручніках.

— Калі мы прыйшлі з заявай аб пераходзе на індывідуальны план, настаўнікі пыталіся: «А як вы будзеце ўсё дзіцяці тлумачыць? Вы ж ідзяце не ў пачатковую школу, фізікі і хіміі ў дзяўчынкі раней не было», — расказвае Марына. — Але ў нас асаблівая сітуацыя: я — матэматык, дзядуля — фізік. Як паказала практыка, дзіця можа самастойна засвойваць многія прадметы проста па падручніках. Адэльцы цяжка даюцца профільныя прадметы, таму я сяджу побач і правяраю, як яна праходзіць матэматыку. Але англійскую мову, хімію, фізіку яна ў стане засвоіць сама. Не кажу ўжо пра біялогію, якая ў яе любімая, геаграфію, гісторыю. Мая роля — толькі правяраць хатнія заданні, якія мы самі вызначаем. У нас ёсць заданне на чвэрць, і далей мы самі размяркоўваем час, калі і што вывучаць. Раз на чвэрць дзіця павінна прыйсці ў школу і здаць заданне па прадмеце, форму іспытаў выбіраюць настаўнікі. Напрыклад, па матэматыцы гэта можа быць кантрольная, па гісторыі — тэсты. Па законе настаўнікі павінны ў выпадку патрэбы аказваць кансультацыі такім дзецям. Таксама мы маем права і на наведванне ўрокаў у школе.

Наша асабістая думка, што адукацыя ў «надомнікаў» атрымліваецца значна лепшай, і гэта пацвярджаецца сітуацыяй у Злучаных Штатах, Канадзе, дзе дзяцей, якія атрымліваюць адукацыю самастойна, шмат. Там універсітэты, каледжы з задавальненнем прымаюць надомнікаў, бо бачаць, што ў іх ведаў не менш, чым у тых, хто вучыўся ў школе, але надомнікі не прывыклі думаць шаблонна, яны самі шукаюць інфармацыю, прычым па розных падручніках. Глядзіце: школа дае адну праграму, а я пайшла ў кнігарню па сшыткі па беларускай мове для свайго сына-першакласніка Вацлава (на першае верасня яму было 7 гадоў і два месяцы), які таксама сёлета пачаў вучыцца па індывідуальным плане. І ў кнігарні я бачу пяць праграм, і магу выбраць, па якой з іх мне займацца з сынам, ад нас патрабуецца толькі прыйсці і паказаць веды. Калі старэйшая дачка ў асноўным засвойвае прадметы самастойна, з малодшым займаюся я. Але на ўсе ўрокі з першакласнікам я трачу на дзень максімум адну гадзіну: за гэты час мы паспяваем зрабіць матэматыку, дзіця піша прапісы, я сяджу слухаю, як сын чытае, і ў дадатак мы займаемся англійскай мовай, якой няма ў першым класе. Прычым часам дзіця просіць у мяне зрабіць не адзін, а два ўрокі запар, таму што яму вельмі цікава займацца. Слоўнікавы запас па англійскай мове папаўняем увесь час. Проста ідзём па доме і засвойваем назвы прадметаў, якія ён бачыць вакол, колеры... Адна з абавязковых умоў для сем'яў, у якіх дзеці вучацца па індывідуальным плане, на нашу думку, знаходжанне аднаго з бацькоў дома (цэлы дзень ці хаця б паўдня). Мне больш зручна, я з аднаго дэкрэтнага адпачынку пераходжу ў другі. Акрамя таго, я магу працаваць дома.

Каб дзіця расло здаровым

— Вы казалі, што Адэльцы эмацыйна цяжка было вучыцца ў школе. А цяпер нешта змянілася?

— Яна супакоілася. Нашмат спакайней абстаноўка дома і нашмат лягчэй займацца. Глядзіце: нават у пачатковай школе, без наведвання нейкай прадоўжанкі, дзеці павінны праводзіць 4-7 гадзін практычна седзячы ў памяшканні, ім нікуды не выйсці. Ім прыходзіцца займацца нават тады, калі гэтага не хочацца. Напрыклад, калі дзіця сябе дрэнна адчувае, у яго баліць галава, але няма тэмпературы і даведку ў паліклініцы не возьмеш. А дома дзіцяці не трэба рабіць над сабой ніякіх высілкаў. Яно можа спакойна адпачыць і ўзяцца за заняткі ў больш спрыяльны час. Акрамя таго, на дзіця не навальваюцца праблемы, якія не звязаныя з засваеннем урокаў. У пэўным узросце дзеці падобныя на зграю ваўчанят, яны вымушаны падладжвацца пад настаўніка, пад калектыў. Каб стаць любімчыкам у настаўніка, некаторыя спрабуюць падлізвацца. Яны хітруюць. Так, калі дзіцяці сёння паставілі аднаку, яно выпрацоўвае сваю тактыку, кшталту «я магу два ўрокі быць спакойным, бо мяне не будуць выклікаць». А колькі розных праблем бывае звязана з асабістым стаўленнем настаўніка да дзяцей ці аднагодкаў. Дзеці змагаюцца за сваё месца, хтосьці стараецца быць кіраўніком у групе, а кагосьці прыгнятаюць.

— Напэўна, пры навучанні дома вам не трэба баяцца, што дзіця ў школе падхопіць грып ці яшчэ нейкі вірус?

— Мы прапісаны ў Мінску, а жывём на лецішчы ў Ракаве. Жыць у горадзе нам было цяжка, два маіх сыны — алергікі, але, калі мы перабраліся жыць на вёску, забыліся на гэту хваробу. Побач з лецішчам — возера, ручай, лес хваёвы...

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ВЫПРАЎЛЯЦЦА... ПА-БЕЛАРУСКУ

У віцебскай выхаваўчай калоніі №1 для юнакоў, якія тут знаходзяцца, правялі незвычайны, калі не сказаць смелы, эксперымент. Выкладчыкі вячэрняй агульнаадукацыйнай сярэдняй школы № 26 пастараліся паўплываць на выхаванцаў нестандартным спосабам: праз усведамленне таго, што яны — беларусы, прадстаўнікі цярплівага, працавітага, самадастатковага народа. Выхаванцы прызналіся, што менавіта названых вышэй якасцяў ім і не хапае, як і многіх іншых, што характарызуюць беларусаў. Можа яшчэ і менавіта таму яны апынуліся за дротам.

...У кабінеце беларускай мовы і літаратуры выхаванцы сядзяць цішэй вады. На ўсіх занятках, дарэчы, заўсёды ў школе цішыня. Бо, калі што, бацькоў, безумоўна, выклікаць не будуць. Усё-такі школа пры калоніі. Адразу ўразіла, што хлопцы — вучні 10 і 11 класаў — апранутыя ў традыцыйныя беларускія касцюмы. На стале нацыянальныя вырабы ткацтва. Выкладчыкі пастараліся.

— Якімі якасцямі валодаюць беларусы? — пытаецца ў юнакоў **выкладчыца беларускай мовы і літаратуры Вольга Мікалаеўна СУШАНАВА**. У адказ чуем: стрыманасць, працавітасць, цярплівасць, шчодрасць, гасціннасць, памяркоўнасць.

— А якімі якасцямі валодаюць вашы бацькі?

У адказ былі пералічаны амаль што ўсе з узгаданых.

— А якіх з гэтых якасцяў вам не хапае? — Цярплівасці, — прызнаецца адзін юнак. — Працавітасці, — сказаў ціха другі.

— Ну, дык калі ўжо дакладна ведаеце свае недахопы, трэба выпраўляцца, працаваць над сабой! — кажа выкладчыца.

Падчас шчырай гутаркі мяне чамусьці асабліва ўразіў хлопец з Мінскай вобласці, які вельмі цікава і падрабязна расказваў пра сваю родную вёску, яе гісторыю. Паводле ягоных слоў, вёскі Вялікае Стахава і Малое Стахава з'явіліся дзякуючы працавітым братам Стахавым. Яны жылі сумленна, добра працавалі, з усімі ладзілі...

Пачуў я і расказ ад яшчэ аднаго хлопца пра возера Свіцязь, глыбіню якога мясцовы пан так і не вымераў — як ні стараўся. Пра тое, што грыбоў і ягад у лесе ля возера шмат. І як хочацца расказчыку пасля вызвалення вярнуцца ў родныя мясціны.

І верш «Мой родны кут» Коласа, і словы Скарыны прагучалі... Хлопцы добра падрыхтаваліся. Калі б не месца, дзе праходзіла акцыя, падумаў бы, што недзе ва ўзорнай гімназіі знаходжуся.

Адзін з выхаванцаў выканаў шлягер пра Віцебск. Сам ён зусім з іншага рэгіёну. Старажытны горад над Заходняй Дзвіной, канешне, запомніць на ўсё жыццё... Мо і не толькі таму, што адбываў тут пакаранне.

Гучалі песні пра Беларусь, дэманстраваліся слайды з краявідамі куточкаў нашай прыгожай краіны, дзе жывуць добрыя людзі.

А ці насамрэч дадуць нешта такія заняткі падлеткам, якія парушылі закон? — цікаўлюся ў **начальніка калоніі, падпалкоўніка ўнутранай службы Аляксандра ГАРАЛЁВА**.

— Мы шчыра стараемся шукаць усе магчымыя падыходы ў выхаваўчай рабоце, — расказвае падпалкоўнік. — Большасць з выхаванцаў, упэўнены, не вернуцца да нас зноў і не трапяць у дарослыя калоніі. Рэцыдывістаў мала: менш за тры працэнты. Выхаваць з гэтых падлеткаў добрасумленных грамадзян — наша задача. Усяго мы даем шанц выправіцца больш за 200 хлопцам ва ўзросце ад 14 да 21 года. Імкнёмся «падабраць ключык» да душы кожнага з іх. Вось сёння мы ж загадзя не адбіралі ўдзельнікаў для сустрэчы. Запыталі, хто хоча расказаць пра родныя мясціны, пра міфы і легенды роднай зямлі. Адразу знайшліся ахвотнікі...

Пры калоніі дзейнічае ПТВ, дзе рыхтуюць станочнікаў, майстроў па рабоце з бяростай, швачак... Апошнія потым могуць, напрыклад, знайсці працу ў атэлье. «Каланістам» плацяць — пералічваюць грошы на іх рахункі, з якіх тыя могуць разлічыцца за пакупкі ў буфеце пры калоніі.

Па розных прычынах трапілі ў калонію цяперашнія выхаванцы. Дрэнныя кампаніі, праблемы ў адносінах бацькоў, адпаведна — прабелы ў выхаванні. Галоўнае, каб пасля знаходжання ў калоніі не пажадалі зноў выйсці на вуліцу, каб выпіць у кампаніі, а потым увязацца ў бойку, нешта скрасці... Не ўтойваюць у калоніі, што ёсць і такія выхаванцы, над перавыхаваннем якіх як ні працуй, нічога не зменіш. Але ёсць выпадкі, калі, здавалася б, нават вельмі жорсткія і непаслухмяныя «раптам» мяняліся. На тэрыторыі калоніі ёсць праваслаўны храм. І святар кожны дзень працуе з праблемнымі юнакамі.

У калоніі вырашылі працягнуць эксперымент. І надалей будуць перавыхоўваць беларускім словам, вершам. Лячыць душы па-беларуску.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Альтэрнатыва школе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. ЧЗ.)

— А ці прыходзіцца вам самім прымушаць дзяцей займацца?

— Дзіця ў сярэдняй школе на хатнія заданні траціць 2-3 гадзіны, а ў нас столькі часу ідзе на ўсю адукацыю! Але мы самі выбіраем, колькі нам займацца. Напрыклад, сёння добрае надвор'е, мы сходзім пагуляем, а заўтра дожджык — і мы пазаймаемся ўвесь дзень. У нас няма тэлевізара, гэта знарок зроблена, мы вырашылі, што гэта марнаванне часу, калі дзіця цэлымі днямі не можа фізічна, як ад наркотыка, адарвацца ад дзіцячых каналаў, ці нават пазнавальных, як «дыскавэры», ці «энімал планет». І заняткі за камп'ютарам у нас нармаваныя.

— Але, напэўна, у бацькоў, якія вырашаюць, што іх дзеці павінны займацца па індывідуальным плане, усё ж павінна быць настаўніцкая адукацыя?

— Неабавязкова. Мая педагагічная адукацыя — гэта 12 гадоў маёй дачкі, у нас трое дзяцей, і кожнае дзіця непаўторнае, я бачу, што кожнаму дзіцяці я павінна па-іншаму ўсё выкладаць. Я чытаю літаратуру, штосьці шукаю сама, проста спрабую знайсці розныя падыходы. Так, дачка пайшла ў школу ў шэсць гадоў, а другое дзіця ў такім ўзросце было эмацыянальна негатоваде да заняткаў, сын бы не змог столькі часу сядзець за партай. Акрамя таго, у шэсць ён не чытаў зусім, нават некаторыя літары не ведаў і не хацеў нічога паўтараць. Затое ў шэсць з паловай яму стала цікава, ён пачаў чытаць, спачатку патроху, па некалькі радочкаў з казак, а цяпер сын чытае на ўзроўні вучня, які заканчвае першы клас. З матэматыкай увогуле ён нас уразіў. Бо займаўся ёй не з мамай, а праз камп'ютарную праграму. Яму настолькі было цікава, што ён ужо пачаў вучыць табліцу множання. І гэта без усялякага прымусу.

Каб сачыць за выхаваннем

— Але ж дзіцяці патрэбны і зносіны з аднагодкамі...

— Гэта вельмі проста вырашаецца. Дзеці, што займаюцца дома, маюць больш часу на тое, каб наведваць розныя гурткі. У той час як многія звычайныя школьнікі вымушаны адмаўляцца ад гэтага, бо ім трэба пасля школы сядзець над хатнімі заданнямі. Мы можам наведваць факультатывы ў школах менавіта па тых прадметах, якія нам найбольш цікавыя і дзе займаюцца дзеці з такімі ж захапленнямі. А праблемы з сябрамі ў дачкі пачаліся таму, што яна пачала шмат чытаць, што равеснікі часам не разумеюць... Мы вернікі, ходзім у касцёл, там таксама ёсць магчымасць стасункаў. І навучанне па індывідуальным плане нам яшчэ падыходзіць і па рэлігійных пытаннях. У еўрапейскіх краінах бацькі-хрысціяне, выбіраюць такое навучанне таму, што не хочуць, каб дзецям на занятках тлумачылі, што аборты — гэта нармальна, а геі — такія ж добрыя дзядзькі, як і астатнія. Я думаю, што для многіх бацькоў у Беларусі праблемы з выхаваннем таксама становяцца актуальнымі. Сёння дзеці ў 10-11 гадоў могуць «залазіць» на нейкія сайты, блогі, сустракаюцца нават з парнаграфіяй. Ад усяго гэтага мы б па сваіх рэлігійных перакананнях хацелі б дзіця абараніць і не хацелі б, каб у школе нашым дзецям гаварылі пра аборты ці засцярогу ад цяжарнасці.

Паглядзіце, як апранаюцца дзяўчынкі-старшакласніцы: быццам ідуць на «панэль». Мы ў нашай сям'і не прызнаём сучасную ўседазволенасць. Праз пэўны час мы памянялі дачцэ гардэроб (бо гэта занадта аблягала, тое — занадта міні). Цяпер яна апранаецца элегантна. Зноў жа, у школе дзеці знаходзяцца пад уплывам калектыву, часам пасля заняткаў дзяўчаты могуць пайсці ў кавярню, дзесьці сноўдаць увесь дзень і прыходзіць так позна, што і няма часу ні на якія кніжкі. Лічу, бацькі павінны займацца выхаваннем сваіх дзяцей.

Няхай альтэрнатыва будзе

Хлопчыкаў і дзяўчынак, якія спасцігаюць усе навукі, не выходзячы за сцены ўласнага дома, сёння ў Беларусі ўжо некалькі дзясяткаў. А магло б быць і больш, проста многія бацькі не ведаюць, што існуе такая практыка навучання без школы.

А яна, між іншым, на дадзены момант дазволеная дзяржавай.Так, Марына сказала, што адзіная ўмова — заяву пры пераходзе на навучанне па індывідуальным плане трэба падаваць летам (пасярод навучальнага года яе не прымуць). Калі ж дзіця ўжо вучыцца па індывідуальным плане, прымусіць яго хадзіць у школу могуць, калі ў яго хаця б па адным прадмеце ёсць адзнака «0».

Але, як правіла, бацькі, якія выбіраюць такое навучанне, сапраўды клапоцяцца пра сваіх дзетак і хочуць даць ім як мага больш. Бо некаторыя заўважаюць, што акрамя таго дзясятка школьных прадметаў, у жыцці яшчэ столькі цікавага, што малыя маглі б вывучаць і чым маглі б з задавальненнем займацца. Пра гэта яны актыўна гавораць на форумах, аб'ядноўваюцца ў асобныя групы, дзеляцца вопытам.

Але некаторыя бацькі сутыкаюцца з непаразуменнем чыноўнікаў, не абыходзіцца без пагроз аб тым, што сем'і, у якіх дзеці не наведваюць школу, будуць «ставіць на ўлік», даходзіць і да намёкаў на пазбаўленне бацькоўскіх правоў. У апошні час бацькі дзяцей-надомнікаў пачалі біць трывогу. Яны баяцца, што з прыняццем Кодэкса аб адукацыі самім сачыць за адукацыяй дзяцей будзе немагчыма. У кодэксе аб адукацыі будуць прапісаны падставы, на якіх дзеці могуць навучацца па індывідуальным плане: 1) дзеці, якія па стане здароўя не могуць наведваць школу; 2) адораныя дзеці. Бацькі баяцца, што магчымасці для навучання дома будуць абмежаваныя. У Мінску прыхільнікі навучання па індывідуальнай праграме нават абмяркоўвалі гэтае пытанне на «круглым стале».

Там жа была выказана думка пра тое, што колькасць бацькоў, якім такая форма навучання становіцца сімпатычнай, паступова павялічваецца. Ужо зараз заўважана, што многія мамы і таты не спяшаюцца з яслямі альбо наогул не аддаюць сваіх дзетак у дзіцячыя садкі. Не спяшаюцца яны і выпраўляць дзяцей у школы ў шасцігадовым узросце, «цягнуць» да сямі, а бывае, і да васьмі гадоў. І ў асяродку гэтых бацькоў ёсць прыхільнікі хатняга навучання.

Я не прыхільніца хатняга навучання. Але я не магу не пагадзіцца з заўвагамі, якія выказваюць бацькі — праціўнікі вучобы ў школе. І вельмі многае ў іх думках мне падаецца сімпатычным.

Я таксама хачу, каб мае дзеці вучыліся з задавальненнем і без прымусу, і каб яны маглі выбіраць прадметы, якія ім больш цікавыя.

Акрамя таго, я думаю, што сучасныя бацькі здольныя даваць добрыя веды дзецям хаця б у межах той жа пачатковай школы.

Зараз дзеці, калі падаюцца дакументы на залічэнне ў першы клас, павінны праходзіць гутарку з псіхолагам. Падчас гутаркі высветлілася, што з усіх дзяцей, якія ішлі ў першы клас у абранай намі школе, чытаць не ўмеў толькі адзін. Астатнія і чыталі, і ўмелі лічыць. Як бачыце, ужо зараз многія дзеці вучацца чытаць зусім не ў школе. А яшчэ і лічыць, а яшчэ і размаўляць па-англійску. Прычым з задавальненнем. Вясной я была на адкрытых занятках у школе ранняга развіцця «Знайка», якую дашкольнікі наведваюць раз на тыдзень. Дзеткі, якім толькі па 5-6 гадоў, на англійскай мове па карцінках сказамі расказвалі пра сваю кватэру, дзе які пакой, якая там стаіць мэбля, якога яна колеру і гэтак далей.

Часам малыя дашкольнікі ўражваюць мяне. «Бабуля, калі ты мне не пачытаеш энцыклапедыю, я табе не раскажу пра вывяржэнне вулкана і пра тое, як з'явілася планета Зямля», — гэта заявіў мой сын у чатыры гады. А ў пяць ён разам з аднагрупнікамі захапіўся краінамі свету (дзеці пачалі цягаць у садок свае энцыклапедыі) і распавядаў пра старажытныя цывілізацыі...

Да чаго я гэта? А да таго, што, сапраўды, сучасныя бацькі здольныя шмат якія веды даць дзецям. І да таго, што сучасныя дзеці не такія ўжо і дурныя, і яны не тое што не менш, а нават больш цікаўныя за нас у іх узросце. І што прага ў іх ёсць да ведаў. І здавалася, калі яны столькі ўсяго ведаюць ужо ў «садковым» узросце, то колькі ж будуць ведаць у школьным... Але ці застануцца яны такімі ж цікаўнымі, калі прыйдуць у школу? Асабіста я ў гэтым не ўпэўненая.

Гляджу на школьны расклад першакласнікаў: чытанне, матэматыка, пісьмо, чалавек і свет, выяўленчае мастацтва... і ўсё. Дзіцячыя энцыклапедыі могуць «адпачываць».

Еду ў транспарце і чую, як дзве матулі дзеляцца праблемамі: «... Вось і мая не хоча садзіцца за гэтыя пропісы. Ім у першым класе і адзнак не ставяць, але яна бачыць, як настаўніца іншых хваліць за акуратныя сшыткі, а яе не, і малая крыўдуе». А можа, сапраўды, у тым ліку і з гэтых маленькіх персанальных «крыўдаў» пачынаецца згасанне цікавасці да навучання?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Ратуйцеся! РАЗВОДЫ сярод нас...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. ЧЗ.)

Эксперымент 1.

Калі збіраў інфармацыю для гэтага матэрыялу, мне прыйшла ў галаву ідэя выйсці на вуліцу і паспрабаваць адшукаць каго-небудзь зусім мне незнаёмага, хто ўжо разводзіўся. Я хацеў задаць такому чалавеку «ў лоб» простае пытанне: «А вы не шкадуеце, што развяліся?» Больш за гадзіну я хадзіў па горадзе і шукаў сярод мінакоў «ахвяру». Я амаль страціў надзею. Але тут трапіўся мне мужчына гадоў 30-35. Акуратна апрануты, прывабнага выгляду. Спыніўся, каб закурыць. Я спакойна падышоў і пачаў тлумачыць, хто я такі і што мне трэба. Мужчына лёгка паішоў на кантакт, сказаў, што зараз не жанаты, развёўся. Нават расказаў, чаму так адбылося: «Яна прыгожая, добрая... Толькі вось не гаспадыня... Ну, разумееце... згатаваць там, напрыклад, амаль нічога не можа...» Калі я пачуў, што гэта менавіта той, хто мне патрэбен, я на секунду задумаўся, а потым хутка спытаў: «Вы не шкадуеце, што развяліся?» Я не змагу вам перадаць тое, што ў той момант перадаваў твар незнаёмца... Ён глыбока задумаўся, потым спачатку адкрыў рот, каб штосьці адказаць, але не знайшоў слоў і закрыў яго зноў, а пасля амаль прашаптаў: «Н-нават не ведаю...» Я падзякаваў суразмоўцу, і мы развіталіся...

Эксперымент 2.

Падчас падрыхтоўкі публікацыі мне на вочы трапіла рэклама даведніка «Развод: як зрабіць гэта граматна». Зайшоў на сайт адной з папулярных беларускіх кніжных інтэрнэт-крамаў, каб паглядзець, колькі такі каштуе, бо падумаў, што, можа, ён спатрэбіцца для майго матэрыялу. У пашукавіку напісаў «развод» і націснуў «enter». Тут майму здзіўленню не было межаў. Па-першае, перада мною апынуўся спіс шматлікай мастацкай літаратуры, у назвах якой ёсць слова «развод», а па-другое, акрамя даведніка, які я шукаў, мае вочы ўбачылі вось якія кнігі: «Як выхаваць шчаслівае дзіця ў няпоўнай сям'і. Дзіця развода», «52 лёгкія спосабы атрымаць карысць з разводу», «Развод для чайнікаў» і іншыя. Відавочна, што попыт нараджае прапанову... Дзеля цікаўнасці я ў тым жа пашукавіку напісаў «як захаваць шлюб, сям'ю». І на экране ноўтбука я не знайшоў нічога, што магло б задаволіць мой запыт, акрамя, магчыма, кнігі яшчэ 1987 года «Каханне, шлюб, сям'я». Аднак гэта быў зборнік афарызмаў...

Погляды з боку рэлігіі

І каталіцкая, і праваслаўная царква займаюць вельмі жорсткую адмоўную пазіцыю ў дачыненні разводаў. Касцёл пасля вянчання разводаў зусім не дае, а Царква ў рэдкіх выпадках можа дазволіць скасаванне шлюбу. Але прычына для гэтага павінна быць вельмі сур'ёзнай. Адной з такіх прычын можа быць здрада, бо пры гэтым адзінства мужа і жонкі знішчаецца, а значыць, знішчаецца і шлюб. Аднак развод — гэта не адзінае выйсце ў такой сітуацыі: Царква дае час, каб людзі паспрабавалі дараваць адзін аднаму, і толькі пасля гэтага можа дазволіць скасаванне. Таксама прычынамі могуць быць захворванне на СНІД, алкагалізм, наркаманія, аборт і іншыя.

Аднак мы жывём у свецкай краіне, дзе ўжо даўно вельмі малая частка насельніцтва жыве па царкоўных законах. Але гэта і неабавязкова, як кажа **айцец Пётр Антоні БЯЛЕВІЧ, душпастыр сем'яў Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі**. «Запаветы Божыя ў кожнага з нас у сэрцы: які нармальны чалавек будзе забіваць, красці ці будзе хацець, каб яму здрадзіў той, каго ён кахае? — разважае ксёндз. — Але цяпер гаворыць паўсюль, што развод — гэта нармальна. Таму чалавек хоць і адчувае ў сэрцы, што штосьці не так, усё роўна пачынае змяняць свае думкі і ўчынкі». Айцец Пётр лічыць, што людзі сёння баяцца жыць у сям'і. «Страх вельмі часта перашкаджае: страх, што жонка (ці муж) пакіне, што жонка (ці муж) здраджвае, страх перад самім сабою — а ці змагу я? ці вытрываю?» — сумна пералічвае ён.

«На жаль, шмат хто цяпер шлюб разглядае як нейкі сеанс спажывання чалавека чалавекам. І калі чалавеку-спажыўцу, які «бярэ ад жыцця ўсё», шлюб і сям'я прычыняе хоць нейкі дыскамфорт — ён адразу ж імкнецца пазбавіцца іх, як пазбаўляюцца састарэлай мадэлі мабільнага тэлефона...» — са смуткам канстатуе **Яўген СВІДЭРСКІ, клірык Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора**.

Святары таксама сцвярджаюць, што людзям трэба ўспомніць, што «кахаць — значыць ахвяраваць сабою, аддаць сябе камусьці» і што шлюб, супольнае жыццё — гэта не толькі асалода, але і крыж, які трэба цярпліва несці.

Меркаванні псіхолага

«У разводзе ўсё вельмі імпульсіўна, там няма месца для розуму. Ёсць злосць, ёсць крыўды, ёсць перажыванні, але за гэтым больш няма нічога», — кажа **сямейны псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў і псіхатэрапіі Яўгенія Муравей-Альхавая.**

Да Яўгенія Яўгеньеўны часта прыходзяць тыя, хто хоча развесціся. А яна спрабуе дапамагчы людзям убачыць сітуацыю з іншага боку і, магчыма, перадумаць. «Раней сем'і трымаліся на сузалежнасці, а цяпер і жанчыны, і мужчыны сталі меней залежыць адзін ад аднаго. Праз гэта скарачаецца зона цярпення: у жанчыны з'ўляецца болей прэтэнзій і патрабаванняў да мужчыны. І ў мужчын адбываецца тое самае: яны ведаюць, што іх меней, і не імкнуцца захаваць адносіны — разумеюць, што калі не гэтая, дык іншая з ім будзе ўсё роўна», — расказвае псіхолаг.

А ўвогуле ў сям'і ёсць шмат праблем, якія могуць часам стаць прычынай разводу. Сямейныя крызісы нават бываюць заканамерныя: яны з'яўляюцца праз год сумеснага жыцця (нараджэнне дзіцяці), праз тры-чатыры гады (жонка выходзіць з дэкрэтнага адпачынку), на сёмы год шлюбу (дзіця ідзе ў школу) і далей праз кожныя сем год. Але ёсць і іншыя праблемы, якія напластоўваюцца на «заканамерныя». Гэта могуць быць і новыя дзеці, і якія-небудзь страты (працы, родных і г. д.), і пераезды, і нават рамонт. Праз усё гэта даводзіцца праходзіць кожнай сям'і. Цяжка? А хто абяцаў, што будзе лёгка? «Людзі часта нават не здагадваюцца пра тое, што іх чакае ў сямейным жыцці. І вось калі ілюзія ідэальнага жыцця разбіваецца, абвінавачваць у гэтым пачынаюць адзін аднаго, ідуць разводзіцца», — сцвярджае Яўгенія Яўгеньеўна.

Дарэчы, часцей за ўсё да псіхолага прыходзяць са здрадамі. Але спецыялісты кажа: «З'яўленне палюбоўнікаў — гэта не прычына, а вынік. Спачатку з'яўляюцца нейкія непаразуменні ў сям'і, а потым ужо «разумення» шукаюць дзесьці па-за сям'ёй».

«А верагодным спосабам змагання з разводамі можа быць навучанне дзяцей таму, якія цяжкасці будуць іх чакаць у сямейным жыцці», — лічыць Яўгенія.

ВАМ СЛОВА!

Каб знайсці адказ на пытанне: «Чаму так шмат разводаў сёння, і як можна з імі змагацца?», ідў «ў народ».

Марына, 38 гадоў:

— Жыццё зараз вельмі цяжкае. Матэрыяльна, я маю на ўвазе. А як змагацца, не ведаю.

Максім, 25 гадоў:

— Людзі лічаць сябе занадта вольнымі. Яны не хочуць «абмяжоўваць» сваю свабоду шлюбам: ажаніўшыся, працягваюць жыць зноў толькі для сябе. Трэба вучыцца жыць побач з чалавекам, а не паасобку.

Святлана, 19 гадоў:

— Змянілася стаўленне да сям'і. На жаль, шмат хто ідзе пад вянец, не разумеючы, якую адказнасць ён на сябе бярэ. Парады для захавання сем'яў пакуль не ведаю.

Таццяна, 21 год:

— Зараз вельмі мала часу аддаюць адзін аднаму: амаль не расказваюць сваім каханым аб сваіх праблемах, не пытаюцца парады, а пасля злуюцца, што іх не разумеюць. Калі пачаць прыслухоўвацца адзін да аднаго, дык і разводаў не будзе.

Інна, 44 гады:

— Калі жэняцца, не ўсведамляюць, што гэта павінна быць на ўсё жыццё. Выхоўваць трэба людзей па-іншаму, каб больш адказнымі былі, тады, можа быць, зменіцца штосьці з часам.

P.S.

Вядома, у сваім матэрыяле я не знайшоў універсальных «лекаў» ад разводаў, але зразумеў, якія памылкі не трэба рабіць у шлюбе. Зразумеў і падзяліўся карысной інфармацыяй з чытачом. Спадзяюся, што шмат хто пасля прачытання «зразумеў» разам са мною. Не бойцеся быць сямейнымі...

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

1	Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов	Аукцион состоится 16 декабря 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»				
2	Срок приема документов	с 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 9 декабря 2010 года, 10 декабря 2010 г. – до 13.00				
3	Номер лота	1	2	3	4	5
4	Адрес земельного участка	Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Войкова (остановка «Микрорайон 19»)	Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Ленинградская (остановка «Микрорайон 18»)	Жлобинский район, г. Жлобин, перекресток Фоканова и Козлова	Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Козлова	Жлобинский район, г. Жлобин, микрорайон 17, 51
5	Кадастровый номер участка	321850100002003205	321850100001001532	321850100002003089	321850100001001516	321850100002003088
6	Площадь, га	0,0110	0,0120	0,0150	14,9351 га	0,2100
7	Целевое назначение	Для установки и обслуживания остановочного комплекса	Для установки и обслуживания остановочного комплекса	Для строительства и обслуживания кафе	Для строительства и обслуживания рынка	Для строительства и обслуживания детского кафе (пиццерия)
8	Срок аренды, лет	10 (десять) лет	10 (десять) лет	30 (тридцать) лет	50 (пятьдесят) лет	30 (тридцать) лет
9	Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия	Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ)				
10	Ограничения и условия	1. Внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка. 2. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания (лоты №№ 1, 2, 4, 5) и изменения земельного участка (лот № 3). 3. Заключение победителем с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год (лоты №№ 1, 2, 3, 5), 2 года (лот № 4). 5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.				
		6. 0,0110 га – охранная зона водопроводных сетей и канализации.	6. 0,0100 га – охранная зона канализации и газопровода. 7. 0,0020 га – охранная зона газопровода.	6. 0,0019 га – охранная зона линии электропередачи с напряжением свыше 10 кВ.	6. 1,5981 га – охранная зона линии электропередачи с напряжением свыше 10 кВ. 7. Возмещение победителем потерь сельскохозяйственного производства с перечислением средств на их возмещение на транзитный счет управления государственного казначейства по месту постановки на учет плательщика (код платежа – 05201) – **412 156 400** рублей. 8. Возмещение убытков учреждению образования «Жлобинский государственный профессиональный аграрно-технический колледж» от изъятия земельного участка – **7 775 700** рублей. 9. Снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту.	–
11	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Подключение к общегородским сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД.				
12	Начальная стоимость, рублей	1 355 395	1 478 608	3 744 077	25 075 долларов США *(по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату проведения аукциона)*	60 092 552
13	Сумма задатка, рублей	100 000	100 000	350 000	5 000 000	5 000 000
14	Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей	1 257 089	1 287 625	1 682 341	1 028 111	613 542
15	Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей	1 000 000	1 000 000	1 000 000	1 000 000	1 000 000

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 № 462.

2. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В течение 10 рабочих дней местный исполнительный комитет принимает решение о предоставлении земельного участка в аренду. Победитель обязан внести плату за право аренды земельного участка, определенную в результате торгов, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

3. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление об участии в нем подано только одним гражданином, индивидуальным предпринимателем или юридическим лицом, местный исполнительный комитет при наличии согласия соответствующего из указанных лиц в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении этому лицу земельного участка в аренду. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо обязаны внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона. После совершения лицом названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет заключает с ним договор аренды земельного участка.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) не позднее 10 декабря 2010 года подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530026 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, МФО 151501673, УНН 490317354.

6. Оплата стоимости предмета аукциона, расчеты с организатором аукциона осуществляются в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости земельного участка.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. **Контактные телефоны: 8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.**

ТАЛЕРАЧКІ ПА ПРАВІЛАХ

АМАЛЬ што кожную нядзелю ў парку адпачынку мікрараёна Уручча можна ўбачыць дзесяць дзівакоў, якія бегаюць, падаюць, падымаюцца і зноў бягуць, спрабуючы злавіць талерку. Праўда, не тую, якую мы звычайна выкарыстоўваем у якасці посуду. Ды і справа тут зусім не ў кулінарыі.

У 50-я гады мінулага стагоддзя за акіянам з'явілася гульня пад назвай **«алцімат»**, дзе і пачалі выкарыстоўваць лятаючую талерку. Гісторыя стварэння гэтага віду спорту належыць студэнтам амерыканскага кулінарнага каледжа, якія на перапынках сталі перакідвацца формачкамі ад пірагоў кампаніі **«Фрысбі»**. Гэта ідэя забаўкі з цягам часу перарасла ў асобны спартыўны від. Гульня ў талерачкі па правілах за пяцьдзясят гадоў распаўсюдзілася на 45 краін свету. І эпідэмія **«алцімат фрысбі»** з кожным годам ахоплівае ўсё новыя і новыя тэрыторыі. Не стала выключэннем і Беларусь. У нашай краіне гэтай гульні ўжо больш за пяць гадоў. Прыхільнікі яе збіраюцца на адкрытых пляцоўках летам і ў спартыўных залах зімой і дзеля асабістага задавальнення бегаюць за спецыяльнай талерачкай. Спартыўны сезон дзеліцца на зімні і летні. Надвор'е ніякім чынам не ўздзейнічае на графік спаборніцтваў, а толькі выступае асновай для змены пляцоўкі.

Да талеркі «Фрысбі», на першы погляд простага спартыўнага атрыбута, выстаўляюцца строга акрэсленыя патрабаванні: вага 175 грамаў, дыяметр 27,5 сантыметра, таўшчыня цэнтральнай часткі 1,5 міліметра, а па краях — 7. Такі дыск можа праляцець больш за 250 метраў. Гэты від спорту нечым нагадвае футбол, але тут можна і трэба гуляць рукамі, а таксама даводзіцца хутка бегаць і высока скакаць. Вось толькі ў адрозненне ад футбола, «алцімат» не бярэ за аснову суперніцтва і прагу да перамогі. Галоўнае тут — камандны дух, добры адпачынак і ўзаемапавага.

У нашай краіне ў гэтым відзе спорту ёсць як прафесіяналы, так і аматары. Каманд, якія гуляюць дзеля сябе, даволі шмат. І іх можна сустрэць летнім днём дзесьці ў парку ці на футбольнай пляцоўцы. Хлопцы бегаюць, скачуць і такім чынам вызваляюцца ад негатыву, адпачываюць і проста атрымліваюць задавальненне ад працэсу ўзаемадносін. Каманды-прафесіяналы, якіх у нашай краіне не так шмат, выязджаюць на спаборніцтвы як па Беларусі, так і за яе межы. Але адметнае тут тое, што не ім плацяць за гульню, а яны за яе. «Алцімат» яшчэ не настолькі вядомы, не так распаўсюджаны, як іншыя віды спорту. Таму і фінансаванне ў яго пакуль што слабае. Па ўсім свеце ў «фрысбі» гуляе ўжо больш за пяць мільёнаў чалавек. А каб атрымаць статус алімпійскага віду спорту, неабходна дзесяць. Пры дасягненні гэтай лічбы прыхільнікаў «алцімат» перасягне мяжу аматарская аўдыторыі і набудзе статус прафесіяналаў.

Каманда **«ХЗ»** (Мінск) з'яўляецца адной з пачынальніц «фрысбі» Беларусі. З часам сфарміраваўся склад людзей, які паступова змяняўся. Зараз хлопцы змагаюцца за сваё права быць прызнанымі на спартыўнай арэне: яны выязджаюць на спаборніцтвы не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і за яе межамі, праводзяць прэзентацыі, на якіх знаёмяць моладзь з «алціматам», праводзяць трэніроўкі для школьнікаў і студэнтаў... Мне пашчасціла пагутарыць з адным з гульцоў каманды **«ХЗ» Ігарам Сачуком**, якога я знайшла якраз на трэніровачнай пляцоўцы.

— Скажы, калі ласка, як даўно ты займаешся «алціматам»?

— Мабыць, як толькі ў нашай краіне пачалі з'яўляцца першыя звесткі пра гэты від спорту, ім пачаў цікавіцца і я. Спачатку спрабаваў сам нешта асвоіць, шукаў інфармацыю ў інтэрнэце, знаёміўся. Памятаю, як мы разам з сябрам набылі дыск у краме і проста адно аднаму кідалі яго. Такім чынам даведаліся, што ён наогул з сябе ўяўляе.

— Нейкі папярэдні спартыўны вопыт у цябе ёсць? Ці ён у «алціматае» зусім не абавязковы?

— Раней я займаўся футболам. Ды і наогул за сваё жыццё паспрабаваў, калі не ўсе, дык многія віды спорту. Але спыніўся на «фрысбі», ён мне найбольш даспадобы. Вядома, тое, што я чалавек спартыўны, грае сваю ролю на спаборніцтвах, у працэсе гульні. Мне лёгка даюцца трэніроўкі, я магу шмат бегаць, скакаць. Але, каб гуляць у «алціматэ», зусім неабавязкова быць мегаспартсменам. Іншая справа, што можна ўдала спалучаць якасці, напрыклад, ад футбола пры гульні ў «фрысбі». Абмежаванняў у нас няшмат. Узрост, у асноўным, ад 16 да 30, прага да руху і ўменне працаваць у камандзе.

— «Алцімат» параўноўваюць з амерыканскім футболам. Розніца толькі ў тым, што там гуляюць з мячыкам, а ў вас з талерачкай. Як ты лічыш, ці правільнае такое параўнанне?

— Па знешняй сваёй характарыстыцы, можа, і правільнае. А вось па сутнасці наогул не. Футбол больш жорсткі, там ёсць суддзя, які сочыць за працэсам гульні, і на першы план там выступае прага менавіта да перамогі, прычым не заўсёды сумленнай. А ў «фрысбі» няма суддзяў, гульцы самі сочаць за працэсам, самі лічаць галы. На першы погляд, дзіўна, і ўзнікае сумненне наконт справядлівасці і сумленнасці. Але на маёй памяці яшчэ не было такога, каб нехта праявіў агрэсію і паспрабаваў схітрыць. Мы гуляем дзеля асабістага задавальнення, таму без узаемапавагі не абысціся. Ведаеце, многія лічаць, што калі няма суддзяў у спорце, ён не такі відовішчны. Мабыць, таму пакуль да «фрысбі» ніяк не могуць прывыкнуць. Хоць факт з'яўлення так званых **«абзёрвераў»**, або аглядальнікаў, сведчыць пра тое, што нас ведаюць.

— Ваша каманда працуе з моладдзю, школьнікамі ў напрамку прэзентацыі «алцімата» ў якасці новага і перспектыўнага віду спорту? Якую менавіта працу вы праводзіце?

— З падрастаючым пакаленнем працаваць даволі складана ў тым плане, што наш спорт пакуль не вельмі развіты і ў ім не паспелі яшчэ з'явіцца куміры, ідэалы, як, напрыклад, у футболе. Таму ў дзяцей часам знікае цікавасць. Тым больш што спецыяльных секцый па «алціматфрысбі», на жаль, не існуе. І ў школьных спартзалах у яго гуляюць зрэдку. Лягчэй працаваць са студэнтамі, паколькі яны людзі ўжо дарослыя і амаль што вызначыліся са сваімі захапленнямі і ідэаламі ў тым ліку. Мы неаднаразова праводзілі прэзентацыі ў аўдыторыях універсітэтаў і каледжаў, стараемся ўдзельнічаць з паказальнымі выступленнямі на Дзень спорту: расказваем пра гульню, яе гісторыю, раздаём розныя даведачныя матэрыялы, запрашаем на трэніроўкі, спаборніцтвы і, безумоўна, праводзім некалькі гульняў, каб людзі маглі паназіраць, а часам нават і паўдзельнічаць у іх. Так лягчэй зразумець, тваё гэта ці не.

— І як справа складваецца? З'яўляюцца новыя ахвотныя трапіць у склад каманды?

— З'яўляюцца, людзі прыходзяць, толькі ў камандзе застаюцца нямногія. Справа ў тым, што ў нашай краіне ў гэтага віду спорту пакуль больш аматараў, чым прафесіяналаў. Але мы працягваем працаваць. Нашы каманды — гэта другое пакаленне «фрысбі». Яго родапачынальнікі знаёміліся

Здароўе на талерцы

Арэхі палепшаць памяць

Аказваецца, арэхі зніжаюць рызыку ўзнікнення старэчай няпамятлівасці і раптоўнага інфаркту, паколькі вітамін Е, які ўтрымліваецца ў арэхах, перашкаджае ўтварэнню халестэрынавых бляшак і ахоўвае сасуды. Прычым лепшым варыянтам з'яўляецца міндаль.

Акрамя таго, людзі, якія не радзей за два разы на тыдзень з'ядаюць 30 грамаў арэхаў, зніжаюць рызыку інфаркту на 47 % у параўнанні з тымі, хто ўвогуле не есць арэхаў. Больш за тое, розныя гатункі арэхаў дапамогуць вам пазбавіцца ад розных немачаў.

Напрыклад, **фундук** па праве можна лічыць улюбёнцам дыетолагаў: дзякуючы нізкаму ўтрыманню вугляводаў яго можна есці і пры вельмі строгай дыеце без рызыкі набраць вагу. Фундук карысны пры хранічнай стомленасці, дыябеце, павышаным ціску, павелічэнні прастаты, варыкозным расшырэнні і запаленні вен.

Малачко з лясных арэхаў супакойвае нервы і лечыць хранічныя бранхіты. Гатуецца яно так: 50 ядраў арэхаў раскалоць і замачыць на 10 гадзін у адной шклянцы цёплай вады. Затым расцерці ў ступцы і настойваць на працягу трох гадзін, закіпяціць і працадзіць. Дадаць 5 сталовых лыжак вяршкоў і 2 дэсертныя лыжкі мёду. Прымаць па сталовай лыжцы два разы на дзень перад ядой.

Міндаль лічыцца чэмпіёнам па ўтрыманні кальцыю і вітаміну Е. Ён вельмі карысны пры малакроўі і парушэннях зроку, а міндальны алей дабратворна дзейнічае на скуру, увільгатняючы яе і здымаючы раздражненне. Пры захворваннях страўнікава-кішачнага тракту і нырак рэкамендуецца есці міндальныя арэхі, запіваючы іх гарачым малаком. Салодкі міндаль карысны пры павышаным узроўні халестэрыну, пры гіпертаніі, пухлінных захворваннях, вочных хваробах, атлусценні, язвах, хваробах жоўцевых пратокаў і пякотцы. А вось горкім міндалём празмерна захапляцца не варта — вельмі вялікая колькасць эфірных алеяў, якія ўтрымліваюцца ў гэтым гатунку арэха, можа нанесці шкоду здароўю. Дапушчальная дзённая норма — усяго некалькі зярнятак.

Арахіс, або як яго яшчэ называюць, земляны арэх, — цудоўная крыніца фоліевай кіслаты, якая садзейнічае абнаўленню клетак, а тлушчы, што ўтрымліваюцца ў ім, аказваюць лёгкае жаўцягоннае дзеянне. Арахіс паляпшае памяць і ўвагу, садзейнічае нармальнаму функцыянаванню нервовай сістэмы, сэрца і іншых унутраных органаў. Аднак неабсмажаны арэх можа выклікаць парушэнні стрававання, а скурка арахісу — моцную алергію, таму лепш есці смажаныя і ачышчаныя арэхі.

Фісташкі карысныя тым, хто ачуньвае пасля хваробы, а таксама пры захворваннях печані, млоснасці і ў якасці прафілактыкі праблем з сэрцам. Выбіраючы фісташкі, варта памятаць пра тое, што зялёны колер ядзерцаў сведчыць пра спеласць: чым яны зелянейшыя, тым смачнейшыя.

Грэцкія арэхі ў многіх народаў лічыліся ежай волатаў — яны сапраўды ўмацоўваюць мышцы і хутка здымаюць стомленасць пасля фізічнай нагрузкі. Акрамя таго, плады грэцкага арэха аказваюць бактэрыцыднае, агульнаўмацавальнае, супрацьзапаленчае дзеянне.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

«НЕЗДАРОВАЯ ЕЖА» ПАЗБАВІЦЦА БЯСПЛАТНЫХ ЦАЦАК?

Заканадаўцы Сан-Францыска ўхвалілі законапраект, згодна з якім гарадскім закусачным будзе забаронена прыкладаць бясплатныя цацкі да нездаровай ежы. Да такой ежы аўтары законапраекта адносяць высокакаларыйныя стравы, а таксама стравы з празмерным утрыманнем солі і тлушчаў.

Члены Акруговай рады і грамадскія актывісты выказалі надзею, што іх намаганні зробяць Сан-Францыска першым буйным амерыканскім горадам, які прыме радыкальныя меры па барацьбе з дзіцячым атлусценнем. Гэта павінна стаць прыкладам і для іншых. Праўда, не выключана, што на новы законапраект накладзе «вета» мэр горада Гэвін Ньюсон. Аднак Акруговая рада ўжо заручылася падтрымкай актывістаў здаровага ладу жыцця і гатовая прагаласаваць паўторна, каб адхіліць магчымае «вета».

Па словах уладальніка 10 рэстаранаў «МакДональдс», якім у выпадку прыняцця закона прыйдзецца спыніць продаж дзіцячых абедаў «Хэпі Міл», Скота Родрыка, новаўвядзенне непазбежна прывядзе да падзення аб'ёмаў продажу. У выніку скароцяцца і колькасць рабочых месцаў, а таксама знізяцца падатковыя паступленні ў гарадскі бюджэт. Кампанія «МакДональдс» таксама падвергла ініцыятыву Акружнога савета Сан-Францыска крытыцы, сцвярджаючы, што яе эфектыўнасць у барацьбе з атлусценнем не даказана...

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Каб дзеці не гінулі на пажарах, не пакідайце іх адных

СЁЛЕТА Ў БЕЛАРУСІ НА ПАЖАРАХ ЗАГІНУЛА БОЛЕЙ ЗА 20 ДЗЯЦЕЙ

Нядаўна ў Магілёўскай вобласці адбыліся дзве непапраўныя трагедыі. На пажары ў Бабруйску загінула 4-гадовая Анастасія. Малая была адна дома, калі суседзі адчулі пах дыму і выклікалі МНС. Дзяўчынка атруцілася прадуктамі гарэння, і выратаваць яе не здолелі.

Яшчэ адно жыццё дзіцяці забраў пажар у прыватным жылым доме ў раённым цэнтры Бялынічы. На пажары загінула Крысціна 2009 года нараджэння. Маладая маці паклала дзяўчынку спаць, але праз нейкі час увайсці ў пакой, дзе спала дачка, не здолела з-за моцнага задымлення. Медыкі ў бальніцы канстатавалі смерць Крысціны.

У цэнтры прапаганды і навучання пры Магілёўскім абласным упраўленні МНС нагадваюць, што вогненныя трагедыі адбываюцца не столькі па віне дзяцей з іх сваволлем, колькі па віне дарослых людзей, якія пакідаюць сваіх малых адных дома, не кантралююць іх дзеянні, не хаваюць запалкі і запальніцы, не тлумачаць сумныя наступствы гульняў з агнём.

І яшчэ: акрамя маральных пакутаў, нядбайным бацькам за пакіданне дзяцей у небяспецы можа пагражаць крымінальная адказнасць і пакаранне — да 3-х гадоў зняволення.

Ілона ІВАНОВА.

Краіна здароўя

Выпуск № 58 (227)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА. Вёска Навасёлле, Бярэзінскі раён.

Карысныя звычкі красуні

Жаночыя сакрэты

Што такое жаночая прыгажосць? Дар? Магчыма. Праца? Адназначна. Прычым праца штодзённая. І чым старэйшымі мы становімся, тым больш старанна павінны працаваць над тым, каб доўгія гады заставацца маладымі і прыгожымі, а значыць — здаровымі.

СОН. Рэжым — вялікая сіла. Ніколі не ахвяруйце сном на карысць начных забаў і прагляду тэлевізара. Навучыцеся планаваць свой час так, каб класціся і ўставаць у адзін і той жа час. Тады ваш біялагічны гадзіннік будзе працаваць без збояў.

Парада: калі вам цяжка заснуць — адмоўцеся ад снатворнага. Выпіце на ноч мятную гарбату з чайнай лыжкай мёду. А забраўшыся пад коўдру, зрабіце некалькі глыбокіх удыхаў і выдыхаў, затым уявіце, што, выдыхаючы, вы пазбаўляецеся ад усяго негатыву, які назапасіўся за дзень, а ўдыхаючы, набіраецеся спакою і цішынасці. Уявіце цёмную хмарку, якая з кожным выдыхам пакідае вас, без следу растворацца ў прасторы. Гэта простая і надзіва дзейсная медытацыя, пасля якой вы лёгка засняце сном праведніка.

ХАРЧАВАННЕ. Не эканомце на якасці ежы. Лепш з'есці ў тры разы менш, але лепшае з таго, што вы можаце сабе дазволіць. Сачыце за тым, што вы ясце, і харчуйцеся, зыходзячы з патрэб вашага ўзросту. Не пераядайце. Не ўжывайце ў ежу транс-тлушчы (маргарын і да т. п.) і выпечку на іх аснове.

Парада: кожны тыдзень паступова мяняйце адну шкодную харчовую звычку на адну карысную. Напрыклад, у першы тыдзень перайдзіце на нізкакаларыйную вячэру, у другі паспрабуйце замяніць яе шклянкай кефіру з пшанічным вотруб'ем. А для таго, каб раніцай адчуць прыліў бадзёрасці, выпіце нашча шклянку цёплай вады з долькай лімона і чайнай лыжкай мёду.

РАБОТА КІШЭЧНІКА. У ідэале кішэчнік працуе, як добра адладжаны гадзіннікавы механізм. Гэта значыць, эвакуацыя яго змесціва павінна праходзіць рэгулярна. Запоры імгненна адбіваюцца на стане нашай скуры, паколькі арганізм атручваецца прадуктамі распаду.

Парада: прачнуўшыся, зрабіце лёгкі кругавы масаж зоны злева ад пупка. Лёгка масіруйце на працягу адной хвіліны па гадзіннікавай стрэлцы.

ЗАРАДКА. Фізічныя нагрузкі абавязковыя, і гэта не абмяркоўваецца. Чалавек — біялагічная машына, якой патрэбен рух і якая псуецца ад прастою. Калі вам не ўдаецца выкраіць раніцай 15—20 хвілін для зарадкі, то выконвайце практыкаванні прыхваткамі.

Парада: трэніраваць мышцы можна ў транспарце, за працоўным сталом і нават падчас прыгатавання сняданку для сям'і. Рабіце простыя рухі: прысяданні, нахілы і г.д. Галоўнае, «рассмакаваць» тое задавальненне, якое прыносіць рух. І ў далейшым вы ўжо не зможаце без гэтага абысціся.

ВІЗІТЫ ДА ДОКТАРА. Планавыя агляды ў спецыялістаў павінны стаць абавязковымі. Не трэба жыць па прынцыпе «жывём, пакуль не адвалілася». Раз у паўгода абавязкова наведвайце гінеколага і мамолага.

Парада: пасля 30-ці неабходна штогод здаваць кроў для вызначэння ўзроўню цукру, халестэрыну і пратрамбіну. Так вы не ўпусціце момант, калі хваробу, што падкралася, яшчэ можна перамагчы.

ПОСТАЦЬ І ХАДА. Нішто так не старыць жанчыну, як панураныя плечы і апушчаная галава. Ёсць адна маленькая хітрасць: якой бы камплекцыі вы не былі, сілуэт будзе ўспрымацца падцягнутым, калі за ліняй грудзей вам відаць уласны жывот.

Парада: падчас хады сачыце за тым, каб жывот заўсёды заставаўся ўцягнутым, а плечы распраўленымі. У гэтым выпадку, нават калі ваша вага значна вышэйшая за норму, навакольныя будуць успрымаць вас стройнай і спартыўнай.

ПАДБАРОДАК І АВАЛ ТВАРУ. Калі мы пачынаем ператварацца з дзяўчат у цётак? Калі ў нас пачынае аплываць авал твару і з'яўляецца другі падбародак. З гэтым можна і трэба змагацца. Падбародак, а дакладней — сківічна-пад'язычную мышцу, называюць «другім прэсам», і гэтаксама, як і прэс, гэтую мышцу трэба трэніраваць, каб яна не абвісала.

Парада: пазбавіцца ад другога падбародка дапаможа наступнае практыкаванне. Выцягнуўшы шыю, энергічна вымаўляйце гукі «о», «у», «і» ў такой паслядоўнасці (20 разоў запар). Другі варыянт: таксама энергічна прагаворваць склад «МА» (20 разоў).

МІМІКА. Сачыце за сваёй мімікай. Мы прывыклі празмерна грымаснічаць, і гэта ў першую чаргу датычыць суровай складкі на пераносіі або гарызантальных маршчын на лбе. Акрамя таго, не бачачы сябе збоку і несвядома капіруючы міміку той ці іншай «зоркі», мы рызыкуем выглядаць проста смешна.

Парада: самы лепшы выраз твару — той, які адлюстроўвае ўнутраны спакой. Пасачыце за сабой на працягу дня. Вы пераканаецеся, што 90 працэнтаў часу ў вас напружана-заклапочаны выгляд: нахмураныя бровы, сціснутыя вусны. Навучыцеся кантраляваць гэтыя станы і пазбаўляцца ад іх.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Па чутках і кампетэнтна

ЯЙКІ — САПРАЎДНАЯ... АТРУТА?

«Яечны жаўток у курыных яйках аказаўся нашмат больш шкодным, чым фаст-фуд. Да такой высновы прыйшлі канадскія дыетолагі», — інфармуе інтэрнэт. Маўляў, колькасць халестэрыну ў жаўтку зашкальвае — ад 215 да 275 мг, у той час як у сэндвічу з катлетай у рэстаране хуткага харчавання — максімум 150 мг. Дыетолагі заяўляюць: штодзённае ўжыванне яек не прыносіць шкоды толькі зусім здаровым людзям. У астатніх жа павялічваецца рызыка развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў, дыябету і іншых хваробаў. Усю праўду пра яйкі і халестэрын, які апошнія змяшчаюць, паведаміў вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі медыцынскіх інфармацыйных тэхналогій Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Ігар КАЗЛОЎ.

— Дыетычная прафілактыка захворвання сасудаў мае на ўвазе паступленне з ежай не больш як 200 мг харчовага халестэрыну ў дзень. У яечным жаўтку ўтрымліваецца каля 220-280 мг халестэрыну. Высокае ўтрыманне халестэрыну ў яечным жаўтку з'яўляецца вядомым фактам. Таму абмежаванне ўжывання яек да трох на тыдні з мэтай зніжэння паступлення харчовага халестэрыну з'яўляецца адным з кампанентаў гіпаліпідэмічнай дыеты. Аднак больш важным патрабаваннем гэтай дыеты з'яўляецца зніжэнне ўжывання тлушчаў, і асабліва тлушчаў жывёльнага паходжання. Усё ж такі 80 працэнтаў халестэрыну, які знаходзіцца ў арганізме, сінтэзуецца ў печані з насычаных тлустых кіслот, пастаўшчыком якіх і з'яўляюцца памянёныя тлушчы. Таму сцвярджэнне аб тым, што яйкі больш шкодныя за фаст-фуд, не адпавядае ісціне, і можа разглядацца толькі як рэкламны трук на карысць фаст-фуду.

Кожнаму чалавеку дастаецца у спадчыну свой ліпідны, тлушчавы абмен, і таму парушэнні ў абмежаванні тых жа жывёльных тлушчаў будуць небяспечнымі па-рознаму. У большасці людзей з высокімі лічбамі халестэрыну з дапамогай дыеты можна знізіць гэты паказчык на 10-15 працэнтаў.

Для дзіцячага арганізма пры адсутнасці алергіі аптымальнай нормай будзе штодзённае ўжыванне аднаго яйка. Як, дарэчы, і для чалавека сярэдніх гадоў, які мае вялікую фізічную нагрузку, вядзе актыўнае, у тым ліку сэксуальнае, жыццё. Аптымальная рэкамендацыя для людзей старэйшага ўзросту, калі з'яўляюцца фактары рызыкі развіцця атэрасклерозу, назіраецца павышаны узровень халестэрыну — да трох яек на тыдні. Калі ж чалавек перанёс інфаркт ці інсульт, то акрамя дыеты яму прызначаюць спецыяльныя прэпараты для зніжэння ўзроўню халестэрыну — стаціны, прычым нават на фоне нармальнага паказчыка халестэрыну ў крыві. Дарэчы, дыета ў такім выпадку прадугледжвае абмежаванне не толькі яек, але і любых іншых прадуктаў з высокім утрыманнем жывёльных тлушчаў — мяса, сала, тлустых малочных прадуктаў. Зразумела, што ў той дзень, калі мы ўжылі курынае яйка, не варта ўжываць іншыя прадукты з жывёльнымі тлушчамі. Трэба мець на ўвазе, што пры абмежаванні курыных яек абмяжоўваецца і колькасць перапёлчыных.

Наогул выключыць яйкі з харчавання неразумна дый немагчыма. Бо акрамя патэнцыйна небяспечнага халестэрыну, у курыным яйку ёсць шэраг карысных рэчываў — халін і лецытын, якія з'яўляюцца фосфаліпідамі і бяруць удзел у фарміраванні ўстойлівасці да атэрасклерозу. Ёсць таксама вітаміны A, D, селен, кальцый, магній, фосфар, жалеза, цынк. Словам, мы маем магутны антыаксідантны комплекс. Акрамя таго, гэта яшчэ 6,5 г паўнацэннага бялку з добрым амінакіслотным складам. Калі цалкам адмовіцца ад яек ці ўжываць толькі бялок, можна пазбавіць сябе пералічаных карысных рэчываў, паколькі яны ўтрымліваюцца менавіта ў жаўтку. Хоць, вядома, на такія рэчывы багатыя і іншыя прадукты — арэхі, свежая садавіна, морапрадукты, тлустая марская рыба.

Спосаб гатавання яек на ўтрыманне халестэрыну, на жаль, ніяк не ўплывае. Адзінае, дрэнна тэрмічна апрацаваныя ці проста сырыя яйкі могуць несці ў сабе пагрозу заражэння сальманелёзам. Да таго ж, калі жаўток засвойваецца ў любым выглядзе, то сыры бялок расшчапляецца і ператраўляецца значна горш.

Святлана БАРЫСЕНКА.

P.S. ХАЛЕСТЭРЫН іграе важную ролю ў падтрымцы здароўя чалавека, з'яўляецца важнейшым кампанентам вонкавых абалонак — мембран — усіх клетак нашага арганізма. У значнай ступені вызначае іх трываласць, эластычнасць і пранікальнасць апошніх. Без халестэрыну не можа быць паўнацэннай клеткі, а значыць, няма і складзенага з мільёнаў і мільёнаў розных клетак арганізма. Аднаго гэтага цалкам дастаткова, каб лічыць халестэрын вельмі важным і незаменным. Але яго роля яшчэ больш шырокая і маштабная. Халестэрын выкарыстоўваецца ў працэсе сінтэзу многіх гармонаў. У прыватнасці, мужчынскіх і жаночых палавых гармонаў, без якіх усе мы сталі б істотамі бясполымі, або стэроідных гармонаў — глюкакартыкоідаў, мінералакартыкоідаў, якія забяспечваюць абарончыя рэакцыі ў арганізме. Яшчэ халестэрын бярэ ўдзел у сінтэзе вітаміну D — таго, што спрыяе нармальнаму росту і фарміраванню касцей.

Словам, халестэрын патрэбны ўсім тканкам і органам кожную секунду, перабоі з гэтым «будаўнічым матэрыялам» могуць адбіцца на іх стане. Таму сінтэз халестэрыну адбываецца няспынна, прычым 80 працэнтаў ствараецца з прамежкавых прадуктаў абмену бялкоў, тлушчаў і вугляводаў і толькі 20 працэнтаў паступае ў гатовым выглядзе — з прадуктамі харчавання жывёльнага паходжання. Галоўным будаўнічым матэрыялам для халестэрыну з'яўляюцца насычаныя тлустыя кіслоты, утрыманне якіх найбольш высокае ў тлушчах жывёльнага паходжання. Такім чынам, неабходная колькасць халестэрыну вырабляецца печанню. Утрымліваецца ён і ў некаторых прадуктах харчавання, асабліва ў яечным жаўтку, мясе, птушцы, рыбе, морапрадуктах і малочных прадуктах, атрыманых з цэльнага малака. Садавіна, агародніна і збожжавыя прадукты не ўтрымліваюць халестэрыну.

З-за таго, што харчаванне беларусаў вылучаецца ўжываннем вялікай колькасці жывёльных тлушчаў, высокі ўзровень халестэрыну распаўсюджаны досыць шырока. Паводле сусветных ацэнак, у 2000 годзе высокі ўзровень халестэрыну з'яўляўся прычынай 18 працэнтаў цэрэбраваскулярных захворванняў, якія ў большасці выпадкаў прыводзяць да лятальнага зыходу і 56 працэнтаў выпадкаў ішэмічнай хваробы сэрца.

І коратка пра халестэрын «добры» і «дрэнны». Як і ўсе тлушчападобныя рэчывы, халестэрын у вадзе не расшчапляецца. А шлях да тканак з месцаў найбольш інтэнсіўнага сінтэзу — печані і сценкі тонкай кішкі — магчымы толькі па сасудах. Кроў хоць і не вада, але ж воднае асяроддзе, і халестэрыну даводзіцца «хавацца» у абалонку з водараствараль ных бялкоў. Атрымліваюцца своеасаблівыя капсулы, якія называюцца ліпапратэідамі («ліпід» — тлушч, «пратэін» — бялок). Яны цудоўна расшчапляюцца ў крыві і з яе токам разносяцца да органаў-спажыўцоў, а ад іх — назад у печань. Вось тут, калі размова заходзіць аб транспартнай форме халестэрыну, і пачынаецца ўмоўнае дзяленне на «дрэнны» і «добры». Справа ў тым, што да тканак яго нясуць бэта-ліпапратэіды нізкай і вельмі нізкай шчыльнасці. Іх называюць атэрагеннымі (якія нараджаюць атэрасклероз). Яны лёгка аддаюць халестэрын. А «добрым» называюць халестэрын, які ўваходзіць у склад альфа-ліпапратэідаў высокай шчыльнасці. Іх функцыя — вызваляць клеткі ад непатрэбнага, лішняга халестэрыну і транспартаваць у печань, дзе ён падвяргаецца адваротнаму распаду, а затым выводзіцца з арганізма. Павышаны ўзровень агульнага халестэрыну ў большасці выпадкаў абумоўлены халестэрынам, які ўтрымліваецца ў ліпапратэідах нізкай шчыльнасці. Таму лічыцца, што пры высокім узроўні агульнага халестэрыну ствараюцца перадумовы для развіцця атэрасклерозу.

АДРАЗУ 7 АЛКАГОЛІКАЎ

пакінулі свет за выхадныя лістапада ў розных раёнах Гомельшчыны. Усім — больш за 50 гадоў. Іх усіх, акрамя аднаго, знайшлі без прыкметаў гвалтоўнай смерці. У Святілавіцкую бальніцу з вёскі Стаўбун Веткаўскага раёна тэрмінова дастаўлялі сужыцеляў, якія бавілі час з дапамогай спіртных напояў. Мужчына памёр у машыне «хуткай дапамогі», жанчына — у бальніцы. Што стала прычынай заўчаснай смерці, адкажа экспертыза.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Аздараўленне-2010

Для бацькоў галоўнае — бяспека і камфорт...

...а для дзяцей — сучасныя важатыя...

Ці можна лічыць аздараўленнем дзяцей звычайнае баўленне часу пад наглядам педагогаў? Ці ёсць будучыня ў лагераў дзённага знаходжання, якія працуюць пры школах? Якімі крытэрыямі можна ацаніць эфект ад аздараўлення? Як фарміруюцца педагагічныя калектывы ў загарадных аздараўленчых лагерах? Ці гатова сістэма адукацыі прыняць на свой баланс ведамасныя аздараўленчыя лагеры? Усе гэтыя пытанні ўзніміліся ў сценах галоўнага адукацыйнага ведамства на калегіі, прысвечанай арганізацыі аздараўлення беларускіх школьнікаў.

Як зазначыў **намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО**, школьныя канікулы ў нашай краіне — адны з самых працяглых у Еўропе. Канікулярны час займае 126 дзён, гэта значыць, што трэцюю частку года беларускія школьнікі адпачываюць. Наколькі разумна мы карыстаемся гэтым часам? Пры падрыхтоўцы да калегіі было праведзена апытанне ў трох мэтавых групах: сярод бацькоў, чыё меркаванне фарміруе сацыяльны заказ на аздараўленне, сярод дзяцей, як непасрэдных удзельнікаў аздараўлення, і сярод педагогаў. Прывядзём найбольш яскравыя з агучаных меркаванняў:

Бацькі:

«Я лічу, што галоўнае падчас адпачынку — гэта бяспека».

«Цана для мяне мае значэнне. Пуцёўка павінна быць даступнай, а адпачынак — якасным».

«Хацелася б, каб у лагеры працавалі прафесіяналы: прафесійныя выхавацелі, прафесіяналы-ўрачы, прафесійныя работнікі сталовай».

«Дакладна ведаю, што ніколі не адпраўлю сваё дзіця ў той лагер, дзе няма чысціні і парадку, дзе харчблок — учарашні дзень...»

Дзеці:

«Адпачынак у лагеры павінен быць сучасны. Хацелася б адпачыць ад гэтага гарадскога жыцця. Сучаснымі павінны быць важатыя. У мяне такіх не было».

«Харчаванне, карпусы, конкурсы — гэта ўсё, вядома, важна. Але без класнага важатага ўся змена можа прайсці нецікава».

Педагогі:

«Педагагічная падрыхтоўка ажыццяўляецца сёння ў 26 ВНУ і каледжах, разам з тым падрыхтоўка педагагічных кадраў вядзецца без уліку работы ў аздараўленча-адукацыйных установах».

— Мы захавалі датацыі на пуцёўкі — гэта добрая фінансавая падтрымка сем'яў. — адзначыў **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК**. — Бацькоўская даплата ў 2010 годзе вагалася ад 15 тысяч рублёў за пуцёўку ў лагер з дзённым знаходжаннем да 300 тысяч — за пуцёўку ў загарадныя аздараўленчыя лагеры.

Права на аздараўленне не павінна ператварацца ў абавязак. Важна, каб дапамога, якая выдзяляецца дзяржавай на аздараўленне аказвалася тым дзецям, якія сапраўды маюць патрэбу ў такой форме адпачынку.

Разам з тым тэхнічны стан будынкаў і збудаванняў аздараўленчых лагераў патрабуе значных матэрыяльных укладанняў. Больш за палову з іх маюць тэрмін эксплуатацыі ад 30 да 60 гадоў. Састарэлае абсталяванне нярэдка становіцца прычынай дзіцячага траўматызму. Між іншым, у параўнанні з 1999 годам колькасць загарадных аздараўленчых лагераў зменшылася ў краіне на 129 адзінак. Ведамасныя аздараўленчыя лагеры размяркаваныя зараз паміж 17-ю ўласнікамі. Аднак колькасць аздараўленчых лагераў, якія знаходзяцца ва ўласнасці органаў кіравання адукацыяй штогод павялічваецца (зараз гэта 71 лагер са 187). Ранейшыя ўласнікі пазбаўляюцца ад лагераў, як калісьці ад сваіх ведамасных дзіцячых садкоў, і перадаюць іх на баланс сістэмы адукацыі. За апошнія 5 гадоў органам кіравання адукацыяй былі перададзены 30 аздараўленчых лагераў, прычым 22 — у бягучым годзе. Многія з іх перадаваліся напярэдадні старту аздараўленчага сезону, так што пад пытаннем аказвалася іх адкрыццё. Органам адукацыі даводзілася ў тэрміновым парадку шукаць у бюджэце сродкі, якія, зразумела, не былі туды закладзеныя, каб у вельмі сціслыя тэрміны паспець усё падрыхтаваць да прыёму дзяцей. І ім гэта ўдалося...

А вось меркаванні дзяцей і саміх педагогаў на аздараўленне ў многім супадаюць.

— Галоўнае для дзяцей — гэта класны важаты, а значыць, падрыхтоўка спецыялістаў, якія суправаджаюць аздараўленне дзяцей, — важны складнік у сістэме аздараўлення, — падкрэсліў Віктар Якжык. — Штогод у работу па аздараўленні дзяцей уключаюцца больш як 35 тысяч настаўнікаў, выхавальнікаў і студэнтаў. У 2009 годзе быў створаны і аператыўна актуалізуецца банк звестак педагагічных работнікаў, што дазваляе задавальняць патрэбы аздараўленчых і санаторна-курортных арганізацый у педагагічных кадрах. Аднак і тут ёсць нявырашаныя праблемы.

Зараз у краіне функцыянуюць усяго толькі два круглагадовыя аздараўленчыя лагеры — Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» і Мінскі гарадскі дзіцячы аздараўленчы лагер «Лідар»: там дзеці не толькі адпачываюць, але і працягваюць вучыцца. Аднак пасля прыняцця Кодэкса Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі» аналагічныя круглагадовыя адукацыйна-аздараўленчыя цэнтры з'явяцца ўжо ў кожным рэгіёне Беларусі. Для работы ў іх, ды і не толькі ў іх, трэба наладжваць у педагагічных навучальных установах падрыхтоўку педагогаў-выхавальнікаў для выхаваўча-аздараўленчых устаноў, упэўнены Віктар Якжык.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:

— усяго ў Беларусі атэставаныя 187 аздараўленчых лагераў на 36,7 тысячы месцаў;

— 33 раёны ў краіне не маюць сваіх аздараўленчых загарадных лагераў;

— у 2008—2010 гадах пасля правядзення капітальнага рамонту аднавілі работу 12 загарадных аздараўленчых лагераў .

— у гэтым годзе ў перыяд аздараўлення дзеці атрымалі 275 траўм, у тым ліку 166 цяжкіх (пераломы) (у 2009 годзе — 209 і ў 2008 годзе — 154).

Па словах **дырэктара лагера «Лідар» Алены КУНІЦКАЙ**, круглагадовы лагер — гэта асаблівая ўстанова са сваім спектрам праблем — сацыяльных, кадравых і эканамічных.

— Па-першае, дзейныя штатныя нарматывы, распрацаваныя і зацверджаныя Рэспубліканскім цэнтрам па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, не ўлічваюць спецыфіку работы круглагадовага лагера. Згодна з імі на 145 дзяцей прыпадае толькі 0,5 стаўкі педагога-псіхолага, 1,5 стаўкі кіраўніка гуртка і 0,5 стаўкі сацыяльнага педагога. Але гэтага яўна недастаткова. А ставак метадыста, юрыста, эканаміста, інспектара па кадрах, сакратара ўвогуле не прадугледжана. Таму дырэктар лагера павінен адзін выконваць усе гэтыя ролі, каб забяспечыць стабільную работу ўстановы, — паведаміла Алена Куніцкая. — Па-другое, у «Лідар» прыязджаюць навучэнцы, якія дасягнулі высокіх вынікаў у вучэбнай ці пазашкольнай дзейнасці. Зразумела, што і педагагічныя кадры, якія працуюць з такой катэгорыяй дзяцей, павінны мець адпаведную падрыхтоўку. У гэтай работы ёсць свая спецыфіка, свой узроставы крытэрый: важаты-лідар — гэта, як правіла, малады чалавек да 30 гадоў, крэатыўны, творчы, гатовы ахвяраваць сваім асабістым часам, аддаваць усяго сябе дзецям пры невысокай заработнай плаце. Упэўнена, што той, хто прайшоў школу «Лідара» ці нейкага іншага круглагадовага лагера, зможа ў далейшым без праблем працаваць у любой установе адукацыі.

Па словах Алены Куніцкай, праблема замацавання кадраў звязана для круглагадовых лагераў з немагчымасцю прадаставіць сваім работнікам сацыяльнае жыллё ці забяспечыць іх месцам у інтэрнаце: « Работа важатага — ненармаваная, і таму яна патрабуе пастаяннага знаходжання важатага на тэрыторыі лагера».

Начальнік аддзела адукацыі Наваполацкага гарвыканкама Святлана ДРАЗДОВА звярнула ўвагу членаў калегіі яшчэ на адну праблему — неадпаведнасць памеру заробкаў у аздараўленчых лагерах, якія знаходзяцца на балансе органаў адукацыі, і ў ведамасных лагерах. Так, мінулым летам зарплата педагогаў ў «бюджэтным» лагеры была 520 тысяч рублёў, а ў лагеры акцыянернага таварыства «Нафтан» — 1 мільён рублёў. У тэхнічнага персаналу — 327 тысяч і 652 тысячы рублёў адпаведна. Таму цалкам зразумела, чаму аздараўленчыя лагеры сутыкаюцца з праблемай дэфіцыту медсёстраў-дыетолагаў і работнікаў харчовых блокаў. Усё гэта ў выніку негатыўна адбіваецца на якасці прыгатавання ежы і забеспячэнні дзейнага кантролю за харчаваннем.

Сярод выяўленых органамі дзяржаўнага санітарнага нагляду парушэнняў у дзейнасці аздараўленчых лагераў 75 працэнтаў склалі дахопы ў арганізацыі харчавання. Часцей за ўсё гэта былі невыкананне норм харчавання (13,4 працэнта), недахопы ў якасці харчавання (9,3 працэнта) і незахаванне рэжыму мыцця посуду (19 працэнтаў).

Кожны год пры арганізацыі летняга аздараўлення органы кіравання адукацыяй шукаюць новыя формы работы з дзецьмі, якія зрабілі б іх адпачынак яркім і змястоўным. У Брэсцкай вобласці ў гэтым годзе ўкаранілі новую форму адпачынку дзяцей у рознаўзроставых атрадах па месцы жыхарства. У кожным раёне Віцебскай вобласці працавалі не менш як два аздараўленчыя лагеры ваенна-патрыятычнага профілю, прычым большасць з іх — на базе падраздзялення МУС і Мінабароны. У штат кожнага аздараўленчага лагера Гродзенскай вобласці былі ўведзены педагогі-псіхолагі і сацыяльныя педагогі, што дазволіла забяспечыць эфектыўнае сацыяльна-педагагічнае і псіхалагічнае суправаджэнне дзіцячага адпачынку. У Мінску ўпершыню ва ўмовах загараднага лагера было арганізавана аздараўленне 145 дзяцей-сірот дашкольнага ўзросту (ад 3 да 6 гадоў). Пры абсталяванні корпусу спецыяльна закупляліся мэбля і сантэхніка для малых.

Пэўныя праблемы ўзнікалі летам дзе-нідзе з камплектаваннем лагераў дзённага знаходжання ў школах. **Шчыра кажучы, і настаўнікі, і бацькі былі незадаволеныя прымусовым іх напаўненнем.** Фактычна права на аздараўленне не ператваралася ў абавязак. Між іншым, лагеры дзённага знаходжання складаюць больш як 70 працэнтаў ад агульнай колькасці.

— Пры падрыхтоўцы да калегіі мы цікавіліся меркаваннем наконт мэтазгоднасці далейшага функцыянавання прышкольных лагераў, — паведаміў Віктар Якжык. — Усе органы адукацыі далі адназначны адказ: гэты від дзіцячага адпачынку неабходны. Ён эканамічны і даступны дзецям з малазабяспечаных сем'яў. Аднак, хачу звярнуць увагу на тую акалічнасць, што плануючы лічбы не павінны дамінаваць над рэальнай патрэбай, асабліва ў гарадах. Органам кіравання адукацыяй і ўстановам адукацыі трэба звярнуць асаблівую ўвагу на абавязковае папярэдняе вывучэнне меркавання бацькоў пра неабходнасць такой формы адпачынку іх дзяцей, як аздараўленчы лагер з дзённым знаходжаннем у канкрэтнай установе адукацыі. Важна, каб дапамога, якая выдзяляецца дзяржавай на аздараўленне, была адраснай і аказвалася тым дзецям, якія сапраўды маюць патрэбу ў такой форме адпачынку.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Алімпійская чэмпіёнка і маладая мама Аксана МЯНЬКОВА:

«ПАСПРАБАВАЛА КІДАЦЬ МОЛАТ. ТРЭНЕР СКАЗАЎ, ШТО АТРЫМЛІВАЕЦЦА ЛЕПШ, ЧЫМ ДА ЦЯЖАРНАСЦІ»

Алімпійская чэмпіёнка Пекіна ў кіданні молата Аксана Мянькова гэтай восенню стала матуляй. 24 верасня ў яе нарадзілася дачка Арына. Зараз, калі дзяўчынцы больш за месяц і ў Аксаны з'явіўся нейкі бацькоўскі стаж, мы павіншавалі яе з прыемнымі падзеямі і распыталі, як змянілася жыццё алімпійскай чэмпіёнкі.

— Аксана, дачка атрымала імя ў спадчыну ад кагосьці з блізкіх?

— Не. Мы загадзя вырашылі, што, калі будзе хлопчык, назавём яго Арсеній, калі дзяўчынка — Арына. Мне падабаюцца гэтыя імёны, і мужу таксама.

— Узгадайце самы прыемны момант, калі ўпершыню ўбачылі немаўля.

— Калі мне яе ўпершыню прынеслі, у мяне адразу навярнуліся слёзы. Мне рабілі кесарава сячэнне, і я, здаецца, цэлую вечнасць чакала, пакуль мяне адпусцяць з рэанімацыі. Вельмі цяжка: ты чакаеш, чакаеш... Ну і калі ўбачыла нарэшце, то расплакалася.

— У якім раддоме з'явілася на свет Арына?

— У Лаўсанаўскай бальніцы, у Магілёве.

— Да вас ставіліся як да «зорнай» пацыенткі?

— Ну, зразумела, што ўсе ведалі, — прозвішча ж не схаваеш. Праўда, там, здаецца, да ўсіх матуль адносіны выдатныя. Я ніколі не чула, каб на кагосьці крычалі: «Ідзіце, не перашкаджайце, мамаша!»

— Звычайна ўрачы трымаюць у тонусе будучых мам, асабліва, калі справа датычыцца лішняй вагі...

— Мне толькі сказалі, што я крыху перабрала вагу. Падчас цяжарнасці я набрала 26 кілаграмаў. Шчыра кажучы, не думала, што так хутка аднаўлюся і скіну лішняе. Увогуле здавалася, што скінуць гэта нерэальна. Але зараз засталося ўсяго пару кілаграмаў.

— Чаго больш за ўсё баяліся падчас цяжарнасці?

— Зразумела, родаў, як і большасць будучых мам. Здавалася, што я не вытрымаю. Калі мне сказалі, што будзе аперацыя, мне адразу стала лягчэй.

— Вы ўжо змірыліся з тым фактам, што праца мамы — гэта 24 гадзіны ў суткі, без перапынкаў і выхадных?

— Ведаеце, мне вельмі дапамагае мой муж. Я ўжо трэніруюся, і мне не даводзіцца 24 гадзіны ў суткі сядзець дома. Ноччу да Арыны ўстае муж, у мяне ёсць магчымасць выспацца. Што датычыцца бабуль, то мы папрасілі ў першы ж дзень іх не турбавацца. І адна, і другая бабуля ўзялі адпачынкі на працы, і па-чалося... Мы з Алегам папрасілі іх ехаць дадому і вырашылі, што пакуль паспрабуем спраўляцца самастойна.

— Што цяжэй: трэніравацца ці быць мамай?

— Напэўна, быць мамай. Адказнасць непараўнальная.

— Дачка больш падобная на вас ці на мужа?

— Яна мяняецца: калі спачатку была больш падобная на мужа, то зараз ні я, ні Алег не знаходзім у ёй нічога свайго. Але нам кажуць, што ўсё наперадзе.

— Пасля Алімпіяды вы атрымалі кватэру ў Мінску, але вырашылі застацца жыць у Магілёве?

— Па-першае, я так прызвычаілася жыць у Магілёве. Па-другое, тут у нас выдатная база «Алімпіец», дзе нам пабудавалі сучасны сектар для штурханняў.

— Раскажыце гісторыю з «падманутымі дольшчыкамі», якімі вы ледзь не сталі.

— Патрапалі нам нервы нядрэнна. Наш дом паўнны былі здаць яшчэ ў 2008 годзе, але яго дагэтуль яшчэ будуюць. Не ведаю, што там можна будаваць столькі часу? Дом аднапад'ездны на 27 кватэр! Тым больш на тыя сродкі, якія бралі з нас кожны месяц. Не ведаю, куды яны іх укладвалі і зараз укладваюць. Выйсці з гэтага будаўніцтва нам удалося толькі падключыўшы ўсіх, каго можна было: і Міністэрства спорту, і губернатара... Мне так шкада тых людзей, якія будуюць два гэтыя дамы, бо забраць назад свае сродкі вельмі цяжка. У выніку толькі за два дні да таго, як нарадзілася Арына, мы перасяліліся з інтэрната ў кватэру, якую набылі, забраўшы, нарэшце, сродкі з гэтага долевага будаўніцтва.

— Абставіць мэбляй новае жыллё паспелі?

— Разам з Алегам набывалі мэблю і абстаўлялі яшчэ да нараджэння Арыны. Залу абставіць пакуль не паспелі. Я не веру ў прыкметы, і мы з Алегам загадзя набылі ўсё для Арыны: і каляску, і ложачак, і балдахін, і адзенне. Так што яе пакой быў цалкам гатовы і атрымаўся самым прыгожым.

— Вы казалі, што пачалі трэніравацца...

— Так, прычым сёння я ўпершыню пасля перапынку паспрабавала кідаць молат. Трэнер сказаў, што атрымліваецца нават лепш, чым да цяжарнасці. Так што ўсё пайшло на карысць.

— Гэты год вы плануеце прысвяціць толькі трэніроўкам і аднаўленню?

— Хто ведае? Магчыма, удасца падрыхтавацца і выступіць і на сёлетнім чэмпіянаце свету.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

«Натуральны» і «экалагічны» прадукт: ці можна ставіць знак роўнасці?

Ці даводзілася вам бачыць на ўпакоўках спецыяльныя значкі, якія пацвярджаюць экалагічную бяспечнасць /натуральнасць прадуктаў? Гэтае пытанне было адрасаванае ўдзельнікам сацыялагічнага даследавання, якое праводзілася ў рамках партнёрскага праекта «Устойлівае спажыванне для паляпшэння якасці жыцця», які выконваецца беларускімі экалагічнымі арганізацыямі, што ўтвараюць сетку «Зялёнае партнёрства», Беларускім таварыствам абароны спажыўцоў і арганізацыяй з Нідэрландаў Milieukontakt International.

Рэспандэнтам дэманстравалі карткі з выявай маркіровак, а тыя павінны былі ўказаць на маркіроўкі, якія ім сустракаліся, і, па магчымасці, патлумачыць, што яны азначаюць. Самая лепшая распазнавальнасць аказалася ў знака «натуральны прадукт» — яго ведалі больш як 52 працэнты рэспандэнтаў.

Маркіроўка харчовай прадукцыі знакам «натуральны прадукт» была ўведзена ў Беларусі Дзяржстандартам з 1 чэрвеня 2008 года і рэгламентуецца ТКП 126—2008.

— Знак «натуральны прадукт» можа змяшчацца толькі на прадукцыі, выраблена ай з натуральнай сыравіны жывёльнага, раслінная або мінеральнага паходжання без прымянення метадаў геннай інжынерыі і штучных харчовых дабавак, — тлумачыць **начальнік аддзела тэхнічнага нармавання і стандартызацыі харчовай і сельскагаспадарчай прадукцыі Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі Людміла СКОРЫНА**. — Да натуральнай харчовай сыравіны жывёльнага паходжання адносяць прадукты, атрыманыя ад жывёлін, вырашчаных без прымянення антыбіётыкаў, стымулятараў адкорму і гарманальных прэпаратаў, а да натуральнай сыравіны раслінная паходжання — сыравіну, вырашчаную без прымянення стымулятараў росту, пестыцыдаў і метадаў геннай інжынерыі. Такія прадукты адпавядаюць самым жорсткім патрабаванням.

Пітная вада, расфасаваная ў ёмістасці, павінна адпавядаць гігіенічным нарматывам, што прымяняюцца да вады для дзіцячага харчавання. Разліў мінеральных водаў павінен быць непасрэдна на месцы падземных крыніц. Забараняецца транспарціроўка мінеральных вод перад іх разлівам, як не дапускаецца і дадатковая іх апрацоўка. Адна з абавязковых умоў для атрымання знака «натуральны прадукт» — наяўнасць на прадпрыемстве сертыфікаванай сістэмы менеджменту якасці ці бяспечнасці харчовых прадуктаў.

Рашэнне пра атрыманне вытворцам права наносіць знак «натуральны прадукт» прымаецца калегіяльна камісіяй, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі Дзяржстандарта, Міністэрства аховы здароўя, Мінпрыроды, Мінсельгасхарча, канцэрна «Белдзяржхарчпрам» і навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук па харчаванні. Сертыфікат на права маркіроўкі выдаецца тэрмінам на тры гады. Пры прэтэнзіях да якасці — магчымае ануляванне сертыфікату.

«Пакупнікі становяцца ўсё больш адукаваныя і не жадаюць проста слепа давяраць знаку на ўпакоўцы — яны хочуць быць упэўненымі, што іх не падманваюць у чарговы раз».

На сёння права маркіроўкі знакам «натуральны прадукт» атрымалі 66 прадпрыемстваў — ім выдадзены 177 сертыфікатаў (з іх 48 — за 10 месяцаў бягучага года). Самую вялікую групу «натуральных» прадуктаў складаюць малочныя прадукты: малако, кефір, прастакваша, смятана, тварог, сыр, масла. Ёсць сярод уладальнікаў такой маркіроўкі таксама мясныя паўфабрыкаты, пельмені, кансервы для дзіцячага харчавання (пюрэ, сокі, нектары), хлебабулачныя вырабы, вада, соль, яйкі і нават марожанае і шакалад.

Прайшоў пэўны час, пакуль спажыўцы не пачалі, нарэшце, заўважаць «зялёную кропку». У Магілёве ў гандлёвых арганізацыях сталі з'яўляцца так званыя «экалагічныя паліцы» або «экалагічныя куткі». Калі была створана першая экалагічная паліца, гаспадарам магазіна даводзілася літаральна кожную гадзіну папаўняць гандлёвы прылавак прадукцыяй са знакам «натуральны прадукт», бо тая вельмі добра раскуплялася — адна справа «шукаць» натуральныя прадукты сярод іншага разнастайнага асартыменту тавараў, і зусім іншая — знайсці ўсё патрэбнае на адной паліцы. Акрамя таго, побач ляжалі буклеты, лістоўкі і каляндарыкі з карыснай інфармацыяй для спажыўцоў. Сапраўдным энтузіястам у справе стварэння экалагічных паліц стала рознічная гандлёвая сетка Магілёўскага аддзялення Беларускай чыгункі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Аднак, на думку прадстаўнікоў грамадскіх экалагічных арганізацый і спажывецкай грамадскасці, нягледзячы на вонкавую «экалагічнасць» знака «натуральны прадукт» патрабаванні да прадукцыі, якая можа на яго прэтэндаваць, размерна мяккія ў параўнанні з іншымі экалагічнымі маркіроўкамі.

— Адразу скажу, што мы горача падтрымліваем з'яўленне на нашым рынку натуральных прадуктаў, аднак не можам не бачыць і слабых месцаў у працэдуры прысваення новай маркіроўкі, — тлумачыць сваю пазіцыю старшыня Магілёўскага экалагічнага грамадскага аб'яднання «ЭНДА», эксперт праекта ЕС/ПРААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» Андрэй ПАХОМЕНКА. — Па-першае, працэдура прысваення сертыфікату — непразрыстая, мы ўпэўненыя, што ў камісію абавязкова павінны ўваходзіць хоць бы ў ролі назіральнікаў прадстаўнікі экалагічных арганізацый і арганізацый, якія займаюцца аховай правоў спажыўцоў. Пакупнікі становяцца ўсё больш адукаваныя і не жадаюць проста слепа давяраць знаку на ўпакоўцы — яны хочуць быць упэўненымі, што іх не падманваюць у чарговы раз. Я прывяду толькі некалькі цытат спажыўцоў з інтэрнэт-форумаў...

«Што мяне ўразіла, так гэта прысутнасць знака «натуральны прадукт» на ўпакоўцы Тэтра Брык Асептык з малаком пітным стэрылізаваным і тэрмінам прыдатнасці 6 месяцаў. Гэта значыць, першапачаткова натуральны прадукт запакоўваюць у асептычную ўпакоўку, і ніхто мяне не пераканае, што малако тэрмінам паўгода — натуральны прадукт. Ды нас у чарговы раз дураць!»

«Дзіўна, але марожанае «Пламбір класічны з водарам ванілі» таксама, аказваецца, натуральны прадукт???»

«Нядаўна заўважыла, што на гандлёвай марцы «Пятруха» стаіць знак «Натуральны прадукт». Калі шчыра, то для мяне заўсёды курыца асацыявалася з гармонамі і гэтак далей. Аказваецца, ёсць у нас і натуральная прадукцыя. Хацелася б, каб гэта адпавядала рэчаіснасці...»

— Прызнаёмся, у нас таксама ёсць шэраг пытанняў. Напрыклад, ці можна лічыць натуральным прадуктам малако, атрыманае ад каровы, якая сілкавалася кормам з поля, дзе праводзілася апрацоўка кукурузных пасеваў пестыцыдамі або праводзілася пратраўліванне насення перад пасевам? — дадаў Андрэй Пахоменка. — Калі морква вырошчвалася непадалёку ад хімічнай вытворчасці, але пры гэтым не апрацоўвалася пестыцыдамі, ці можна аднесці такую гародніну да «натуральных прадуктаў»? Ці можна на соку з яблык, што збіраліся ў насельніцтва, пісаць «натуральны прадукт»? Мы мяркуем, што для прысваення знака «натуральны прадукт» яблычнаму соку трэба ведаць, ці выкарыстоўваліся ў працэсе пасадкі саду і пазней стымулятары росту і пестыцыды, ці ўтрымліваюцца ў глебе, на якой расце сад, пестыцыды ці іншая «хімія»?

Калі была створана першая экалагічная паліца, гаспадарам магазіна даводзілася літаральна кожную гадзіну папаўняць гандлёвы прылавак прадукцыяй са знакам «натуральны прадукт»...

Адсутнасць у вытворчым працэсе антыбіётыкаў, стымулятараў адкорму, гарманальных прэпаратаў, стымулятараў росту, пестыцыдаў, метадаў геннай інжынерыі павінна пацвярджацца дакументальна, напрыклад, шляхам аналізу бухгалтарскай дакументацыі. Акрамя таго, калі на адным і тым жа прадпрыемстве вырабляюцца два віды прадукцыі, якая нязначна адрозніваецца адна ад адной (натуральнай і «ненатуральнай»), то ёсць верагоднасць для спекуляцый. І гэта выклікае ў пакупніка недавер не толькі да прадукцыі, але і да маркіроўкі.

На сённяшні дзень згодна з ТКП 126—2008 у дэкларацыі, падпісанай кіраўніком арганізацыі, заяўнік павінен гарантаваць, што пры вытворчасці харчовых прадуктаў выкарыстоўвалася сыравіна, атрыманая без прымянення пестыцыдаў, антыбіётыкаў, стымулятараў росту раслін і адкорму жывёлін, гарманальных прэпаратаў і генетычна мадыфікаваных арганізмаў. **Аднак эколагаў выключна дэкларатыўны прынцып не задавальняе. Няўжо ў нашай краіне шмат гаспадарак, якія цалкам адмовіліся ад антыбіётыкаў і пестыцыдаў?**

— Вы можаце сумнявацца, гэта ваша права, — парыруе Людміла Скорына, — але я ўпэўнена, што ветэрынар ці інспектар па раслінаводстве, які выдае даведку аб чысціні сыравіны, нясе адказнасць за свой подпіс. І паколькі сертыфікацыя добраахвотная, то поўную адказнасць за праўдзівасць усіх звестак нясе непасрэдна вытворца харчовых тавараў.

Людміла Скорына канстатавала, што да экалагічнага земляробства беларусы яшчэ не дайшлі. Хоць у многіх еўрапейскіх краінах, і нават у суседняй Літве экалагічнае земляробства сёння актыўна развіваецца. У Еўрасаюзе для экалагічнага земляробства створана прававая база. Дарэчы, у Літве ёсць «экалагічныя прадукты» і «прадукты выключнай якасці». Першыя атрымліваюцца ў фермерскіх гаспадарках, якія практыкуюць экалагічнае земляробства. У беларускай стандартызацыі паняцце «экалагічна чысты прадукт» пакуль адсутнічае. Таму тавары са знакам «натуральны прадукт» можна аднесці да прадуктаў палепшанай якасці. Магчыма, гэта пераходная стадыя ад звычайных да экалагічна чыстых прадуктаў.

Трэба дадаць, што саміх вытворцаў недавер з боку эколагаў і спажыўцоў да іх прадукцыі крыўдзіць.

— У нас распрацаваныя схемы хімкантролю і біялагічнага кантролю ўсёй сыравіны, якая паступае на прадпрыемства, — запэўнівае **інжынер па якасці ААТ «Бабулін гладыш» Юлія ГУЗКОВА**. — Таксама мы праводзім аўдыты на фермах і ў гаспадарках, якія пастаўляюць нам сыравіну, выязджаем з прадстаўнікамі гарвыканкама і аблвыканкама. Кожны тыдзень нам прадастаўляецца даведка аб здароўі статку. Акрамя таго, на прадпрыемстве ў нас ёсць свой ветурач, які адсочвае чысцюню сыравіны і паказчыкі бяспечнасці гатовай прадукцыі. І калі да нас трапляе малако з антыбіётыкамі, то можаце не сумнявацца, што мы вяртаем яго пастаўшчыку.

А вось ААТ «Савушкін прадукт», якое адным з першым паклапацілася пра атрыманне права на маркіроўку «натуральны прадукт», добраахвотна ад гэтай маркіроўкі адмовілася: пакупнікі ўжо заўважылі, што «зялёная кропка» знікла з упаковак любімых тавараў. Але гэта зусім не азначае, што пагоршылася іх якасць. Прычына, як высветлілася, заключаецца ў тым, што ў Расіі, куды экспартуецца «львіная доля» прадукцыі брэсцкіх вытворцаў, беларускую маркіроўку «натуральны прадукт» не прызнаюць. Там ёсць свае экалагічныя знакі, якія адпавядаюць міжнародным стандартам. І пакуль падыходы да маркіроўкі «натуральных прадуктаў» у Беларусі і Расіі не будуць узгодненыя, «Савушкін прадукт» не вернецца да «зялёнай кропкі».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Спорт-тайм

БАТЭ разграміла сталічнае «Дынама»

У панядзелак увечары адбыўся цэнтральны матч 31 тура па футболе паміж барысаўскім БАТЭ і мінскім «Дынама». Гульня была цэнтральнай у туры, бо вырашала як медальныя спадзяванні дынамаўцаў, так і вызначала імкненні да золата БАТЭ. Бо зразумела, што салігорскі «Шахцёр», забяспечыўшы «серабро», спыняцца не збіраецца. Сталічнаму «Дынама», у сваю чаргу, трэба дагнаць і перагнаць «Мінск», які пакуль на трэцім месцы. БАТЭ дамінавала на полі і ў першым тайме вяло 2:0. Столькі ж было забіта ў вароты «бела-блакітных» у другім тайме. У выніку — разгром 4:0.

А салігорскі «Шахцёр» перайграў у суботу «Мінск» з лікам 2:1 і забяспечыў сабе сярэбраныя медалі. «Партызан» пацярпеў чарговае, ужо 20-е ў чэмпіянаце, паражэнне. На гэты раз «Віцебску» — 0:1. «Партызан» па-ранейшаму замыкае турнірную табліцу. На перадапошняе месца перамясцілася жодзінскае «Тарпеда», якое саступіла ў гасцях брэсцкаму «Дынама» — 1:3. Як вядома, каманда, якая стане перадапошняй, будзе змагацца за права застацца ў вышэйшай лізе ў пераходных матчах з другой камандай першай лігі. Цяпер гродзенскі «Нёман» на тры ачкі апярэджвае «Тарпеда». У апошнім туры гродзенцы ўзялі верх над бабруйскай «Белшынай» — 2:0. Яшчэ ў адным матчы магілёўскі «Днепр» у Наваполацку перайграў «Нафтан» з лікам 2:1.

КХЛ: «Дынама» перайграла «Віцязь»

Мінскае «Дынама» завяршыла серыю выязных матчаў перад невялікім перапынкам у чэмпіянаце КХЛ. У нядзелю нашы хакеісты выйгралі па булітах (5:4) у «Віцязя» з падмаскоўнага Чэхава, які займае апошняе месца ў Заходняй канферэнцыі. Праўда, у пяці апошніх матчах клуб з Падмаскоўя атрымаў чатыры перамогі. Шайбы ў «Дынама» закінулі Міхалёў, Петрашак, Дзямагін і Мялешка, а пасляматчавыя буліты рэалізавалі Мялешка і Плат.

Мінскае «Дынама» цяпер займае пятае месца сярод 11 каманд Заходняй канферэнцыі. А ў дывізіёне Тарасава знаходзіцца на трэцяй пазіцыі — пасля яраслаўскага «Лакаматыва» і чарапавецкай «Поўначсталі» і апярэджвае ніжагародскае «Тарпеда», мыцішчанскі «Атлант» і чэхаўскі «Віцязь». У 25 паядынках наша каманда набрала 40 ачкоў, а гэта 14 перамог і 11 паражэнняў. Нагадаем, што ў плэй-оф выходзяць па восем лепшых каманд з кожнай канферэнцыі.

Карстэн толькі другая

Двухразовая алімпійская чэмпіёнка і шасціразовая чэмпіёнка свету па акадэмічным веславанні Кацярына Карстэн на чэмпіянаце свету ў новазеландскім Карапіра на гэты раз заняла другое месца.

У фінале на 2000 метраў беларуска саступіла на фінішы ўсяго 0,18 секунды пераможцы Фрыдзе Свенсан са Швецыі. Спачатку Кацярына Карстэн ішла па дыстанцыі трэцяй, але перагнала суперніцу і адзнаку ў 1500 метраў пераадолела другой. Але перагнаць Свенсан, якая ўсю дыстанцыю была першай, так і не паспела.

СВЯТКАВАЛІ Ў ЛЕСЕ — СА СТРЭЛЬБАМІ

У святочны дзень 7 лістапада трое жыхароў Баранавічаў вырашылі пайсці на паляванне. Стрэльбы ў іх былі, а вось ліцэнзій яны не мелі.

У лесе каля в. Судары браканьеры застрэлілі двух дзікоў і дзвюх еўрапейскіх казуль. Пры вобыску ў іх былі канфіскаваныя стрэльбы, боепрыпасы і тушы жывёл. Страты, нанесеныя прыродзе, склалі 8 млн рублёў. Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Фокус

ВОБРАЗ МІЛІЦЫЯНЕРА-КОМІКА ЗА ГРОШЫ МІНКУЛЬТА

НАРЭШЦЕ трапіў на скандальную пастаноўку Сучаснага мастацкага тэатра «Мінск, я люблю цябе». Кранальнае каханне, эротыка, хуліганская лексіка, тэлевядоўцы Люся Лушчык і Яўген Булка ў топавых ролях, міліцыянер-комік...

Цікава, што грошы на пастаноўку выдаткавала Міністэрства культуры. І вынік атрымаўся ўзбуджальным.

Калі даведаўся пра пастаноўку «Мінск, я люблю цябе», падумаў: і спектакль пагляджу, і артыкул разгромны ў газету ціскану.

Але на разнастайных форумах пастаноўку здорава пясочылі: «Тое не так, гэта не гэтак, палітыкі зашмат, акцёрам не веру і гэтак далей».

«Значыць, спектакль дакладна варты ўвагі», — падумаў я і паехаў у канцэртную залу «Мінск», дзе Сучасны мастацкі тэатр арандуе адно з памяшканняў.

На маё дзіва, зала ў 250 чалавек была амаль запоўненая, я ўзяў апошні білет за 25 тысяч рублёў.

— Так сварацца на гэты спектакль, што мама дарагая! — абмяркоўвалі дзве сяброўкі, якія ўзялі білеты побач са мной. — Такую рэкламу гэтай сваркай зрабілі, што нельга не прыйсці.

Святло згасла, і на сцэне з'явіўся той самы вядоўца Яўген Булка ў вобразе бронзавага помніка...

Пасля спектакля я даведаўся, што дырэктара Сучаснага мастацкага тэатра Канстанціна Ушакова неяк запрасілі на шоу «Наша раніца». Вядоўца Яўген Булка меў неасцярожнасць спытацца:

— А ці мог бы ў вашым тэатры іграць звычайны чалавек, а не прафесійны акцёр?

— Мог бы, збірай чамаданы і прыходзь! — адказаў дырэктар.

Булка для адвагі прыхапіў з сабой Люсю Лушчык. І абое, як аказалася, без праблем уліліся ў кампанію прафесійных акцёраў. Пры гэтым зарабляюць вядоўцы нароўні з іншымі акцёрамі (па 100 тысяч рублёў за спектакль, нягуста). Атрымліваецца, іграюць «за ідэю».

Пастаноўка складаецца з трох камедый.

У першай «Мінск. Live» — Помнік Яўгена Булкі даводзіць менеджару з Масквы, што галоўнае ў жыцці не грошы, а каханне. Масквіч раззлаваўся, ляснуў помніку па рэбрах і зламаў руку. Нясцерпны боль змяніў прырытэты ў светапоглядзе менеджара.

Драматург Андрэй Курэйчык стаў першым беларускім літаратарам, які паразважаў на тэму: у чым перавага размеранага мінскага ладу жыцця ў параўнанні з бурлівымі мегаполісамі, як, напрыклад, Масква.

У другой камедыі («Вяселля не будзе») міліцыянер, які прыехаў працаваць у сталіцу з вёскі, затрымлівае мінскага праграміста, які пераходзіць дарогу на чырвонае святло:

— Ах ты сталічная канхвета! — пярэчыць старшы лейтэнант праграмісту, які ў дадатак да ўсяго спазняецца на ўласнае вяселле.

У канцы камедыі нявеста пазнае ў міліцыянеры аднавяскоўца Мішку Крайко, сваё першае каханне. Вяселле з праграмістам адмянілася.

«Узгадай сябе сперматазоідам»

У пастаноўцы хапае яркіх псіхалагічных пасажаў. Напрыклад, гераіня камедыі «Вяселля не будзе» Стэла эфектна даводзіць сваёй сяброўцы Надзі, чаму не варта лічыць сябе няўдачніцай:

— Часам здаецца, што жыццё праходзіць міма нас. Паступаючы ў інстытут сваёй мары, мы пралятаем, як фанера над Парыжам. Таму што ў конкурсе абітурыентаў — 10 чалавек на месца. Сярод пяці прэтэндэнтаў на жаданую вакансію зноўку выбіраюць іншага. І нават твой уцякае з вяселля. Мы ўсе часам адчуваем сябе няўдачнікамі. Але ўзгадай сябе сперматазоідам. Аднойчы мы ўжо былі вельмі паспяховымі і прайшлі неверагодны кастынг, калі абагналі мільёны іншых сперматазоідаў і дасягнулі адной-адзінай яйцаклеткі.

Ці яшчэ адзін забаўны механізм жаночай псіхалогіі. Нявеста Надзейка плача, бо на вяселле не з'явіўся яе жаніх Жэнечка. Сяброўка Стэла на чым свет стаіць бэсціць жаніха-уцекача: «Сволач, гад!»

Раптам нявеста павесялела і ад задавальнення затупала ножкамі:

— А ты лухту кажаш! Можа, ён у рэанімацыі ляжыць, можа, яго машына збіла...

У трэцюю камедыю («Самы чысты горад») да забаўляльнага сюжэту дадаецца і цікавая харэаграфія.

Нагадаю, што грошы на пастаноўку выдаткавала Міністэрства культуры (каля 50 мільёнаў рублёў). Нягледзячы на дзяржаўны след, рэжысёры і драматургі не абмяжоўвалі сябе жорсткай цэнзурай: у спектаклі сустракаюцца аж тры міліцыянеры-комікі, гей з Аляксандраўскага сквера, дзве медсястры, якія не супраць закласці за каўнер, і іншыя некласічныя персанажы. Спектакль адначасова і забаўляе, і прасякнуты навацарскімі ідэямі кшталту «як зрабіць лепшай якасць свайго жыцця?»

У пастаноўцы задзейнічана новае пакаленне беларускіх акцёраў: Ілона Галыніна, Паліна Сыркіна, Максім Брагінец, Аляксандр Гіранок. Каларытныя хлопцы і дзяўчаты! Па працы меў інтэрв'ю з многімі расійскімі акцёрамі, напрыклад, з Сяргеем Бязрукавым. Лічу, што патэнцыйна наша моладзь можа многім даць прыкурыць. Ім бы даць магчымасць раскруціцца.

«Мінск, я люблю цябе» не мае прэтэнзіі на неверагодны псіхалагізм ці класічную неўміручасць. Месцамі сюжэт трошкі зацягваецца. Але ў цэлым пастаноўка выглядае годна. Я даю тры пальцы на адсячэнне, калі выкарыстаць у кіно гэтых жа акцёраў, аўтараў, укласці грошы і запрасіць добрага кінарэжысёра (скажам, Андрэя Кудзіненку), мы атрымаем першы беларускі серыял-блокбастар. Асэнсаванне такой магчымасці пакінула ўва мне надзвычай цёплае ўражанне.

Яўген ВАЛОШЫН.
Фота Андрэя ДАВЫДЧЫКА.

Што зацікавіць гурманаў?

Па-першае, драматургі Андрэй Курэйчык і Дзіяна Балыка бязбоязна выкарыстоўваюць прыём білінгвізму — спалучэнне беларускай і рускай моў у межах адной пастаноўкі. Акурат як Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч у сваёй «ІдылІі». Праўда, сучасныя драматургі пракалоліся на тым, што беларускую мову яны ўкладаюць у вусны маладым вясковым жыхарам. А гэта састарэлыя тэндэнцыі. Сёння беларуская мова робіцца гарадской, элітнай. У вёсках жа і аграгарадках яе, літаратурную, могуць і не зразумець.

Другая асаблівасць: драматургі не пабаяліся зрабіць пастаноўку забаўляльнай, папсовай. І гэта нармальны прыём. Як інакш прыцягнуць у залу гледача, разбэшчанага галівудскім і расійскім кіно? Дык вось Сучаснаму мастацкаму тэатру гэта ўдаецца. Пры гэтым наяўнасць філасофскіх думак выратоўвае на першы погляд легкадумную пастаноўку.

РЭГІСТРАЦЫЯ І ПАДАТАК

Сын, студэнт БДУ, жыве ў інтэрнаце. Мой брат, які жыве ў Мінску, прапісаў яго ў сваю кватэру. Ад атрымання якога-небудзь ўзнагароджання (аплаты) брат катэгарычна адмовіўся. А гэта значыць, што даходу за прапіску пляменніка ён не атрымоўвае. Ці абавязаны брат плаціць падаходны падатак? Ці можна налічваць падаходны падатак пры адсутнасці даходу?

Б.Л., *Гродзенская вобласць.*

Інстытут прапіскі на цяперашні час не існуе. Ёсць рэгістрацыя грамадзян па месцы жыхарства або рэгістрацыя па месцы знаходжання.

Рэгістрацыя грамадзян уведзеная Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7.09.2007 г. № 413. Згодна з Палажэннем аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання, якое было зацверджана гэтым Указам (далей — Палажэнне), пад месцам жыхарства разумеецца месцазнаходжанне жылога памяшкання, права валодання, распараджэння або карыстання якім узнікла ў грамадзяніна на падставах, устаноўленых заканадаўствам, і ў якім ён пастаянна або пераважна пражывае. Месца знаходжання адрозніваецца ад месца жыхарства тым, што там грамадзянін прабывае часова.

Такім чынам, рэгістрацыя цесна звязаная з правам на памяшканне, у якім адбываецца рэгістрацыя, і з тым, пастаянна ці часова грамадзянін будзе там пражываць.

Пералік дакументаў, якія пацвярджаюць правы на памяшканне і якія павінны прадстаўляцца ў орган рэгістрацыі, устаноўлены названым вышэй Палажэннем.

Так, напрыклад, у выпадку рэгістрацыі грамадзяніна ў памяшканні, якое знаходзіцца ў яго карыстанні згодна з дагаворам найму, падставай для рэгістрацыі з'яўляецца дагавор найму, заключаны ва ўстаноўленым парадку паміж уладальнікам кватэры і грамадзянінам, які ў ёй рэгіструецца.

Абавязак плаціць падаходны падатак, у тым ліку з даходаў, атрыманых ад здачы жылых памяшканняў, устаноўлены Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь, а таксама Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4.08.2006 г. № 497 «Аб уплаце падаходнага падатку ў фіксаваных сумах». Апошнім устаноўлена, што даходы фізічных асоб, якія яны атрымліваюць ад здачы ў арэнду, наём (паднаём) жылых памяшканняў і якія не перавышаюць памеры, устаноўленыя гэтым Указам, падлягаюць абкладанню падаходным падаткам у межах ставак, згодна з дадаткам.

Атрымлівае грамадзянін даходы ці не, вызначаецца на падставе дакументаў, якімі аформленыя ўзаемаадносіны бакоў — асобы, якая прадастаўляе памяшканне ў карыстанне, і асобы, якая атрымлівае права на карыстанне гэтым памяшканнем.

Як устаноўлена Указам № 497, фізічныя асобы, для якіх дзейнасць па здачы жылых памяшканняў не з'яўляецца прадпрымальніцкай, павінны да наступлення тэрміну фактычнага прадастаўлення такіх памяшканняў у наём заключыць дагавор па форме, якую ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, і зарэгістраваць яго ў мясцовым выканаўчым і распарадчым органе або (калі памяшканне адносіцца да дзяржаўнага жыллёвага фонду) у арганізацыі, што ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду.

Орган, які рэгіструе дагавор, на працягу пяці дзён з даты рэгістрацыі накіроўвае яго копію ў падатковы орган па месцы рэгістрацыі фізічнай асобы.

Форма дагавора ўстаноўленая пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12.09.2006 г. № 1191 «Аб мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2006 г. № 497». Згодна з зацверджанай формай, гэты дагавор не прадугледжвае бязвыплатных адносін паміж бакамі.

Указам № 497 у падпункце 1.7 пункта 1 устаноўлена, што незаканвае ўстаноўленай заканадаўствам формы дагавора не вызваляе грамадзяніна, што здаў памяшканне, ад абавязку па ўплаце фіксаваных сум падаходнага падатку.

Такім чынам, паколькі адносіны дзядзькі і пляменніка аформленыя дагаворам найму, то падатак плаціць усё ж давядзецца. Для таго, каб на будучае прывесці ўзаемаадносіны паміж імі ў адпавядаць з тымі, якія існуюць фактычна, і не плаціць падатак, яны могуць заключыць дагавор бязвыплатнага карыстання жылым памяшканнем, дамову аб скасаванні першага дагавора і прадставіць копіі гэтых дакументаў па месцы, дзе быў зарэгістраваны першы дагавор, і ў падатковую інспекцыю.

РАЗБІЛІ БУТЭЛЬКУ НА ГАЛАВЕ

25-гадовага мужчыны двое незнаёмых грамадзян. Яны напалі сярод белага дня і забралі 4500 расійскіх рублёў. Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, па гарачых слядах высветлена, што рабаванне здзейснілі жыхары Гомеля — адзін 17-гадовы, другі — 24-гадовы. Абодва стаяць на ўліку ў міліцыі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПОПЫТ НА БУЛЬБУ Ў... ЗЛАДЗЕЯЎ

Калі на бульбу цана падняласЯ, то ў зладзеяў вырас попыт на яе.

У жыхаркі хутара Язвішча, што ў Лунінецкім раёне, невядомыя выкралі 320 кг бульбы. А ў пенсіянеркі з в. Выжловічы (Пінскі раён) нехта вынес са склепа 450 кг «разварыстай». Найбольшыя страты панесла ААТ «Айчына» з Пружанскага раёна. Са склада ў в. Кабылоўка выкралі 1300 кг бульбы. Зладзеяў затрымалі толькі ў апошнім выпадку. Імі аказаліся трое работнікаў ААТ і адзін беспрацоўны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ВЫБУХУ НЕ БУДЗ

У сувязі са змяншэннем пасажырапатоку ў асенне-зімні перыяд устанаўліваецца наступны расклад руху прыгарадных цягнікоў

РАСКЛАД РУХУ ЭЛЕКТРАЦЯГНІКОЎ з 12 лістапада 2010 года

НА БРЭСТ

СКРАЗНЫЯ ЗНОСІНЫ

— эл.ц. **Асіповічы—Брэст**, адпраўленнем са ст. Асіповічы ў **07.41**, Мінск-Пас. **09.32—09.51**, прыбыццё на ст. Брэст **16.38 (штодзень).**

— эл.ц. **Асіповічы—Баранавічы**, адпраўленнем са ст. Асіповічы ў **16.43**, Мінск-Пас. **18.51—19.10**, прыбыццё на ст. Баранавічы ў **22.00 (штодзень).**

— эл.ц. **Асіповічы—Стоўбцы**, адпраўленнем са ст. Асіповічы ў **20.56**, Мінск-Пас. **22.48—22.56**, прыбыццё на ст. Стоўбцы ў **00.26 (штодзень).**

— эл.ц. **Барысаў—Баранавічы**, адпраўленнем са ст. Барысаў у **05.39**, Інстытут Культуры **07.18—07.25**, прыбыццё на ст. Баранавічы ў **10.06 (штодзень).**

— эл.ц. **Асіповічы—Баранавічы**, адпраўленнем са ст. Асіповічы ў **14.51**, Інстытут Культуры **17.01—17.11**, прыбыццё на ст. Баранавічы ў **20.05 (штодзень).**

— эл.ц. **Барысаў—Баранавічы**, адпраўленнем са ст. Барысаў у **12.10**, Інстытут Культуры **13.49—13.56**, прыбыццё на ст. Баранавічы ў **16.40 (па выхадных днях).**

— эл.ц. **Смалявічы-Койданава**, адпраўленнем са ст. Смалявічы ў **08.17**, Мінск-Пас. **09.27—09.22**, прыбыццё на ст. Койданава ў **10.15 (штодзень)**.

Інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтым электрацягнікам пазначаная ў прыведзенай ніжэй табліцы.

Адпраўленне са станцыі МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Маршрут	Час адпраўлення са станцыі Мінск-Пасажырскі	Прыбыццё на канцавую станцыю	Дні	Прыпынкі
Баранавічы (паскораны)	4-25	6-59	штодз.	б/п Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Дзяржынск, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды
Стоўбцы	8-01	9-54	штодз.	усюды
Койданава	9-22	10-15	штодз.	усюды
Брэст	9-51	16-38	штодз.	усюды
Баранавічы (паскораны)	15-42	17-48	штодз.	з прыпынкамі па п.п. Курасоўшчына, ст. Фаніпаль, Койданава, Дзяржынск, Негарэлае, Энергетык, Коласава, Стоўбцы, Гарадзея, Пост № 1
Брэст	16-17	22-54	штодз.	б/п Асіна, Мезінаўка, Кучкуны
Негарэлае	16-41	17-43	штодз.	б/п Дзяржынск, Клыпаўшчына
Баранавічы (паскораны)	17-37	19-21	нядз.	з прыпынкамі па Курасоўшчына, Рошча, Пост № 1
Брэст (паскораны)	17-37	21-56	пятн.	З прыпынкамі па п.п. Курасоўшчына, Рошча, Баранавічы-Цэнтр, далей — па станцыях і п.п.Бяроза-горад, Цукровы завод
Стоўбцы	17-44	19-24	штодз.	усюды
Стоўбцы	18-25	20-11	штодз.	усюды
Баранавічы	19-10	22-00	штодз.	усюды
Баранавічы	20-20	23-12	штодз.	б/п Сіняво, Асіпоўшчына, Ліпа, Юшкевічы, Перамога, Крошына
Стоўбцы	22-56	0-26	штодз.	б/п Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Ц.Ляды

Адпраўленне з п.п. Інстытут Культуры

Маршрут	Адпраўленне з п.п. Інстытут Культуры	Прыбыццё на канцавую станцыю	Дні	Прыпынкі
Брэст (паскораны)	0-56	7-33	штодз.	б/п п.п. Рошча, Пціч, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Клыпаўшчына, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Ц.Ляды, Сіняво, Асіпоўшчына, Варацішча, Ліпа, Хвоева, Пагарэльцы, Юшкевічы, Перамога, Крошына, Пост №1
Стоўбцы	5-52	7-29	штодз.	усюды
Стоўбцы	7-02	8-38	штодз.	усюды
Баранавічы	7-25	10-06	штодз.	б/п п.п. Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны
Стоўбцы	8-53	10-27	штодз.	усюды
Баранавічы (паскораны)	9-08	11-31	вых.	б/п Воўчкавічы, Пяцігор'е, Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Сіняво, Асіпоўшчына, Варацішча, Ліпа, Хвоева, Юшкевічы, Перамога, Крошына
Стоўбцы	10-27	12-01	суб.	усюды
Брэст	11-52	18-45	штодз.	усюды
Баранавічы	13-56	16-40	штодз.	усюды
Стоўбцы	14-42	16-31	рабоч.	усюды
Гарадзея	14-42	16-57	вых.	усюды
Стоўбцы	16-09	17-44	пят. нядз.	усюды
Баранавічы	17-11	20-05	штодз.	б/п Асіна, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Юшкевічы
Стоўбцы	21-49	23-29	штодз.	усюды

З БРЭСТА, БАРАНАВІЧ, СТОЎБЦАЎ

СКРАЗНЫЯ ЗНОСІНЫ

— эл.ц. **Стоўбцы—Асіповічы**, адпраўленнем са ст. Стоўбцы ў **17.39**, Мінск-Пас. **19.19—19.28**, прыбыццё на ст. Асіповічы ў **21.39 (па рабочых днях).**

— эл.ц. **Гарадзея—Асіповічы**, адпраўленне са ст. Гарадзея ў **17.17**, Мнск-Пас. **19.19—19.28**, прыбыццё на ст. Асіповічы ў **21.39 (па выхадных днях).**

— эл.ц. **Стоўбцы—Асіповічы**, адпраўленнем са ст. Стоўбцы ў **20.46**, Інстытут Культуры **22.29—22.35**, прыбыццё на ст. Асіповічы ў **00.29 (штодзень).**

— эл.ц. **Стоўбцы—Барысаў**, адпраўленнем са ст. Стоўбцы ў **06.27**, Інстытут Культуры **08.17—08.37**, прыбыццё на ст. Барысаў у **10.21 (па рабочых днях).**

— эл.ц. **Негарэлае—Смалявічы**, адпраўленнем са ст. Негарэлае ў **17.55**, Мінск-Пас. **19.00—19.07**, прыбыццё на ст. Смалявічы ў **19.58 (штодзень).**

— эл.ц. **Стоўбцы—Смалявічы**, адпраўленнем са ст. Стоўбцы ў **05.22**, Інстытут Культуры **06.58—07.04**, прыбыццё на ст. Смалявічы ў **07.53 (штодзень).**

Інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтым электрацягнікам пазначаная ў прыведзенай ніжэй табліцы.

Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Пачатковая станцыя	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на станцыю Мінск-Пасажырскі	Дні	Прыпынкі
Стоўбцы	4-42	7-38	штодз.	б/п Пост № 1, Ц.Ляды, Кучкуны, Мезінаўка, Асіна
Баранавічы	6-36	8-52	штодз.	з прыпынкамі па п.п. Пост № 1, Хвоева, Гарадзея, Стоўбцы, Коласава, п.п. Энергетык, Негарэлае, Дзяржынск, Койданава, Фаніпаль, Памыслішча, Рошча, п.п. Курасоўшчына
Койданава	10-45	11-38	штодз.	усюды
Брэст (паскораны)	6-50	13-00	штодз. хуткі	да ст. Баранавічы ўсюды далей з пр. Пост № 1, Крошына, Перамога, Пагарэльцы, Гарадзея, Стоўбцы, Коласава, Энергетык, Негарэлае, Койданава, Фаніпаль, Курасоўшчына
Стоўбцы	11-46	13-26	штодз.	усюды
Стоўбцы	15-15	17-05	штодз.	усюды
Баранавічы	15-06	17-54	штодз.	усюды
Негарэлае	17-55	19-00	штодз.	б/п Клыпаўшчына, Дзяржынск
Стоўбцы	17-39	19-19	рабоч.	усюды
Гарадзея	17-17	19-19	вых.	б/п Варацішча, Асіпоўшчына, Сіняво
Баранавічы	17-30	20-30	штодз.	усюды

Прыбыццё на п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Пачатковая станцыя	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на п.п. Інстытут Культуры	Дні	Прыпынкі
Стоўбцы	4-15	5-51	штодз.	усюды
Стоўбцы	5-05	6-41	штодз.	усюды
Стоўбцы	5-22	6-58	штодз.	усюды
Стоўбцы	6-27	8-17	рабоч.	усюды
Стоўбцы	8-18	9-54	штодз.	усюды
Баранавічы	7-32	10-18	штодз.	усюды
Баранавічы	8-15	11-01	штодз.	б/п Варацішча, Асіпоўшчына, Сіняво, Кучкуны, Атцэда, Мезінаўка, Асіна, Рошча
Стоўбцы	10-44	12-20	штодз.	усюды
Стоўбцы	13-02	14-21	вых.	б/п Ц.Ляды, Кучкуны, Атцэда, Мезінаўка, Асіна, Станькава, Пяцігор'е, Бярэжа, Пціч
Брэст	8-35	15-33	штодз.	усюды
Баранавічы (паскораны)	14-09	16-23	вых.	б/п Пост № 1, Крошына, Юшкевічы, Ліпа, Варацішча, Асіпоўшчына, Сінява, Ц.Ляды, Кучкуны, Атцэда, Мезінаўка, Асіна, Клыпаўшчына, Станькава, Пяцігор'е, Бярэжа, Пціч
Брэст	12-07	18-44	штодз.	б/п Юшкевічы, Ліпа, Асіпоўшчына, Сінява, Кучкуны, Атцэда, Мезінаўка
Стоўбцы	18-33	20-09	вых.	усюды
Стоўбцы	19-46	21-18	штодз.	усюды
Баранавічы (паскораны)	19-37	21-48	нядз.	б/п Пост № 1, Крошына, Перамога, Юшкевічы, Хвоева, Ліпа, Варацішча, Асіпоўшчына, Сінява, Ц.Ляды, Кучкуны, Атцэда, Коласава, Мезінаўка,Асіна, Клыпаўшчына, Станькава, Пяцігор'е, Бярэжа, Воўчкавічы, Пціч, Памыслішча
Стоўбцы	20-46	22-29	штодз.	усюды
Баранавічы	20-31	23-05	штодз.	б/п Кучкуны, Атцэда, Мезінаўка, Асіна
Брэст	18-21	23-58	штодз.	да ст.Баранавічы — усюды, далей з прыпынкамі Гарадзея, Стоўбцы, Коласава, Негарэлае, Койданава, Фаніпаль, Памыслішча, Рошча, Курасоўшчына

З МАЛАДЗЕЧНА

СКРАЗНЫЯ ЗНОСІНЫ — эл.ц. **Маладзечна—Асіповічы**, адпраўленнем са ст. Маладзечна ў **06.26**, Мінск-Пас. **08.20—08.36**, прыбыццё на ст. Асіповічы ў **10.51 (штодзень)**.

Інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтаму электрацягніку пазначаная ў прыведзенай ніжэй табліцы.

Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Пачатковая станцыя	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на станцыю Мінск-Пасажырскі	Дні	Прыпынкі
Маладзечна	4-10	6-07	штодз.	б/п Селівонаўка
Маладзечна	4-48	6-41	штодз.	усюды
Аляхновічы	6-19	7-33	рабоч.	усюды
Маладзечна	5-52	7-45	штодз.	усюды
Маладзечна	6-26	8-20	штодз.	усюды
Аляхновічы	7-34	8-45	штодз.	усюды
Маладзечна	7-35	9-28	штодз.	усюды
Маладзечна	8-48	10-43	штодз.	усюды
Маладзечна	10-10	12-05	штодз.	усюды
Маладзечна	11-09	12-41 да Ждан.	штодз.	усюды
Маладзечна	12-45	14-14 да Ждан.	штодз.	усюды
Маладзечна	13-51	15-42	штодз.	усюды
Маладзечна	15-17	17-11	штодз.	усюды
Маладзечна	16-18	18-09	штодз.	усюды
Маладзечна	17-04	19-04	штодз.	усюды
Маладзечна	17-52	19-46	штодз.	усюды
Маладзечна	18-45	20-39	штодз.	усюды
Аляхновічы	19-07	20-28	пт. вых.	усюды
Маладзечна (паскораны)	19-56	21-36	штодз.	б/п Селівонаўка, Крыніца, Мясота, Раманы, Пралескі, Вязынка, Анусіна, Хмелеўка, Зялёнае, Крыжоўка, М.Мора
Маладзечна	20-35	22-57	штодз.	усюды
Беларусь	20-42	21-24	штодз.	б/п Лябяжы
Аляхновічы	21-59	23-32	штодз.	усюды
Маладзечна	22-22	23-58	штодз.	б/п Раманы, Пралескі, Хмелеўка, Зялёнае, Крыжоўка, Лябяжы

Прыбыццё на станцыю МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ

Пачатковая станцыя	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на станцыю Мінск-Пасажырскі	Дні	Прыпынкі
Пухавічы	5-02	6-20	штодз.	усюды
Асіповічы	5-14	7-24	штодз.	б/п Вярхі
Пухавічы	6-15	7-33	рабоч.	усюды
Пухавічы	6-36	7-54	рабоч.	усюды
Пухавічы	7-17	8-35	штодз.	усюды
Асіповічы (паскораны)	7-41	9-32	штодз.	б/п Вендзеж, Дрычын, Н.Сяло, Раўнаполле, Рыбцы, Зазерка, Седча, Асееўка
Пухавічы	9-00	10-19	штодз.	усюды
Талька	10-38	12-19	штодз.	усюды
Рудзенск	11-44	12-37	штодз.	усюды
Асіповічы	10-41	12-46	штодз.	б/п Вярхі
Асіповічы	12-16	14-24	вых.	б/п Вярхі
Асіповічы	12-54	15-00	штодз.	усюды
Асіповічы	13-36	15-41	штодз.	усюды
Рудзенск	16-50	17-45	штодз	усюды
Асіповічы	15-59	18-06	штодз.	б/п Вярхі
Асіповічы	16-43	18-51	штодз.	б/п Вярхі
Асіповічы (паскораны)	17-58	19-40	штодз.	б/п Вярхі, Весялоўскі, Майскі, Блужа, Веленскі, Тэхнікум, Вендзеж, Дрычын, Н.Сяло, Раўнаполле, Рыбцы, Зазерка, Седча, Асееўка, Чыгуначны
Пухавічы	18-47	20-05	пт.	усюды
Талька	18-43	20-25	штодз.	усюды
Пухавічы	19-52	21-10	штодз.	усюды
Талька	20-10	21-42	штодз.	б/п п.п. Блужа
Асіповічы	19-57	21-58	штодз.	б/п Вярхі, Чыгуначны
Асіповічы	20-56	22-48	штодз.	да ст. Пухавічы — усюды; далей б/п Тэхнікум, Вендзеж, Новае Сяло, Раўнаполле, Рыбцы, Зазерка, Седча, Асееўка
Асіповічы	21-59	23-44	штодз.	б/п Вярхі, Весялоўскі, Майскі, Блужа, Веленскі, Тэхнікум, Вендзеж, Дрычын, Новае Сяло, Раўнаполле, Рыбцы, Зазерка, Седча

Прыбыццё на п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Пачатковая станцыя	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на п.п. Інстытут Культуры	Дні	Прыпынкі
Асіповічы	6-10	8-17	штодз.	усюды
Асіповічы	8-26	10-36	штодз.	усюды
Асіповічы	14-51	17-01	штодз.	усюды
Асіповічы	17-25	19-08	рабоч.	З прыпынкамі па Юбілейны, Калядзічы, Мінск-Паўдн.
Пухавічы	21-52	23-22	штодз.	усюды

З АСІПОВІЧ, ТАЛЬКІ, ПУХАВІЧ

СКРАЗНЫЯ ЗНОСІНЫ

— эл.ц. **Асіповічы—Маладзечна**, адпраўленнем са ст. Асіповічы ў **19.57**, Мінск-Пас. **21.58—22.03**, прыбыццё на ст. Маладзечна ў **23.48 (штодзень).**

— эл.ц. **Асіповічы—Брэст**, адпраўленнем са ст. Асіповічы ў **07.41**, Мінск-Пас. **09.32—09.51**, прыбыццё на ст. Брэст **16.38 (штодзень).**

— эл.ц. **Асіповічы—Баранавічы**, адпраўленнем са ст. Асіповічы ў **16.43**, Мінск-Пас. **18.51—19.10**, прыбыццё на ст. Баранавічы ў **22.00 (штодзень).**

— эл.ц. **Асіповічы—Стоўбцы**, адпраўленнем са ст. Асіповічы ў **20.56**, Мінск-Пас. **22.48—22.56**, прыбыццё на ст. Стоўбцы ў **00.26 (штодзень).**

— эл.ц. **Асіповічы-Баранавічы**, адпраўленнем са ст. Асіповічы ў **14.51**, Інстытут Культуры **17.01—17.11**, прыбыццё на ст. Баранавічы ў **20.05 (штодзень).**

Інфармацыя аб наяўнасці прыпынкаў гэтым электрацягнікам пазначаная ў прыведзенай ніжэй табліцы.

Прыбыццё на п.п. ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Пачатковая станцыя	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця на п.п. Інстытут Культуры	Дні	Прыпынкі
Асіповічы	6-10	8-17	штодз.	усюды
Асіповічы	8-26	10-36	штодз.	усюды
Асіповічы	14-51	17-01	штодз.	усюды
Асіповічы	17-25	19-08	рабоч.	З прыпынкамі па Юбілейны, Калядзічы, Мінск-Паўдн.
Пухавічы	21-52	23-22	штодз.	усюды

Расклад руху электрацягнікоў на другія напрамкі ў наступным нумары «Звязды».

КУЛЬТБЫТ-2011: АД АБНОЎЛЕНАГА «МІНСКАГА» ДА АДКАКРЫСТАЛІЧНАГА «ГАРЫЗОНТА»

Зараз у сталіцы на аптовай выставе фарміруецца ўнутраны рынак тавараў культурна-бытавога прызначэння на наступны год

Пазаўчора ў Мінску ў выставачным комплексе па вуліцы Я. Купалы, 27 распачала сваю працу XIV міжнародная спецыялізаваная аптовая выстава-кірмаш «Культбытгастаовары-2011», якая будзе працаваць па 12 лістапада. Летась у аналагічным форуме брала ўдзел 285 фірмаў і арганізацый, што прадстаўлялі сваю прадукцыю на плошчы больш за 6,6 тысячы квадратных метраў. Сёлета таксама, каб нават бегла азнаёміцца з усімі экспанентамі, спатрэбілася нямала часу: удзельнікі выставы занялі два паверхі стацыянарнага павільёна, ды яшчэ і плошчы побач у дадатковым павільёне. Пагадзіцеся, цікава было загадзя даведацца, якімі навінкамі парадуе нас гандаль у наступным годзе.

...Чытачы сярэдняга і сталага веку, бясспрэчна, памятаюць, якой папулярнасцю некалі карысталіся матацыклы «Мінск». Мець такога «жалезнага коніка» ў гаспадарцы, асабліва на вёсцы, было і прыкметай прэстыжнасці і нават своеасаблівай заможнасці. Гэтая тэхніка характарызавалася вялікім тэрмінам службы, рамонтапрыдатнасцю і высокай праходнасцю, што гарантавала ёй поспех і на ўнутраным рынку, і за межамі Беларусі. Аднак потым па шэрагу фактараў інтарэс прынамсі айчынных спажыўцоў у дачыненні да гэтай тэхнікі крыху згас. Вярнуць колішнюю любоў да матацыклаў «Мінск» зараз спрабуе сумеснае закрытае акцыянернае таварыства «Матацыклетная кампанія «Мінск-мота» (гандлёвы дом «Мотавелазавода»).

— З гэтага года распачаўся выпуск тэхнікі «Стрыт» — новай стылёвай лінейкі матацыклаў для моладзі і гарадскога насельніцтва, — распавёў нам на выставе спецыяліст па продажах прадпрыемства Вадзім ПАТАПЕНКА. — Машына даволі магутная — аб'ём рухавіка 250 кубічных сантыметраў. Цана, магчыма, трохі высакаватая, — 2,5 тысячы долараў, таму мы больш разлічваем на пакупнікоў-мінчан, чым на вясковых жыхароў. З боку першых, дарэчы, ужо ўтварылася чарга на наступны год. Аднак нам ёсць што прапанаваць і жыхарам вёсак, аграгарадкоў: з гэтага года таксама засвоены выпуск мотатэхнікі малой кубатуры (да 50 кубічных сантыметраў): скутара і мапеда.

— Вось, напрыклад, гэтую мадэль скутара мы пазіцыянуем як пазадарожнік, бо ў яе павялічаны дарожны прасвет, — расказвае і паказвае далей Вадзім. — У першай партыі вырабілі 50 адзінак, зараз яшчэ 50 знаходзяцца на складзе, наступная партыя са 150 штук з'явіцца ў пачатку года. Напрыклад, у «Пріорбанка» ёсць падсобная гаспадарка, дык такі скутар у банку вырашылі набыць для фельчара ў гаспадарцы. Каштуе машына 2,8 мільёна рублёў.

Са скутарамі ўсё больш-менш зразумела — гэта зараз сапраўды папулярная тэхніка ці не ва ўсіх узроставых катэгорыях вадзіцеляў. А мапеды? Здавалася б, на фоне гэтай канкурэнцыі шанцаў у іх няма, і зараз толькі старэйшым заставалася хіба толькі настальгічна прыгадваць колішнія «Рыгі», «Карпаты», «Верхавіны»...

Аднак наш суразмоўца тлумачыць, што скутар — усё ж больш гарадскі транспарт (там тры амартызатары, а ў мапеда — чатыры, да таго ж цяпер мапед стаў выраблацца не аднамесным, а з двайным зручным сядзеннем). Зноў жа цана — толькі 2,5 мільёна рублёў плюс тое, што, у адрозненне ад скутара, мапед трапляе пад ільготнае крэдытаванне. Акрамя рухавіка, астатняе ў ім — беларускай вытворчасці. Ужо выраблена 200 такіх машын, у першым паўгоддзі выпуск будзе працягвацца. Інтарэс да навінкі паспела праявіць адно з раённых спажывецкіх таварыстваў: там набылі для спецыялістаў адну машыну, а неўзабаве — і другую.

...Адно з цэнтральных месцаў на выставе займае павільён холдынгу «Гарызонт». Па нашай просьбе з яго асобнымі навінкамі (расказаць пра ўсе не дазваляе газетная плошча) знаёміць спецыяліст па продажах Максім ГУЛЯНКОЎ.

Эрганамічныя дзяржанні: максімум выніку пры малых высілках.

— Вось, напрыклад, мікрахвалевыя печы ад беларуска-кітайскага сумеснага прадпрыемства «Медэя-Гарызонт», якія выраблюцца, адпаведна, пад брэндамі «Медэя» і «Гарызонт» і адрозніваюцца дызайнам. На выставе прадстаўлены навінкі — мікрахвалевыя печы на 17 і 20 літраў у чорным выкананні з сэнсарным кіраваннем. У залежнасці ад гандлёвай нацэнкі канкрэтнага прадаўца такія мадэлі можна набыць у краме за 230-250 тысяч рублёў. Дарэчы, калі працягваць пра мікрахвалевыя печы, варта заўважыць, што кампанія «Гарызонт» прапануе спажыўцам сваёй прадукцыі своеасаблівую «фішку»: павелічэнне гарантыі з аднаго года да трох. Прычым тры гады гарантыі будуць распаўсюджвацца не толькі на «мікрахвалёўкі», набытыя сёлета, але і купленыя разглядаецца мадэль тэлевізара з дыяганаллю 32 дзюймы, але — звярніце ўвагу — яна ўльтратонкая! — паказвае ўзор Максім.

...На выставе сапраўды прадстаўленая дастаткова шырокая тэматыка тавараў: і культурна-бытавога прызначэння, і гаспадарчага ўжытку, і галантарэя, і лясныя, і будаўнічыя матэрыялы. Настолькі шырокая, што ўжо міжволі пачынаеш шукаць на стэндах не проста якасныя рэчы, а можа нават у нечым... незвычайныя пакупь для нас. Ну вось хаця б, напрыклад, садова-агародны рыштунак (граблі, рыдлёўкі, вілы) са скрыўленымі, на першы погляд, дзяржаннямі. Раней такое толькі ў якой камедыі можна было пабачыць. Аднак не спяшайцеся з высновамі, насамрэч гаворка ідзе пра эрганамічныя дзяржанні для рыштунку. Яны дазваляюць

Вадзім Патапенка дэманструе скутар-«пазадарожнік».

спажыўцам не больш за тры гады таму! Такую ўнікальную прапанову зараз не можа падтрымаць больш ніхто з гульцоў на рынку вытворцаў мікрахвалевых печаў.

Аднак «Гарызонт» — гэта не ў апошнюю (калі не ў першую) чаргу і асацыяцыя з тэлевізарамі. Тут таксама ёсць чым здзівіць у холдынгу: Максім дэманструе нам тэлевізар з вадкакрысталічным экранам з дыяганаллю 47 дзюймаў. Гэта самы вялікі экран у тэлевізара, які сёння вырабляецца ў Беларусі (колькі часу таму іншы вытворца толькі дэманстраваў тэлевізар з памерам экрана 42 дзюймы). Вырабляецца такая мадэль ужо з паўгода, праўда, бяруць яе па безнаяўным разліку пераважна юрыдычныя асобы: для канферэнц-залаў, рэкламных мэтаў.

— Калі ж гаварыць пра фізічных асобаў, у якасці перспектыўнай для наступнага года на прадпрыемстве работніку, прыкладаючы мінімум высілкаў, атрымліваць максімальны вынік, паколькі вырабленыя з улікам фізіялогіі чалавека.

— Гэта сапраўды навінка польскай вытворчасці, — тлумачыць спецыяліст аддзела продажу сталічнай кампаніі «Еўрапейскія крапежныя тэхналогіі» Павел ГАРАЕЎ. Дарэчы, гэтае ТАА — першы пастаўшчык у краіну якаснай фабрычнай крапежнай прадукцыі з Кітая, Тайваня, Польшчы, Германіі. Аднаго толькі крапяжу яна ўвозіць больш за 6 тысяч найменняў, рыштунку — каля 3,5 тысячы найменняў. — Выкарыстоўваецца выдатная сталь, дзяржанне прыпаянае суцэльнай зваркай. Каштуе такі рыштунак даражэй за айчынны, аднак, як казалі нам палякі, якасць павінна адпавядаць цане.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 14 декабря 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования, условия продажи	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Челюскинцев, ост. «Улица Менжинского» (в центр) (ограничения – р. Днепр)	0,0009	1 год	установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне	740100000003005943	1 128 006	85 000	8 000
№ 2	улица Ямницкая в районе жилого дома № 93	0,0062	1 год	установка и обслуживание павильона по продаже продовольственных товаров	740100000003005942	1 126 836	431 000	39 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой**.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельные участки расположены на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа киоска, павильона с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 6 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 8.12.2010 года до 17.00**.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

ДЗІЦЯ ЗАГІНУЛА ПАД КОЛАМІ «ПЕЖО»

У Клічаўскім раёне ў аўтааварыі загінуў 7-гадовы хлопчык. Аўтамабіль «Пежо-406», якім кіраваў 25-гадовы жыхар Бабруйска, у вёсцы Таценка наехаў на хлопчыка, які раптоўна выбег на дарогу. Вучань 2-га класа адной з бабруйскіх школ атрымаў смяротную траўму. З усімі абставінамі трагічнага здарэння разбіраюцца следчыя, заведзена крымінальная справа.

У Бялыніцкім раёне паблізу вёскі Ланькава 40-гадовы кіроўца на аўтамабілі «Опель» выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся ў лоб з аўтамабілем «Пежо». У выніку аўтааварыі пацярпелі тры чалавекі: абодва кіроўцы і 61-гадовая жанчына, якая ехала пасажыркай. Вадзіцель «Пежо», 56-гадовы жыхар Мінска, праз гадзіну памёр у бальніцы.

Увогуле за мінулы тыдзень, па звестках аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама, на дарогах рэгіёна загінула 5 чалавек. ДАІ звяртае ўвагу вадзіцеляў на неспрыяльныя ўмовы надвор'я і з'яўленне галалёдзіцы.

Ілона ІВАНОВА.

РАДАР-ДЭТЭКТАРЫ СА «ЗНІЖКАЙ»

Зладзюжка прадаваў крадзеныя з аўтамабіляў прыборы ў чатыры разы танней, чым іх рынкавая цана

А «прапісаўся» 18-гадовы «спецыяліст» на тэрыторыі сталічнага Савецкага раёна, дзе, як мяркуецца, ён і ўчыніў серыю крадзяжоў аўтамабільных радар-дэтэктараў. Зрэшты, паводле звестак прэс-афіцэра Савецкага РУУС Святланы Яскевіч, першапачаткова затрымалі юнака за «прыхватызацыю» чужога горнага веласіпеда. А ўжо потым высветлілася, што ён мае дачыненне як мінімум да трох крадзяжоў з аўтатранспарту. Збываў зладзюжка чужое дабро праз рэкламныя аб'явы ў газетах. Прычым прадаваў радар-дэтэктар у сярэднім за 100 тысяч рублёў, а «зароблены» такім чынам грошы траціў на набыццё наркотыкаў.

Ігар ГРЫШЫН.

СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»

ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР:

на приобретение оборудования и установку пожарной сигнализации в административном здании

Предложения принимаются в течение 5 дней со дня публикации по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123.

Тел./факс 205 86 00, тел. 205 81 53.
Кривошей В.И.

УНП 190050257.

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

У ДАПАМОГУ ВАЙСКОЎЦАМ

У вядзенні актыўных ваенных дзеянняў робаты пакуль бяруць удзел у выглядзе не вельмі складаных і «разумных» механізмаў — міну там абясшкодзіць, за ворагам пасачыць ці ў ролі перасоўнага кулямёта або кідальніка гранат выступіць. Пабойваецца, мабыць, дасведчаны Захад інтэлектуальнай зброі, таму больш развівае тэхналогіі для атакі і абароны салдата-чалавека. У кастрычніку 2010 года кампанія Lockheed Martin пачала выпрабаванні ўдасканаленага экзашкілета HULC, а месяц таму кампанія Raytheon абвясціла пра стварэнне экзашкілета другога пакалення XOS2. Гэтыя прылады дазволяць салдатам пераносіць большы цяжар, менш пры гэтым стамляючыся. Вось некаторыя створаныя сёння варыянты экзашкілетаў.

General Electric Hardiman. З гэтага экзашкілета пачалася гісторыя галіны. Яго маса складала 680 кілаграмаў, а грузападымальнасць — 340 кілаграмаў. Прылада ў серыю не пайшла, паколькі інжынерам не ўдалося дамагчыся сінхранізацыі ніжняй і верхняй частак Hardiman.

Lockheed Martin HULC. Экзашкілет прызначаны для палягчэння нагрузкі на салдат у паходах. Прылада мае батарэйнае сілкаванне, дазваляе бегаць, скакаць, прысядаць і рухацца паўзком. HULC дазваляе аператару пераносіць груз масай да 90 кілаграмаў. Нягледзячы на тое, што HULC важыць 24 кілаграмы, ён не стварае ніякай дадатковай нагрузкі, бо перадае ўласную вагу на зямлю, што робіць яго наяўнасць практычна незаўважным.

XOS2. Гэта другое пакаленне экзашкілетаў, распрацаваных кампаніяй Raytheon. Яго грузападымальнасць таксама складае каля 90 кілаграмаў. Акрамя трываласці і магутнасці, экзашкілет таксама досыць жвавы і спрытны для таго, каб дазволіць карыстальніку лёгка жангліраваць футбольным мячом ці падымацца па прыступках. Але яго істотным недахопам пакуль з'яўляецца сувязь з генератарам энергіі, да якога ён падключаны сілавым кабелем, а таксама вага — 68 кілаграмаў.

HAL-5 — экзашкілет, створаны японскай кампаніяй Cyberdyne. Гэтая версія задумвалася першапачаткова як памочнік пажылым людзям ці інвалідам: дзякуючы гэтаму экзашкілету яны маглі рухацца на сваіх нагах. Экзашкілеты HAL практычна не абмяжоўваюць рухі аператара. Апранаючы экзашкілет HAL-5, чалавек можа ўтрымліваць вагу да 40 кілаграмаў рукамі і павялічыць максімальную вагу нагрузкі на ногі са 100 да 180 кілаграмаў. З 2008 года ў Японіі любы можа ўзяць у арэнду HAL-5 за $590 штомесяц.

РОБАТЫ ПАЧЫНАЮЦЬ ТАНЦАВАЦЬ

Робат, якога практычна немагчыма было адрозніць ад чалавека, вельмі добра быў паказаны ў знакамітым савецкім дзіцячым фільме «Прыгоды Электроніка». Фільму споўнілася ўжо 30 гадоў, і ў гэты юбілейны год на свет з'явілася... калі так можна сказаць — сястра Электроніка. У Токіа прайшла выстава лічбавых тэхналогій «Digital Content Expo», дзе перад наведвальнікамі выставы ў кампаніі чатырох дзяўчат на падтанцоўцы выступіла жанчына-андроід HRP-4C. Гэты робат ствараўся як электронная мадэль для дэманстрацыі адзення на подыуме, але з часам электрадзяўчына заспявала, а зараз яшчэ і затанцавала.

Упершыню японцы прадставілі гэтую мадэль у сакавіку 2010 года — новы робат быў заяўлены як першы андроід-манекеншчыца. Тады ж HRP-4C дэбютавала падчас Японскага тыдня моды. Спецыялісты з AIST працягваюць удасканальваць сваё стварэнне і даволі хутка робат... заспяваў. Зараз дзяўчына-андроід не толькі ўмее сінтэзаваць гукі, мадэлюючы чалавечы голас, але і суправаджаць свае спевы мімікай і рухамі. Наступным крокам стала навучанне танцам, якое было рэалізавана з дапамогай анімацыйнага пакета Chorenoid (спалучэнне Choreography і Humanoid). Цела HRP-4C абсталявана 30 маторчыкамі, яшчэ 8 матораў убудаваныя ў галаву робата-мадэлі. Дзякуючы ім робат можа выяўляць розныя эмоцыі. Рост HRP-4C 158 сантыметраў, вага — 43 кілаграмы (уключаючы батарэю). Гэта сярэднестатыстычныя параметры звычайнай японскай жанчыны. У далейшым андроіда плануецца выкарыстоўваць на падобных прэзентацыйна-забаўляльных мерапрыемствах, а таксама ў якасці «жывога трэнажора» і «сімулятара чалавека». У будучым такія мадэлі робатаў паступяць у продаж, і арыенціровачна іх кошт складзе каля 3 мільёнаў амерыканскіх долараў. Распрацоўкай робатаў-андроідаў чалавецтва займаецца ўсяго адно дзесяцігоддзе і ўжо дасягнула ў ім значных поспехаў. У кіно, праўда, прагрэс у гэтай вобласці значна апярэджвае рэчаіснасць: успомнім такія вядомыя фільмы, як «Двухсотгадовы чалавек», «Я, робат», «Штучны інтэлект». Але і ў рэальнае жыццё, як паказваюць нам японцы, робаты ўваходзяць усё хутчэй і больш упэўнена. Можна сказаць, успомніўшы пра дзяўчыну-андроіда, — наперад і з танцамі.

ЗАКЛІНАЛЬНІК ІЛЬВОЎ



Хутка ў ЗША з'явіцца фільм пра тое, як аднаму рэдкаму беламу льву пашанцавала не стаць трафеем на сцяне. Гэта сапраўды рэдкае шчасце, улічваючы, што штогод законна забіваюць больш за 1000 львоў. Кевін Рычардсан называе сябе «паслом ільвоў», ён спадзяецца, што гэты фільм дапаможа спыніць рэгулярныя забойствы цара звяроў. Рычардсан вядомы як «заклінальнік ільвоў».

«Проста не разумею, як людзі могуць страляць у львоў у зачыненай прасторы, адкуль ён не зможа ўцячы», — кажа «заклінальнік ільвоў». Кожны год у ПАР выгадоўваюць ільвоў у няволі, а затым выпускаюць у зачынены вальер, дзе паляўнічыя могуць страляць па іх. Гэта не спорт, а забойства. Фільм «Белы леў» пра рэдкага белага льва, якога яшчэ ў дзяцінстве з-за колеру скуры выгналі з прайда. Ён ледзь не памёр ад голаду, але потым сустрэў сталага льва, які навучыў яго законам дзікага жыцця.

Паляванне на жывёл для трафеяў — буйны бізнэс у ПАР, які прыносіць больш за 90 мільёнаў долараў штогод. Замежныя турысты гатовыя плаціць за адстрэл загнанага ў кут ільва да 40 000 долараў. Урад падтрымлівае гэтае «паляванне» і заве яго «пастаяннай утылізацыяй натуральных крыніц». Толькі ў верасні 2007 года 16 394 паляўнічыя, больш за палову з якіх з ЗША, забілі больш за 46 000 жывёл у ПАР. Практычна ўсе львы, на якіх ідзе паляванне ў ПАР, выводзяцца ў няволі.

Прадзюсар новага фільма Кевін Рычардсан упершыню «пасябраваў» з белымі львамі 12 гадоў таму: ён прыручыў двух паўгадовых львянят, калі яму самому было 23 гады. Ён пачаў бавіць час у рэабілітацыйным цэнтры, каб больш часу праводзіць са сваімі новымі сябрамі. Неўзабаве ўладальнік парку Родні Фур прапанаваў яму часовую працу, якая ў выніку стала пастаяннай. Сёння Рычардсан клапоціцца пра 39 львоў на тэрыторыі ў 800 гектараў. Парк знаходзіцца ў паўтары гадзіны язды ад Іаханэсбурга, дзе і здымалі фільм. Львы — начныя жывёлы, і таму большую частку дня спяць, так што здымкі фільма праходзілі па дзве гадзіны раніцай і яшчэ дзве — днём, калі, вядома, «зоркі» дазвалялі. Рычардсан парушае ўсе правілы паводзінаў пры зносінах з драпежнікамі. Як толькі ён з'яўляецца, яны вітаюць яго мурчаннем. Кевін любіць чухаць ім брушкі, а яны любяць лізаць яму рукі сваімі шурпатымі языкамі. Львы нападалі на Рычардсана двойчы, адзін раз падчас здымак леў па імені Тор «прыгваздаў» яго да клеткі, чым прывёў у жах усю здымачную групу. «Львы на 99% спакойныя і ўсяго на 1% смяротна небяспечныя», — кажа Рычардсан.

ЧАКАЕМ НАСТУПСТВЫ СОНЕЧНАЙ БУРЫ

Увага!



Адну з самых моцных успышак на Сонцы зафіксавалі ў мінулыя выхадныя спецыялісты ў галіне касмічнай метэаралогіі. На іх думку, у бліжэйшыя некалькі дзён мы адчуем на сабе ўздзеянне моцнай геамагнітнай буры.

У суботу, 6 лістапада, на нашай зорцы адбыўся выбух, які суправаджаўся выкідам высокага слупа плазмы і моцным патокам выпраменьвання ў рэнтгенаўскім дыяпазоне. У сярэднім наступствы такіх бур на Зямлі пачынаюць адчувацца на працягу першых двух сутак. Але ў гэты раз успышка адбылася на далёкім участку Сонца, і да Зямлі сонечнае паветра можа дабрацца толькі да 11-12 лістапада, выклікаўшы істотнае ўзрушэнне магнітнага поля планеты. Гэта азначае, што ў азначаныя дні ў метэаадчувальных людзей можа пагоршыцца самаадчуванне.

Падчас магнітнай буры верагодна парушэнне біярытмаў арганізма, павелічэнне колькасці няшчасных выпадкаў і траўматызму. Гэты незвычайны эфект тлумачыцца змяненнямі ў дзейнасці цэнтральнай нервовай сістэмы (падаўжаецца час рэакцыі на знешнія раздражняльнікі). Аднак з усіх захворванняў найбольш залежныя ад сонечнай актыўнасці ўсё ж сардэчна-сасудзістыя — ішэмічная хвароба сэрца, павышаны ці паніжаны артэрыяльны ціск. Імунная сістэма чалавека рэагуе на магнітныя буры па-рознаму: у адных назіраецца прыгняценне ўстойлівасці да хвароб, у іншых, наадварот, — рэзкі прыліў сіл, паляпшэнне настрою і павышэнне працаздольнасці.

Інтэнсіўныя ўспышкі на Сонцы могуць наносіць шкоду арбітальным апаратам і ствараць небяспеку для касманаўтаў. Апроч таго, заўсёды ёсць рызыка пашкоджання электрасетак на Зямлі. Для абароны ад сонечнай нечаканасці ў NASA нават запусцілі праграму «Сонечны шчыт» — сабраная са спадарожнікаў інфармацыя аб актыўнасці на зорцы будзе аператыўна апрацоўвацца ў вылічальным цэнтры. Атрымаўшы інфармацыю пра час магнітнай буры, камп'ютары павінны своечасова адключыць трансфарматарныя станцыі, каб пазбегнуць іх выхаду са строю ў выніку геамагнітнага ўзрушэння.

Астраномы, якія вывучаюць актыўнасць Сонца, вылучаюць пяць катэгорый успышак (A, B, C, M, X). Суботняя бура была аднесена да вышэйшай катэгорыі M, яна стала адной з самых моцных за апошнія некалькі гадоў. Паводле звестак NASA, бліжэйшы доўгатэрміновы перыяд сонечнага ўзрушэння нас чакае ўжо ў 2013 годзе, тады падобныя буры могуць узнікаць адна за другой.

Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.

Здарэнні

НА ПАЖАРЫ Ў ПІНСКУ ВЫРАТАВАЛІ ШАСЦЯРЫХ

Пра пажар па вуліцы Брэсцкай у Пінску ў падраздзяленне МНС паведамілі мясцовыя жыхары.

На месцы выратавальнікі-пажарныя ўбачылі, што з акна кватэры, размешчанай на першым паверсе двухпавярховага 16-кватэрнага дома, ідзе моцны дым. З ахопленага агнём жылля былі выратаваныя гаспадар і яго жонка: пацярпелых з атручэннямі прадуктамі гарэння і ў стане алкагольнага ап'янення шпіталізавалі ў цэнтральную гарадскую бальніцу. Па лесвіцы з кватэры на другім паверсе былі выратаваныя жанчына і двое яе дзяцей — двайняткі 2008 года нараджэння, якія не пацярпелі. З іншай кватэры на другім паверсе выратавалі гаспадыню, пенсіянерку-інваліда I групы па апорна-рухальным апараце, якая з лёгкім атручэннем таксама была шпіталізаваная ў бальніцу. Найбольш верагодная прычына пажару — неасцярожнасць пры курэнні мужчыны з кватэры магчымых віноўнікаў здарэння. Паводле слоў суседзяў, сужэнцы злоўжывалі спіртнымі напоямі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (3 лістапада). Па гарызанталі: Зараснік. Батат. Арба. Елка. Орша. Кедр. Арсенал. Піхта. Аер. Люк. Гардэ. Карнет. Кат. Дэка. Фокус. Смятана. Зарок. Параграф. Ток. Ула. Сад. Фартран. Сябар. Кіпу. Агент. Панда. Аул. Соты. Кіпарыс. **Па вертыкалі:** Курс. Туя. Кухар. Лязо. Такса. Калектар. Араміс. Юта. Норд. Зубр. Трак. Капот. Абора. Кніга. Ротар. Пена. Шар. Фундук. Твар. Талі. Сага. Акр. Донг. Нардэк. Рур. Купала. Сімвал. Эрас. Фантамас.

Сканворд + судоку (5 лістапада). Па гарызанталі: Домра. Аграном. Шарм. Мора. Баа. Жаба. Лімб. Рубік. Календула. Ара. Спас. Варан. Ібіс. Іўе. Апала. Оні. Дуда. Прут. Каст. Аса. Аўра. Ліпучка. **Па вертыкалі:** Ківі. Вандал. Осака. Бельведэр. Румба. Нарад. Ямал. Драпак. Ігуана. Алушта. Гарэм. Лёс. Брас. Пі. Абора. Сінус. Маланка. Сіта. **Судоку: адказы гл. у табліцы.**

Сканворд (6 лістапада). Па гарызанталі: Каланада. Бонд. Бра. Рэйс. Бокс. Граф. Тора. Кіно. Увал. Ізалятар. Медаль. Ані. Холмс. Сінкопа. Ара. Суд. Опт. Фактар. Карла. Гало. Мор. Троп. Фаза. Авал. Нагата. Урад. Лама. Баян. Нівелір. **Па вертыкалі:** Каломба. Ахтырка. Кізіл. Аорта. Марпл. Плюс. Атаман. Лімб. Рагуля. Небарака. Варан. Эфір. Анатам. Дунай. Аса. Ладан. Стома. Фол. Янка. Груда. Кут. Аванпост. Алі. Пуаро. Соль. Кадр. Пастар.

1	5	3	9	4	7	8	6	2
9	4	8	3	2	6	7	5	1
7	2	6	1	8	5	4	9	3
2	1	5	6	7	3	9	4	8
8	6	9	4	5	1	2	3	7
4	3	7	2	9	8	5	1	6
5	8	1	7	6	4	3	2	9
3	7	2	5	1	9	6	8	4
6	9	4	8	3	2	1	7	5

Патаксаваў...

Падзарабіць вырашыў 25-гадовы кіроўца асабістага «Фальксвагена», таму і ўзяў у сваю машыну каля чыгуначнага вакзала невядомага грамадзяніна на добрым падпітку.

Той даволі доўга катаўся па Гомелі, заязджаючы ў розныя месцы, а потым сказаў, што грошай у яго няма, але ж ён зойдзе да сваёй знаёмай, возьме і заплаціць за паездку. У заклад пакінуў мабільнік. Калі мужчына вярнуўся, замест грошай ён адразу ж нанёс кіроўцы ўдар нажом у вобласць шыі. Мужчына змог выскачыць з аўто і кінуўся па дапамогу на адну з цэнтральных вуліц Гомеля. Злодзей працягваў яго даганяць і яшчэ раз параніў. Потым пацярпелага падхапіў кіроўца выпадковай машыны і завёз у бальніцу. Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, 36-гадовага зламысніка затрымалі праз кароткі час у доме яго сябра.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Выпіў антыфрыз і памёр

8 лістапада ў Бабруйску ў бальніцы памёр 56-гадовы мужчына, кіроўца аднаго з прадпрыемстваў горада. Яго шпіталізавалі яшчэ 17 кастрычніка з вострым атручэннем. Выявілася, што напярэдадні дома ўначы мужчына памылкова выпіў антыфрыз. Медыкі не здолелі выратаваць яму жыццё: у пацыента перасталі працаваць практычна ўсе органы.

Алена КАЗЛОВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.27	16.19	8.52
Віцебск —	7.22	16.04	8.42
Магілёў —	7.17	16.09	8.52
Гомель —	7.08	16.11	9.03
Гродна —	7.41	16.35	8.54
Брэст —	7.37	16.41	9.04

Месяц

Першая квадра 13 лістапада. Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Неанілы, Праскоўі, Арсенія, Дзмітрыя, Івана, Максіма, Несцера.*

К. *Наталлі, Нэлі, Андрэя, Любаміра, Льва, Лявона, Сцяпана.*

Лістападаўскі падарунак

Фота Анатоля БУЎВІЧА.

Гэты грыб-дажджавік вырас на дачы пад Мінскам.

НАДВОР'Е на заўтра

10 лістапада

Дзве даты

1749 год — нарадзіўся (г. Нясвіж) Мацей Радзівіл, дзяржаўны дзеяч ВКЛ, кампазітар, драматург. Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 1794 года. Як драматург дэбютаваў у 1784 годзе, калі да прыезду караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Нясвіжы была пастаўлена опера «Агатка, або Прыезд пана». Пазней опера ставілася ў Варшаве, Любліне, Вільні, Львове. З'яўляецца таксама аўтарам санаты, серэнады, многіх паланезаў. Памёр у 1800 годзе.

1885 год — нямецкія інжынеры Даймлер і Майбах правялі выпрабаванне першага матацыкла.

Цытата дня:

«Да ведаў мы павінны ставіцца гэтак жа, як і да ежы. Мы не жывём для таго, каб толькі ведаць, як не жывём для таго, каб толькі есці».

Джон Рэскін (1819—1900), англійскі пісьменнік, тэарэтык мастацтва.

З днём нараджэння віншуем **Сашу ЯНУКОВІЧА** з г. Глыбокае. Жадаем моцнага здароўя. Няхай заўсёды ў тваім доме пануе любоў і згода, і Божая ласка не пакідае вас.

Тата, мама.

Усміхнемся!

Хлопчык, якога на пчальніку ўкусіла каза, перастаў верыць у логіку.

☺

Едзе волат у чыстым полі і бачыць камень. А на камені напісана:

«Прама пойдзеш — каня страціш.

Направа пойдзеш — жыццё страціш.

Налева пойдзеш — дома пагаворым.

Васіліса».

☺

Добрыя грудзі са спіны відаць!

☺

Птушыны рынак.

— Мужык, купі ката!

— А якой ён пароды?

— Сібірскі!

— Не можа быць! У яго ж шэрсць кароткая!

— Шэрсць шэрсцю, але есць ён толькі пельмені!

☺

Калі б жанчыны казалі тое, што думаюць, яны б усё жыццё маўчалі.

☺

— Доктар! У нас кожны год хтосьці нараджаецца і нараджаецца.

— Ведаеце, калі ідзе дождж — трэба галёшы абуваць!



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5475. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12